Школьная бібліятэка



# Цудадзейны карагод

Частка 2

Школьная бібліятэка

# Цудадзейны карагод

*Зборнік твораў для пазакласнага чытання ў 3 класе*

*У дзвюх частках*

*Частка 2*

Мінск
«Народная асвета»
2018

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)
Ц83

Серыя заснавана ў 1965 годзе
Распрацоўка, мастацка-тэхнічнае афармленне серыі выдавецтва
«Мастацкая літаратура», 2009 г.

Дызайн *А. І. Царова*
Укладальнік *І. Г. Волкава*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Цудадзейны карагод** : зборнік твораў для пазакласна-
Ц83 га чытання ў 3-м класе. У 2 ч. Ч. 2 / уклад. І. Г. Волкава. — Мінск : Народная асвета, 2018. — 303 с. : іл. — (Школьная бібліятэка).
ISBN 978-985-03-2987-5.

У кнігу ўвайшлі творы беларускіх пісьменнікаў — класікаў і сучасных аўтараў.

Рэкамендуецца навучэнцам пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання для пазакласнага чытання.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-03-2987-5 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-03-2997-4**

© Волкава І. Г., укладанне, 2018
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2018

# Зімовы дзянёк — што камароў насок

**Г***енадзь Аўласенка*

## ХТО ЯК ЗІМУЕ

Моцна спіць зімой вавёрка — у яе пад снегам норка. А ў бярлозе, у бары, смокча лапу лось стары. І казуля не ўтрывала, і таксама прыдрамала, у нары, у гушчары, да вясновае пары. Спіць яна і бачыць сны аж да самай да вясны.

Зайцы ў вырай адляцелі, заставацца не схацелі, бо зімою халады, недалёка да бяды. А яшчэ, скажу вам шчыра, і ваўкі зляцелі ў вырай, а за імі да пары адляцелі і зубры. Замест іх павесяліцца пры ляцяць да нас лісіцы, каб у нас зазімаваць, падзяўбаць-пачаставаць ягадак рабіны ды яшчэ каліны.

А бабёр па верхавінках спрытна скача па галінках. На сасне яго дупло — там утульнае жытло. Там арэхі пра запас, а запас зімой — якраз! Усю восень працаваў — шмат арэхаў

назбіраў. І грыбы бабёр шукаў, на галінкі іх чапляў, так што зараз у бабра – процьма ўсякага дабра!

Ну, а вожык у бары спіць дзянёчак у нары. А прачнецца на змярканні – і бяжыць на паляванне.

А барсук, браткі мае, на зіму гняздзечка ўе! Там выводзіць дзіцянятак, маладых барсучанятак. А каб зімку пераўжыць – любіць шышкі церушыць. Трушчыць адмыслова, майстра – адно слова! Ну, а з шышак семяно – вельмі смачнае яно – ён прыносіць дзіцяняткам, маладым барсучаняткам. Корміць іх, засцерагае, цёмнай ноччу саграваае, каб хутчэй яны раслі, каб здаровымі былі.

Вось мядзведзю незадача – ён па гурбах так і скача! І баіцца, і дрыжыць – небараку цяжка жыць! Ён не мае абароны ад сарокі ды вароны. А сарокі кіпці точаць – спаляваць мядзведзя хочуць! А вароны зубы шчэрацць – хочуць бедным адвячэраць! Вось такія вам суседзі злыя ў нашага мядзведзя!

Сам жа ён грызе кару ў гэту цяжкую пару. Можна ўбачыць па слядах – як ён бегаў па садах, як скакаў туды-сюды, як заблытваў ён сляды, каб у снезе дзень ляжаць ды ад страху зноў дрыжаць...

А цяпер, сябры, увага!

Можа, будзе ў вас заўвага?

Можа, штосьці я змяніў, можа, дзесьці я зманіў?

Вы ж памылкі пагукайце, дзе што трэба – памяняйце, каб звяры не бедавалі, а як трэба зімавалі.

Пастарайцеся, сябры, – дзякуй скажуць вам звяры!

## *Артур Вольскі*

### КАЛЯДКІ

Ой, ладачкі-ладкі –
надышлі Калядкі.
Мы дзеля Калядак
напяклі аладак.

Дралі дробнай таркаю
дранікі духмяныя.
Хочаш – еш са скваркаю,
хочаш – са смятанаю.
Вось вам, калі ласка,
з жэрдачкі каўбаска.
Вось кавалак пірага,
каб не брала вас туга.

Ой, ладачкі-ладкі!
І мядок салодкі
да лясной гарбаткі
наліем у сподкі.
І запахне рутай,
верасам, чаборам,
каб зімою лютай
нам не знацца з горам.

Бярыце з талеркі
лізунцы, цукеркі!

Ешце ўволю, ешце,
ды не псуйце зубкі...
Песняй нас пацешще,
галубкі, галубкі!

Бохан – поўняй яснаю,
яйкі, бульба, скваркі.
Гэта ўсё – з уласнае
нашай гаспадаркі.

Калі вам прысмакі
прыйдуцца да смаку,
прынясіце Богу
шчырую падзяку.

Ой, ладачкі-ладкі –
пляскаем у ладкі!
Ой, ладачкі-ладкі –
святкуем Калядкі!

## *Міхась Даніленка*

### КЛЮЧЫ БАБУЛІ ЗІМЫ

Славік сядзеў з бабкай Настуляй на лавачцы каля хаты. Абое пільнавалі драздоў. Унадзіліся тыя лятаць з лесу на рабіну, што чырванее гронкамі ў агародчыку.

– От шылахвосты, – уздыхае бабка. – Ведама, к зіме ягады саладзейшымі робяцца. Дразды і ласуюцца імі.

Старэнькая яна, бабка Настуля. Сядзіць з кіёчкам, грэецца на асеннім сонцы ды жмурыць старэчыя вочы. Дзе ўжо ёй тых драздоў ганяць.

– Ты ўжо глядзі, Славічак, – кажа яна ўнуку, – хітрыя яны, дроздзікі.

Ды Славік не вельмі пільнуе рабіну. Ён то ганяе па двары жалезны абруч, які яму прынёс з кузні бацька, то спрабуе злавіць шаўкавістую павуціну, што праплывае ў празрыстым паветры.

З неба даносяцца тужлівыя крыкі: «Курлы! Курлы!»

– Бабка! – тармосіць хлопчык за рукаў бабулю. – Глядзі: птушкі!

Бабка доўга ўзіраецца пабляклымі вачыма ў неба, нешта сама сабе шэпча і ўздыхае.

– Жураўлі, унучак, адлятаюць ад нас, – гаворыць яна. – Лета замыкаюць. Хутка лецейка ключы бабулі зіме перадасць.

– А якія тыя ключы? – пытае Славік. – Калі іх лета перадасць зіме?

Бабка Настуля некаторы час маўчыць. Потым ласкава гладзіць бялявую галаву ўнука і, усміхнуўшыся, прапануе:

– А мы будзем з табой, галубок, кожны дзень пільнаваць, калі лецейка зіме ключы аддасць. Добра?

З таго дня Славік пільнаваў не так рабіну, як той момант, калі лета перадасць зіме ключы.

Аднойчы бабка Настуля паказала Слаўку на павуцінцы, што зачапілася за галінку рабіны, малюсенькага павучка. Ён, мабыць, таксама, як і жураўлі, адлятаў у цёплыя краі.

– Крыльцаў не мае, дык на павуціне падарожнічае, – тлумачыла бабка. – А вунь і пасланец бабулі зімы на нашай рабіне ўсеўся.

На што ўжо добрыя вочы ў Славіка, а і то ён ледзь разгледзеў на рабіне чырванагрудую птушку. Яна сядзела і чысціла пышныя пёркі.

– Снягір, – сказала бабка. – Сняжок ён любіць. Бачыш: грудзі ў яго бы ранішняя зара на зімовым небе.

А яшчэ праз колькі дзён лужыну, што была каля іхняга двара, скаваў тонкі чысты лядок. Праз той лядок усё-ўсё відаць. Лядок быў і на Мацвеевай копанцы. Калісьці ўвесну там звонка крычалі жабы.

— Глядзі, — паказала бабка Славіку на шэры камячок пад лёдам.

— Жаба?! — не паверыў сваім вачам хлопчык.

— Да зімы падрыхтавалася, — кіўнула галавой бабка. — А вясной адтае зямля, пацяплее. Тады і яна ажыве, заспявае сваю песню з сяброўкамі.

А яшчэ Славік бачыў на прыпудранай інеем зямлі каля самага агародчыка сляды зайца, бачыў сонных мух, што забіліся ў шчыліны бярвёнаў. Шмат чаго цікавага паказвала бабка.

— Калі ж тое лета бабулі зіме ключы перадасць? — дапытваўся хлопчык. — Хутка ўжо і снег пойдзе.

— А ты, унучак, не спяшайся, — суцяшала Славіка бабка. — Ты ж ужо і так трохі больш убачыў, чым раней. А падрасцеш, яшчэ ўважлівей будзеш да ўсяго прыглядацца. Тады — я ўпэўнена — не прапусціш і ключы, якія лета бабулі зіме ўручае...

— А ты, бабка, ніколі не прапускала?

— Я, галубок, і цяпер стараюся не прапусціць, — усміхаецца бабка Настуля. — Васьмідзясятую зіму сустракаю...

У тую ноч Славіку прысніўся сон. Быццам на зялёным лузе, не дакранаючыся да травы, плыве ў вянку з палявых рамонкаў лета. Яго косы — залацістыя промні — яркім ззяннем аж слепяць вочы. А насустрач, пакрэктваючы, спяшаецца зіма. Валёнкі ў яе цёплыя, рукавіцы вялікія. Узмахне зіма рукавом кажуха — і рой сняжынак, быццам белыя матылькі, сыплецца на зямлю. Жабкі, жучкі хутчэй хаваюцца. Аддало лета прыгожыя серабрыстыя ключы. Зіма ўзяла іх, нахмурыла сівыя ад інею бровы і павярнула ключыкам нябачны замок. І адразу ўся зямля пакрылася белай-белай прасцінаю...

Расплюшчыў Славік вочы, а ў пакоі і сапраўды неяк нязвыкла светла. Кінуўся ён да акна і радасна закрычаў:

— На двары снег! Лета бабулі зіме ключы перадало!

## ЗІМОВАЯ АЗБУКА

Прыйшоў з лесу Юркаў бацька, павесіў на сцяну стрэльбу і сказаў:

— Каля Мажэйкавай паляны ліса мышкавала.

— А як ты дазнаўся? — пытаецца Юрка.

— Азбука такая ёсць, — хітра прыжмурыў вока бацька. — Хочаш, заўтра пойдзем у лес — навучу разумець тую азбуку.

І вось ідуць яны ўдвух: наперадзе бацька, ззаду Юрка. А ўсюды на некранутай роўнядзі снегу — сляды і сляды. Трапляюцца мале́нькія — крыжыкам — і такія, нібы хто ўторкваў палку ў глыбокі снег.

— Гэта сарокі падбіралі насенне з дрэў. Бачыш: доўгімі хвастамі за сабой чыркалі, — тлумачыць бацька. — А там вунь і лясная мыш ланцужкі слядоў нанізала.

Заяц сігаў шырока — заднія ногі ў яго доўгія. І вось на снезе адбіткі яго слядоў — спяшаўся, мусіць, даўгавухі або ўцякаў ад галоднай лісы...

Усё відаць на снежнай коўдры: і як цецерукі начавалі ў пу́льхным[1] снезе, і як капытом гру́каў лясны волат — лось — праломваў тонкі лядок у ручайку, каб напіцца, і як таўкліся каля дарогі галодныя вароны — падбіралі рассыпаныя зярняткі аўса.

— Вось яна — зімовая азбука, — сказаў бацька. — Вучыся чытаць яе: усе таямніцы табе лес раскрые.

---

[1] *Пу́льхны* — мяккі.

## **В***асіль Жуковіч*

### СТАРАЖЫТНЫ ЗВЫЧАЙ

А на стале у беларуса
у навагодні вечар
ляжала сена пад абрусам
спакон вякоў, дарэчы.

Згадаем хоць бы на хвілінку
ўсё, як было калісьці.
Мы паварожым на сяннінках,
каб мары ўсе збыліся.

Сяннінка доўгая, цягніся!..

### ЗІМА

Зіма хадою смелаю
Да нас прыйшла здаля,
І стала белай-белаю
Уся вакол зямля.

Такія гурбы выраслі –
Як прывіды стаяць.
Эй, саначкі мы вынеслі –
Давай гуртом гуляць.

У саначках бліскучыя,
Як струны, палазы.
Не страшны нам траскучыя,
Тугія маразы.

## ПЕРШЫ СНЕГ

Янка ўстаў асеннім ранкам,
на гадзіннік глянуў Янка.
«Сем гадзін, ды – што такое? –
пасвятлела у пакоі».
Хлопчык да акна падбег:
вось дык дзіва – выпаў снег!
– Тата, мамачка, не спіце,
у акно хутчэй зірніце...
Першы снег, бялюткі снег,
колькі ён прысыпаў стрэх,
і сцяжынак, і дарог,
на варотах нават лёг,
двор старанна абяліў,
наваколле асвятліў.
Першы снег, бухматы снег!
Дзе ўжо болей тут заснеш...
Не паспеў паснедаць Янка,
кажа тату:
– Хачу санкі.
(Акурат была нядзеля,
дома ўся сям'я сядзела.)

Тата саначкі прынёс,
а каб хлопчык не замёрз,
малахай дастала мама,
шубку лёгкую таксама.
Цэлы ранак, цэлы ранак
Янка наш правёў ля санак.
І гулялі разам з ім
Ніна, Галя і Яўхім.
А яшчэ на снежны двор
выйшлі Петрык, і Рыгор,
і маленькі Васілёк –
дзеці зблізку і здалёк.
Дружна дзеці снег ляпілі,
крэпасць моцную рабілі.
Там пайшлі ў атаку снежкі,
за разведкай – перабежкі, –
там гарачыя баі
«нашых» з «белымі» былі.
Завадатарам галоўным
Янка быў – ён быў няўлоўны.
Першы снег – усім на ўцеху:
мора гоману ды смеху...
А тым часам пацяплела:
крыху сонейка прыгрэла,
пацякло з высокіх стрэх,
стаў, як мокры цукар, снег,
крэпасць грозная асела,
горка мігам палысела.

І прыціхлі каля горкі
Янка, Петрык і Рыгорка,
Ніна, Галя і Яўхім...

Першы снег, пусці дадому:
боты мокрыя зусім.

## КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ДЗЕД МАРОЗ?

Браты Алеська і Максім
Жывуць на свеце белым.
Не ўсё пакуль вядома ім,
Не ўсё ім зразумела.
Пытанне ўзнікла ўсур'ёз
У двух братоў аднойчы:
«Калі прыходзіць Дзед Мароз?»
«Калі ж? Напэўна, ноччу».
Якраз у ноч пад Новы год
Браты амаль не спалі,
Мароза-дзеда ўсё ж прыход,
Падобна, прамаргалі.
Бо раніцой знайшлі браты
Пад ёлачкай пакункі,
Ляжалі у пакунках тых
Сямейцы падарункі.
Было там дзіва для братоў –
Яны не разумелі,

З двара як Дзед Мароз прыйшоў,
Што й дзверы не рыпелі.
Які цудоўны Дзед Мароз:
Нясе такую ношу!
Вось падарункі ўсім прынёс
І ўсім настрой харошы.

## *Янка Журба*

### ДЗЕД МАРОЗ

У вопратцы белай,
Шырокай, даўгой,
З вялікай пушыстай
Мятлой-барадой

Прыйшоў к нам здалёку
Дзядуля Мароз,
Завеі і холад
З сабою прынёс.

У бель апранае
І дрэвы, й кусты,
На рэчках, азёрах
Будуе масты.

Па вуліцы ходзіць
Ды снегам хрушчыць,
Вятры з сабой водзіць,
У дрэвах трашчыць.

Ён грукае ў сцены
І хат і сяней

Ды голасам гулкім
Склікае дзяцей:

«Выходзьце, рабяты:
Час ладзіць каток.
Дык жыва ж за працу,
Шумлівы гурток!»

## *Клаўдзія Каліна*

### ЛЮТЫ

Ідзе па зямлі Люты і пытае ў кожнага, ці адзеты, ці абуты. Зайшоў у сяло, пастукаўся да дзеда з бабай:

– Іду лютава́ць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць, усіх у хату заганяць. Люты я! Пытаю, ці ўсе адзеты, ці ўсе абуты.

– Усе, усе! – адказвае дзед. – У мяне кажух ёсць і валёнкі. У маёй бабы таксама кажух і валёнкі і цёплая хустка. І авечкі, і каровы ў цёплых хлявах. Хата прызбаю абнесена, дроў назапашана... Ідзі лютуй!

Супакоіўся Люты і пайшоў у лес да лясных птушак ды звяроў.

– О-го-го-го! – крычыць на ўвесь лес, аж рэха стогне. – Я лю-у-у-уты! Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць!

– А ў мяне цёплае дупло! Я накрыюся хвастом і буду спаць! Лютуй! – адказала вавёрачка.

– А я ў бярлозе лапу смакчу, – сапе скрозь сон мядзведзь. – Лютуй сабе!

– А я ў нару схаваюся! – матнуў рудым хвастом ліс.

– Я ямачку ў снезе зраблю! – сказаў заяц. – Я цяпер беленькі, і ніхто мяне не прыкмеціць.

– А мне не страшны ні мароз, ні завея, я ў цёплай камізэльцы! – ціўкнуў снягір.

– Я падамся да ч-ч-чалавечага пры-тулку-у! – застракатала сарока.

І ўсе звяры і птушкі пахаваліся. Хто ў нару, хто ў дупло, хто пад снег.

І што тут пачалося! Люты як дзьмухне – сумёты, як горы, выраслі. У маленькіх ялінак і сасонак толькі чубы з-пад снегу тырчаць. На рэчцы страляе лёд. А Люты лютуе. То марозам сцісне, то завеяй у вочы сыпне.

Доўга лютаваў. Нарэшце стаміўся, лёг пад сасною адпачываць і заснуў. Спіць сабе Люты і не чуе бяды.

А сонейка выглянула з-за хмар, нагрэла на сасне снег... І пачало з ледзяшоў капаць. Кап! Кап!

Выглянула з дупла вавёрка і зацокала на ўвесь лес:

Спіць Люты! Спіць, не чуе,
Што вясна яму рыхтуе!

Вылецеў з дупла дзяцел і як застукае дзюбай, тэлеграму адбівае:

Спіць Лю-ты! Спіць пад сас-ною,
А Са-ка-вік ужо за спі-ною!

А з ледзяшоў: кап! кап! кап!

Раптам – кап! – проста Лютаму на нос. Падхапіўся Люты, дзьмухнуў раз, другі завеяй, але і сілы ўжо няма. Чуе, Сакавік ужо недалёка.

## ЗІМОВЫ ДУБ

Ідзе лесам Лістапад, лісце сыплецца як град, сякуць дажджы касыя, шумяць вятрыскі злыя... Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць да яго ног пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай птушкі, звяры пахаваліся ў зацішак, апусцелі палі.

Задаволены Лістапад: усё скарылася яму. Усміхнуўся, паслаў на зямлю бледны сонечны прамень, глянуў з-за шэрых хмар лапінкай блакіту. Але што гэта? Вунь на ўзлессі раскінуў веццe магутны Дуб, увесь у мядзянай лістоце.

– Чаму ты не скарыўся мне? – грозна спытаў Лістапад.

– Я Зімовы. Таму да вясны буду ў мядзяным убранні.

Угневаўся Лістапад.

– Гэй, вятры буйныя! – паклікаў ён сваіх памочнікаў. – Сарвіце з Дуба яго мядзяны ўбор!

Завылі вятры, зашумелі галіны Дуба.

— Гэй, дажджы халодныя! — гукнуў Лістапад. — Пазбівайце з Дуба лісце.

Секанулі дажджы, забарабанілі па буйным лісці, але Дуб не зварухнуўся.

— Гэй, браце Снежань, — загукаў Лістапад. — Прышлі мне марозу пякучага, завеяў сыпучых, няхай замарозяць, засыплюць снегам непакорнага!

Прымчалі маразы, прыляцелі завеі, марозілі, снегам секлі, але не скарыўся Дуб.

Спахмурнеў Лістапад і адступіўся ад цара лесу... Усю зіму стаіць Дуб у сваім мядзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае. За гэта называюць яго Зімовым Дубам.

## *Уладзімір Карызна*

### ГУКАННЕ ДЗЕДА МАРОЗА

Дзе ты, добры Дзед Мароз,
Можа, ў лесе ты замёрз?

Чаму к нам не завітаў —
Мо валёнкі пагубляў?

Ці вавёрка спрытнай лапкай
У цябе схапіла шапку?

Дзе ты, добры Дзед Мароз,
Можа, снег цябе занёс?

Ці кажух свой не знаходзіш,
Ці вакольным шляхам ходзіш?

Ці лісічка мех праела —
І ў мяшэчку апусцела?

Дзе ты, добры Дзед Мароз?
Пакажы нам хоць бы нос!

## НАВАГОДНЯЯ ПЕСЕНЬКА

З лясной глушы завейнай
Руплівы Дзед Мароз
Нам ёлачку на свята
Вясёлую прынёс.

Зялёныя галінкі
Агнямі зіхацяць.
Не будзеш адзінока
Ты, ёлачка, стаяць.

Мы песняю шчаслівай
Вітаем Новы год.
І зайчыкі, і ліскі,
Ідзіце ў карагод!

## *Якуб Колас*

### ДЗЕД-ГОСЦЬ

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.

Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые рэкі, травы, лозы
Белай посцілкай-кажухам.

Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.

А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.

Тут лісічка, зайчык, мышкі,
Рыбкі, буслік даўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы.

Каля елкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.

Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

## ЗІМА

Эх ты, зіманька-зіма!
Непагодная была:
Ні праехаць, ні прайсці,
Ні коніка правесці!

*З народных песень*

Крэпка скаваў мароз голую зямлю, зрабіў яе цвёрдай як камень. Вымерзлі лужынкі, высахла гразь; халодная кара лёду легла на рэкі і азёры. Цвёрдую пасцельку прыгатаваў мароз для мяккага белага снегу. Чакае ўсё гэтага снегу, каб закрыцца хоць гэтай халоднай коўдрай ад пякучага марозу.

Вось падуў сівер, і папаўзлі па небе снегавыя хмары, сівыя, лёгкія, як дым, халодныя, непрыветныя, і завалаклі ўсё неба. Вось, ціха лётаючы па ветры, закружыўся белы, лёгкі пушок, камячок снегу, пераварнуўся некалькі

разоў, памкнуўся з аднае стараны ў другую, як бы выглядаючы лепшае месца, і нячутна лёг на мёрзлую зямлю. За ім паказаўся другі, трэці, і ўсё часцей, усё гусцей залёталі гэтыя белыя, халодныя матылёчкі зімы і пасыпаліся на зямлю. І як жа многа іх закружылася ў небе! Аж пабялела паветра, і белая сетка сплятаецца з іх. Валяць і валяць белыя сняжынкі; адзін аднаго пераганяюць гэтыя харошанькія камячкі, зляпліваюцца ў паветры і кладуцца на зямлю. Борзда бялее зямля. Снег роўнаю плёнкаю кладзецца на хаты, на гумны, на парканы, на платы, на шулы, на ўсё, што ні сустрэне прад сабою.

Назаўтра, праз ноч, выходзіш на двор. І пазнаць трудна божы свет: так змяніў яго снег! Гляньце на шулы! Дапраўды, аж смешна: стаяць усе ў рад і ў кожнага наверсе па белай шапцы-кучомцы; стаяць, пазіраюць, усё роўна як у госці прыйшлі. На стрэхах ляжыць цэлы слой снегу, як хто палотны парассцілаў. Куды ні кінь вокам, усюды бела і бела, аж вочы адбірае. Вунь стары лес. Адзеўся, прыбраўся, як у свята, і глядзіць як немаведама хто. Проста дзіваў натварыў гэты снег-жартаўнік: цэлае войска прывёў за ноч старых баб і дзядоў!

Прыціхла рэчка, і закрыў яе зусім снег, так што і берагоў не відаць. Усюды, куды

ні глянь, адна белая пялёнка снегу. І луг, і поле, і горкі – усё засыпана белым халодным пухам.

Весела выскачылі на вуліцу з хаты дзеці. Рады яны першаму снегу. Бегаюць, крычаць, пхаюць адно аднаго ў гурбы, кідаюцца снегам. Але з зімою малыя жарты: шчыпне яна і за нос, за вушы, і бягуць дзеці з двара ў хату.

– На печ лезьце! – крыкне на іх бацька ці маці.

## **П***ятрусь Макаль*

### БЯЛЕЕ СНЕГ ПУШЫСТЫ

Бялее снег пушысты.
Сняжынкі навакол,
Нібы парашутысты,
Спускаюцца на дол.

Ад гэткай прыгажосці
Скакаць і пець хачу.
– Адкуль, адкуль вы, госці? –
Гарэзліва крычу.

– Мы з ледзяной дзяржавы,
З адвечнае зімы.
І снежныя забавы
Нясём з сабою мы.

Нясём мы бабу снежную
На срэбраным крыле,
Нясём пургу мяцежную,
Што скача на мятле.

Ляцім мы ўсе здалёку.
Нас на зямлю з нябёс
Паслаў яго высокасць
Мароз, Чырвоны нос.

## *Уладзімір Мацвеенка*

### ЁЛКА-ВЯСЁЛКА

Надвячоркам у бары
Гуртам збегліся звяры,
Каб наладзіць карагод
І паклікаць Новы год.

Падказаў адразу Лось:
– Побач тут палянка ёсць,
На ёй ёлка гожая,
Стройная, прыгожая...

Першым шэры Воўк прыбег
І вакол расчысціў снег.
Тут Вавёрка з дрэва – скок,
Развязала свой мяшок:

– Ёсць грыбы, арэхаў з дзесяць,
Трэба будзе іх развесіць...
Прапішчала з норкі мышка:
– А ў мяне старая шышка.

Зай тры морквіны прынёс
І расчуліў аж да слёз,
Як сказаў: «На жаль, сябры,
Засталося толькі тры...»

А Лісіца ўздыхае:
— Нам чагосьці не хапае...
— Паглядзіце! — крыкнуў хтосьці, —
Дзед Мароз шыбуе ў госці!..

Дзед як выйшаў на паляну,
На звяроў з усмешкай глянуў:
— Не сумуйце! Як магу
Вам, сябры, дапамагу.

Ёлку ён паварушыў,
Шэранню прыцерушыў
І паклікаў:
— Снегіры,
Не хавайцеся ў бары,
На паляну прылятайце
І на ёлачку сядайце!

Прыляцелі снегіры,
Як чырвоныя шары,
І, нібыта на арэлі,
На галінкі важна селі.

Упрыгожаная ёлка
Зазіхцела, як вясёлка.
І запляскалі ўсе ў ладкі,
І наўкруг пайшлі ўпрысядкі...

## **А***дам* *Русак*

### СІНІЧКА

Адляцелі птушкі ў вырай,
Доўга будзем іх чакаць,
А сінічка засталася
З намі зімаваць.

Сінічка, сінічка,
Родная сястрычка,
Люба слухаць нам зімой
У садочку голас твой.

Рассцілаюцца сняжынкі
Белым пухам на траве,
А сінічка на акенцы
Нас у сад заве.

Наш садок узорам белым
Упрыгожыла зіма,
На галінках многа цвету,
Толькі груш няма.

Мы паставілі кармушку,
Клічам к цёпламу акну,

Каб сустрэла наша птушка
З песняю вясну.

Сінічка, сінічка,
Птушка невялічка,
Люба слухаць нам зімой
У садочку голас твой.

## **М**_ікола Чарняўскі_

### ЁЛКА

Завітала ў госці ёлка –
З намі Новы год спаткаць,
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Рада пець і танцаваць.

Зухаваты, барадаты
Сыпле жарты Дзед Мароз.
Са Снягуркаю на свята
Падарункі ён прынёс.

Вочы весняцца ў Снягуркі,
Добра ўсім каля яе:
Нам Снягурка падарункі,
Як усмешкі, раздае.

Што за дзіва – наша ёлка!
Што за свята – Новы год!
Ззяе ёлка, як вясёлка,
Водзіць з намі карагод.

## ЛІСА-КАЛЯДОЎШЧЫЦА

Ноч не спалася Лісе –
Есці ўсё хацела.
А кладоўка пакрысе
Раптам апусцела.

– Што мне бегаць, мышкаваць?
Лепш пайду калядаваць
Без Ваўка:
Такі кумок,
Каб пасля ўсё не звалок.
Мне адной пры калядзе,
Што збяру, –
Перападзе!

Маску хуценька зрабіла,
Каб казою выглядаць,
Рогі з сучча начапіла:
Хто пад маскай –
Не пазнаць.
Бо Лісу-зладзейку ў вёсцы
Знали не па пагалосцы.

Адшукала кажушок,
Зношаны, казіны,
Узяла кіёк,
Мяшок
Аж на дзве карзіны.

І — да першага двара,
Да гаспадара.

— Го-го-го, я — каза,
Го-го-го — шэрая!
Хто сказаў, што каза
Не вячэрае?
Гаспадар, зрабі мне ласку,
Дай ці сала, ці каўбаску.
А я гэту каўбасу
За тры горкі панясу,
Да лясной паветкі,
Там чакаюць дзеткі,
Казляняткі родныя,
Як і я,
Гаротныя!

Гаспадар зірнуў з усмешкай:
— Дзе, якой блукала сцежкай?
Чуць не чуў,
Што так прыспела,
Каб каза каўбасы ела.
Сена маю, муражок,
Падстаўляй, каза, мяшок...

З хаты выбегла Ліса —
Толькі ў думках каўбаса.
Да суседняга двара
Падышла, спеў завяла:

– Го-го-го, я – каза,
Го-го-го – шэрая!
Хто сказаў, што каза
Не вячэрае?
Гаспадарык-гаспадар,
Маеш дзетак –
Божы дар.
Пакладзі ў мяшок паўкуркі –
Пагуляю з дзецьмі ў жмуркі.
А падорыш каўбасу –
Запляту малой касу.
Потым гэту каўбасу
За тры горкі панясу,
Да лясной паветкі,
Там чакаюць дзеткі,
Казляняткі родныя,
Як і я,
Гаротныя!

Гаспадар зірнуў з хітрынкай:
– Ты з мяшком,
А не з карзінкай?
Чуць не чуў,
Што так прыспела,
Каб каза ды курку ела.
Канюшыны ёсць стажок,
Наскубі сабе ў мяшок...

З хаты Ліска вылятае –
Толькі ў марах курка тая!

І — да трэцяга двара,
Да яго гаспадара:

— Го-го-го, я — каза,
Го-го-го — шэрая!
Хто сказаў, што каза
Не вячэрае?
Каб вялося ўсё ў аборы,
Прынясі кумпяк з каморы.
Будзе і за ласку,
Як дасі каўбаску.
Нават студню міску —
Дзеткам на аблізку.
Будзе не ў нагрузку,
Як дасі мне гуску.
Прынясеш смятанку —
Спяю ўнуку Калыханку,
Будзе спаць пасля да ранку!

Гаспадар зірнуў з развагай:
— Што ж адна ты, бедалага?
Дзе ж твой кум,
Напарнік твой?
Што матляеш галавой?
Чуць не чуў,
Што так прыспела,
Каб каза ды скорам ела.
Ёсць у склепе качанок,
Можа, кінуць у мяшок?

А чаму ў цябе, казы,
Гэткі ж хвост,
Як і ў лісы?
Ды і голас не казіны,
А лісліві,
Як лісіны.
Можа, нам Барбос падкажа?
На лісу ён злы за кражу:
Звалакла гуся з-пад носа.
Я ж не пахваліў Барбоса...
Ды не бойся,
Не трымці,
Пакаштуй маёй куцці.
Як-ніяк усё ж Каляды,
А ў Каляды —
Госцю рады!
Гэй, Барбос,
Цю-цю, цю-цю,
Прынясі хутчэй куццю!

Дзе ўжо тут куцця ды куры!
Не застацца б хоць без шкуры!
Сіганула Ліска —
Да нары не блізка!
У нары шукала косці,
Пышны хвост кусала ў злосці:
З-за цябе, пагани хвост,
У мяне —
Калядны пост!

# Як ты да людзей, так і людзі да цябе

## *Эдзі Агняцвет*

### ЛЕДЗЯНЦЫ

Аднойчы на канцэрце
Сядзелі малайцы,
Пад музыку смакталі
З ахвотай ледзянцы.

Паперкі шамацелі,
Нібы асенні ліст...
А ў гэты час дзівосы
Паказваў піяніст.

Спявалі ў зале рэкі,
Выраставалі бары,
Успыхвалі маланкі
Над вежамі ўгары.

Цікава, што пачулі
Тры хлопцы-ласуны?

Ім сніліся, напэўна,
Цукерачныя сны?

Паперкі шамацелі,
Танчэлі ледзянцы...
Аднойчы на канцэрце
Сядзелі малайцы.

Давайце іх навучым
Знайсці музычны слых,
Каб паважаць суседзяў,
Ды і сябе саміх!

## *Генадзь Аўласенка*

### ЯК МУХАМОРЫ ВАЙНУ ПАЧЫНАЛІ

Неяк ранкам мухаморы былі вельмі не ў гуморы. На палянцы на лясной, пад высокай пад сасной, яны ўсе сабраліся, дружна павіталіся і, слова за слова, пачалі размову. Усе ўраз апавядалі, на суседзяў паглядалі, патыліцы чухалі, толькі сябе слухалі...

Раптам бачаць: грыбнікі ідуць лясной сцежкай і бяруць баравікі, бяруць сыраежкі. Падасінавік знайшлі – узялі адразу. А да іх не падышлі, нават бокам абышлі і далей сабе пайшлі... Гэткая абраза!

– Што за ганьба! Што за сорам! – закрычалі мухаморы. – Грыбнікі нас зневажаюць! Як ідуць – не заўважаюць, а бяруць баравікі! Што за гонар ім такі?! Сыраежкі мусяць браць – іх жа ледзь з зямлі відаць! Мы ж за ўсе грыбы вышэйшыя, мы куды як прыгажэйшыя – дык чаму ж не бачаць нас?!

Баравік ім у адказ:

– Вы, вядома, шмат вышэйшыя за нас! Вы, магчыма, прыгажэйшыя за нас! Толькі вас не заўважаюць нездарма – бо карысці аніякай з вас няма, адна толькі шкода...

— Гэта што за мода: гэтак нас зневажаць, гэтак нас абражаць! — усклікнулі хорам усе мухаморы. — За такую абразу выклікаем адразу увесь род ваш грыбны на бой лясны! Калі мы вас здолець зможам, у баі вас пераможам — з лесу выселім мы вас! Вось такі наш будзе сказ!

Пачалі тут мухаморы гуртавацца, пачалі яны да бою рыхтавацца. Пачалі ваяводу выбіраці для сваёй для мухаморавай рацi.

Вось адзін мухамор на пень узлез, закрычаў, загукаў ён на ўвесь лес:

— Гэй, мухаморы, і з лесу, і з бору! Збірайцеся да сасны, рыхтуйцеся да вайны! Да бою, да паходу... а я — за ваяводу!

— А чаму гэта ты за ваяводу?! Не давалі мы на гэта сваёй згоды! — закрычалі мухаморы дружным хорам.

Тут на пень, услед за першым мухаморам, другі хутка ўзлез. Зноў крычыць на ўвесь лес:

— Выбірайце мяне — і ў гэтай вайне мы ўсіх пераможам! А з іншым — не зможам!

— Лепей ты памаўчы! — яму трэці крычыць. — Не з тваёй галавой мухамораў весці ў бой! Ну, а я не падвяду: вас на бітву павяду, буду вамі кіраваць, а інакш — не здабраваць!

Глядзь — чацвёрты ціха лезе на калоду:

— Так і быць — буду я за ваяводу!

Ну, а пяты яго цягне за нагу:
– Я і сам ваяводам быць змагу!

Тут усе мухаморы раскрычаліся хорам. Кожны кожнага абражаў, кожны кожнаму па-гражаў, кулакамі махаўся, у плечы штурхаўся, усяляк абзываўся – да вайны, адным словам, рыхтаваўся...

А калі замарыліся крычаць – вырашылі мухаморы распачаць вялікі бой... паміж сабой!

А ўсе грыбы збіраліся, з мухамораў смяяліся. Пляскалі ў ладкі, елі аладкі, квасам запівалі, мяне частавалі. А я ў грыбоў гасцяваў і аладкі каштаваў, запіваў іх квасам... ну, а сам тым часам гэту казку напісаў і вам яе расказаў.

## *Алесь Бачыла*

### КОЛЬКІ КОТ НАБІЎ ПАСУДЫ

Я расказваць вам не буду,
Колькі кот набіў пасуды,
Хай раскажа сам Валерка, –
Чайнік, супнік, дзве талеркі,
Ажно сем гаршкоў з-пад кветак
І ў дадатак – пяць разетак.
А спытаюць – скрывіць рот:
– Гэта ўсё праклятьі кот...

«Кот – дык кот...»
І ўсё таму
З рук сыходзіла яму.

Мо сышло б і гэтым разам –
Не змахні з серванта вазу.
Ваза ў друз – Валерка ў пот:
«Як сказаць, што скінуў кот?
Хто ж паверыць той мане –
Кот жа вазу не скране.
Вось дык гора... Вось бяда...
Ды і коціка шкада –
Зноў пратураць за парог».
Хлопчык больш ілгаць не мог.

Мама нават не журыла,
А за шчырасць — пахваліла.
Рад Валерка, рада мама,
І, вядома, кот — таксама.
Мусіць, з радасці тае́
Ён пасуды больш не б’е.

## *Ядвіга Бяганская*

# АЛЕНЧЫНЫ КАНЬКІ

На школьным двары залілі вялікі каток, і цяпер з самага ранку тут стаіць вясёлы гоман і смех.

Аленка з зайздрасцю назірае, як спрытна коўзаюцца аднакласнікі, якія фігуры выкручваюць на лёдзе. «Былі б у мяне канькі, я таксама не горш коўзалася б», – думае яна. Але канькоў у Аленкі няма. Ды і спадзявацца пакуль што не прыходзіцца: трэба справіць паліто старэйшай сястры, падрамантаваць кватэру...

– Чаму ты прыйшла на каток без канькоў? – цікавіцца Юрка.

Дзяўчынка не адказвае. Навошта?

– Хадзем, Аленка, я дам свае, – кажа, спыняючыся каля іх, Ганя.

– А я цябе навучу коўзацца, – дадае Янка.

Аленка з удзячнасцю глядзіць на сяброў, і на яе твары ўспыхвае ўсмешка.

Яны падыходзяць да лаўкі. Ганя скідвае свае чаравікі з канькамі і, усунуўшы ногі ў Аленчыны боцікі, дапамагае ёй абуцца.

– Я ж коўзацца зусім не ўмею, – збянтэжана кажа Аленка, трымаючыся за Янкаву руку.

– Навучышся, гэта проста, – падбадзёрвае Янка і, сціснуўшы мацней Аленчыну руку, падае каманду:

– Правай-левай! Правай-левай!

Зрабіўшы некалькі кругоў, Янка раптам выпускае яе руку:

– Ну а цяпер сама. Ды ты не бойся, не бойся!

– Ой! – палохаецца Аленка. Правая яе нага ўцякае ўперад, а левая чамусьці адстае, і дзяўчынка, узмахнуўшы рукамі, падае.

– Не бойся, яшчэ крыху павучымся, – смяецца Янка, і яны зноў коўзаюцца разам.

– Ну як, падабаецца? – пытае Ганя, калі Аленка з Янкам спыняюцца.

– Вельмі, – усміхаецца Аленка і пачынае расшнуроўваць чаравікі.

– Папрасі, каб і табе маці купіла канькі, – кажа сяброўцы Ганя. – Будзем разам коўзацца.

– Хіба пазней, – уздыхае Аленка і расказвае Гані пра свае хатнія клопаты.

– Ну, то прыходзь заўтра. Будзем на маіх па чарзе коўзацца.

Цяпер Аленка штовечар прыходзіць на каток. Ганя, угледзеўшы яе здалёк, спяшаецца насустрач. А з ёю Марынка, і Зося, і Верачка. Яны нават спаборнічаюць: хто першы ўгледзіць Аленку, той першы і канькі свае ёй аддае.

## *Галіна Васілеўская*

### УСМЕШКА

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Сустракаючыся, людзі ўсміхаліся адзін аднаму — такое было ў іх прывітанне.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я не ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя, — сказаў сам сабе чараўнік. — Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу, бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць харошыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі, і злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.

Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў цягнуўся лёгкі дымок.

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь з'явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэве, і зялёным лісточкам, што трымцелі ад лёгкага ветрыку.

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.

– Аддай усмешку! – крыкнуў ён страшным голасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека – як яе возьмеш?

Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

– Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла...

– Куплю ўсмешку, – вырашыў нарэшце чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі пацiскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго зморшчаных шчоках.

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка, пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

– Чаго ты плачаш, добры чалавек?

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ гарчэй.

– Не магу больш так жыць, – усхліпваючы, прагаварыў чараўнік, – ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў... Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

– Усмешку не купіш і не ўкрадзеш, – сказаў жыхар казачнага горада. – Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў ты сёння што добрае. У полі працаваў?

– Не, – адказаў чараўнік.

– Дом будаваў?

– Не.

– Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?

– Не, не, не, – і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

– Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала.

Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.

Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешцы. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела, што ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы. Цяпер ён, напэўна, стаў шчаслівым добрым чараўнікам і сам дорыць людзям усмешкі.

## *Аляксей Дудараў*

### ПУХНАЦІК

Ён нарадзіўся свежым ранкам у глыбокай горнай цясніне. Там, сярод цяжкіх валуноў, бруілася імклівая і неспакойная рачулка. Яе халодная вада так білася аб каменне, што драбнюткія пырскі высока ляцелі ўгору, кружыліся ў паветры і павольна асядалі... З гэтых пырскаў ён і нарадзіўся. Бялюткі, кучаравы, з тоўстымі шчочкамі... Толькі з'явіўся на свет і адразу ж адчуў, што ўмее лятаць.

І ён паляцеў хутчэй прэч са змрочнай цясніны ўгору, да блакітнага неба і яснага сонца. Ляцеў, ляцеў, аж раптам бачыць, што над цяснінай вісіць нехта вялізны і сівы. Вісіць нерухома, быццам дрэмле... Падплыў, прывітаўся:

– Добрай раніцы, дзядзечка волат!

Той расплюшчыў старэчыя вочы і адказвае:

– Добрай раніцы... Толькі я не волат. Я – стары дзед Туман.

– А я яшчэ не ведаю, хто я і як мяне завуць... – Толькі-толькі нарадзіўся... Ля рэчкі...

— Ты маленькае воблачка, — сказаў дзядуля Туман. — А завуць — Пухнацік.

— Я лятаць ужо ўмею, — пахваліўся Пухнацік. — Як нарадзіўся, так і паляцеў адразу... Вось як!

— Усе воблачкі лятаюць, — паблажліва ўсміхнуўся дзядуля Туман. — Яны ўвесь час падарожнічаюць па небе.

— Па небе?! — усклікнуў Пухнацік. — І я таксама буду?

— І ты пабываеш у розных мясцінах, шмат чаго ўбачыш... Толькі памятай, — з перасцярогай загаварыў дзядуля Туман, — ты ніколі не павінен плакаць... Ніколі! Ні ад крыўды, ні ад жалю... Як толькі заплачаш — усё.

— Што, памру? — напужаўся Пухнацік.

— Не, не памрэш, проста знікнеш. Растанеш у небе, і цябе больш не будзе... Зразумеў?

— Ага... Ані слязінкі ніколі ў мяне не капне.

— Ну, бывай, Пухнацік... Шчаслівай табе дарогі!

Падзякаваў Пухнацік дзядулю Туману за добрую параду і паляцеў далей. Гарэза Ветрык адразу ж падхапіў яго і панёс высока над зямлёй да засмужанага далягляду. Унізе горы, стэпы праплываюць, зверху сонейка яркае свеціць, навокал блакіт неабсяжны... Хораша Пухнаціку і весела.

Ляцеў ён, ляцеў, ды раптам пытаецца ў Ветрыка:

— Слухай, Ветрык, а што гэта за цёмная пляміна па зямлі бяжыць за намі? Куды мы — туды і яна.

— А гэта ты, — адказвае Ветрык.

— Ну? — засмяяўся Пухнацік. — І тут я, і там я... Нават смешна. Як жа такое можа быць?..

Ветрык растлумачыў:

— Тут — гэта ты, а там — твой цень. Зразумеў?

— Зірні, зірні, Ветрык, — раптам закрычаў Пухнацік. — Там на мяне нехта ўзлез!..

— Гэта чалавек у твой цень схаваўся... Сонейка апоўдні гарачае і сярдзітае, ад яго ўсе хаваюцца. Вось і чалавек, бачыш, змарыўся, прылёг адпачыць... У цяні прахалода... Ну, хопіць размаўляць, паляцелі далей.

Але толькі яны адляцелі, як чалавек падняўся і пайшоў даганяць цень. Дагнаў, зноў прылёг. Пухнацік спыніўся і кажа:

— Слухай, Ветрык, а давай мы цень мой пакінем тут, а самі далей паляцім. Хай чалавек адпачывае...

— Нічога не атрымаецца, — адказаў Ветрык. — Калі ты хочаш, каб цень твой тут быў, — павінен і сам тут застацца.

— Ну добра, — уздыхнуў Пухнацік. — Ты ляці без мяне, а я пачакаю, пакуль ён адпачне... Шкада ж чалавека... Я цябе потым даганю, калі сонейка будзе не такое сярдзітае.

— Бывай, Пухнацік! — развітаўся Ветрык і знік. Да самага вечара вісеў нерухома Пухнацік, а ўнізе, на зямлі, у яго цяні спаў чалавек. Калі сонейка схілілася на захад, пачырванела і зноў стала спакойным і ласкавым, чалавек падняўся, зірнуў у неба і гукнуў:

— Дзякуй табе, воблачка! — і пайшоў сваёй дарогай. А Пухнацік паплыў далей. Схавалася сонейка, рассыпаліся па небе зорачкі, выглянуў рагаты месяц. Пухнаціку захацелася спаць. Ён прымасціўся на схіле гары і задрамаў.

Раніцай зноў рушыў у дарогу. Доўга-доўга плаваў над гарамі, над стэпамі, над пустынямі, шмат чаго пабачыў, шмат пра што даведаўся, а потым сам не заўважыў, як зажурыўся. Сумна аднаму ў падарожжы.

Азірнуўся Пухнацік па баках. Неба чыстае, ані воблачка...

— Дзе ж мае брацікі? — уздыхнуў ён. Раптам угледзеў далёка белую кропку. Паплыў Пухнацік туды. Думаў, што гэта таксама воблачка. Падплывае бліжэй, бачыць, гойдаецца

ў паветры нехта белы, з намаляваным ротам і з хвастом.

— Добры дзень, — прывітаўся Пухнацік.

— Хы-хы-хы! — адказаў хвастаты.

— Ці не мой ты брацік?

— Ну, ну! — абурана закрычаў той, што з хвастом. — Я — змей!

— Змеі не лятаюць, яны поўзаюць.

— А я паветраны! Хы-хы-хы! Папяровы! Я ад сваіх гаспадароў уцёк.

— Хочаш быць маім брацікам? — прапанаваў Пухнацік. — Будзем разам лётаць. І табе і мне весялей будзе.

— Яшчэ што! — адказаў папяровы Змей. — Ты ж толькі воблачка, а я — Змей! Не трэба мне ніякіх брацікаў!

— Дрэнны ты Змей, — сумна сказаў Пухнацік і падаўся прэч.

Паплыў ён, паплыў — бачыць: ляціць нехта ўверсе. Таксама белы, таксама з хвастом, а на галаве — нібы піка чырвоная. Пухнацік за ім.

— Ты Змей? — пытаецца.

— Не, не Змей, — адказаў той, што ляцеў.

— Ты воблачка?

— Не, не воблачка.

— Дык хто ж ты?

— Проста бусел...

— Дык, можа, ты мой брацік?

— Я ж сказаў, што бусел я. А ты — воблачка.

— І ты не хочаш быць маім брацікам? — зарумзаў Пухнацік, але ўспомніў, што яму плакаць няможна.

— Чаму не хачу? Давай будзем братамі, — сказаў добры бусел. — Паляціш да мяне на радзіму?

— Далёка? — зацікавіўся Пухнацік.

— Вельмі далёка... Там цяпер вясна... Цёплы дожджык зямлю палівае...

— А што такое дожджык? — спытаўся Пухнацік.

— Дожджык гэта... калі воблачкі плачуць, — адказаў бусел.

— Тады бывай, — сумна ўздыхнуў Пухнацік. — Плакаць я баюся...

— Бывай, — памахаў на развітанне крыламі бусел. — І не сумуй. Знойдзеш ты сабе брацiка...

Бусел паляцеў. Пухнацік зноў застаўся адзін. А ў небе, як на тую бяду, ні хмурынкі. Спякота...

Шукаў, шукаў Пухнацік сваіх брацікаў, аж раптам бачыць — скала ўнізе, а на схіле той скалы ляжыць маленькае белае воблачка.

— Ды гэта ж і ёсць мой брацік! — узрадаваўся Пухнацік, хуценька апусціўся, падплыў бліжэй і бачыць, што брацікаў тут вельмі многа.

Усе малюсенькія, з жоўтымі тварыкамі, з белымі пялёсткамі. У кожнага зялёненькая тонкая ножка. Стаяць яны адзін ля аднаго, галоўкі журботна апусцілі.

— Добры дзень, брацікі, — прывітаўся Пухнацік. — Хто ж вас пакрыўдзіў? Чаго вы такія сумныя?

— Мы — рамонкі, — адказала адна кветка. — Ветрык нас прынёс сюды ў гэтую пустыню, калі мы яшчэ насеннем былі. Мы прараслі, а цяпер во — даводзіцца паміраць.

— Чаму?

— Дожджыку няма, зямля сухая, а мы піць хочам...

— Піць, піць... — танюсенькімі галасочкамі падхапілі астатнія рамонкі.

— Не трэба плакаць, бо вы растаць можаце...

— Піць, піць...

— Ну, брацікі мае, ну, не плачце, калі ласка, бо і я заплачу, а мне нельга, — пачаў суцяшаць Пухнацік. — Скажыце, дзе той дожджык, — я яго знайду.

— Дожджык бывае, калі воблачкі плачуць, — адказалі рамонкі і зноў журботна і жаласліва схіліліся над парэпанай ад спякоты зямлёй сваімі белымі пялёсткамі. І Пухнацік заплакаў. Так шкада яму стала белых рамонкаў, што ён забыўся пра папярэджанне

дзядулі Тумана. Паліліся з яго кропелькі чыстай вадзіцы, кропелькі дажджу... Напіліся рамонкі ўдосталь, павесялелі, расправілі свае пялёсткі.

А Пухнацік? Не, ён не знік. Ён ператварыўся ў лёгкую белую смугу над рамонкамі і ў кропелькі празрыстай расы, што нават у самую спёку блішчаць на пялёстках кветак...

Той, хто робіць добрае — ніколі не знікае.

# ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ

*Беларуская народная казка ў апрацоўцы Алеся Якімовіча*

Быў адзін дурнаваты чалавек. Захацелася яму пайсці на кірмаш. Злавіў ён белага пеўня, засунуў за пазуху ды пайшоў. «Прадам, – думае, – пеўня, куплю махоркі».

Яшчэ не дайшоў да кірмашу, а тут ужо яго і купцы сустракаюць:

– Што прадаеш, дзядзька?

– Пеўня, – кажа чалавек.

Дастаў ён з-за пазухі белага пеўня. Купцы паглядзелі, галовамі паківалі:

– Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

«Жартуюць, – думае дзядзька, – ліха ім!» Забраў пеўня ды ідзе далей.

Прайшоў крыху – другія купцы падбягаюць:

– Што прадаеш?

– Пеўня.

Паглядзелі:

– Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

Прыгледзеўся лепш чалавек і сам да свайго пеўня: «А можа, і заяц? – думае. – Не вер вачам! Відаць, праўда, калі ўсе як у бубен б'юць».

Прыйшоў ён на самы кірмаш. Людзей там так густа, што і яблыку няма дзе ўпасці.

Каля аднае крамы стукаюць у патэльні, каля другой звоняць косамі – пакупнікоў за-

клікаюць. Такі шум, гоман на кірмашы, што чалавек ледзь не аглух.

Ачухаўся ён трохі і сам пачаў крычаць:

— Купіце зайца! Купіце зайца!

Падыходзіць да яго баба, дзівіцца:

— Які ж гэта заяц? Гэта ж певень!

Ды чалавек стаіць на сваім:

— Заяц, кажу табе, а не певень!

Сабралася куча народу. Жартуюць з бабы:

— Дзядзька праўду кажа! Ці ж ты не бачыш, што гэта заяц!

Тут ужо чалавек зусім паверыў, што прынёс ён на кірмаш зайца, а не пеўня. І калі хто з купцоў гаварыў цяпер, што гэта певень, а не заяц, дык ён ледзь не з кулакамі на яго кідаўся.

Хадзіў, хадзіў чалавек па кірмашы з пеўнем, і ўсё яму здавалася, што гэта не певень, а заяц.

Надакучыла пеўню цягацца з чалавекам — пара б ужо і на седала збірацца! Залопаў ён крыламі ды як закрычыць на ўвесь кірмаш:

— Ку-ка-рэ-ку!

Пачуўшы гэта, чалавек зусім збіўся з панталыку: заяц, а пеўнем спявае! Выкінуў ён пеўня з-за пазухі, плюнуў ды пайшоў дахаты.

Праўду кажуць старыя людзі: не той дурань, каго завуць дурнем, а той дурань, хто чужым розумам жыве.

Людзей слухай, а свой розум май.

## *Еўдакія Лось*

### КАЗКА ПРА ЛАСКУ

Ціха, дзеці,
Паслухайце казку
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку!

Дзе жыве яна,
Як выглядае,
З кім сябруе,
Каму памагае.

* * *

Неяк Ласку угледзеў
Сяргейка,
Хоць і слёзы блішчалі
На вейках.

Захварэў неўспадзеўкі
Хлапчына.
Сінява залягла
Пад вачыма.

Парашкі ён глытаў
І пілюлі,
Смеху хлопчыка
Доўга не чулі.

І тады да ягонага
Ложка
Падышла, нібы цень,
Басаножка.

Падышла неўзаметку
Малая,
За плячыма –
Каса залатая.

– Ты Сяргейка? –
Пытае ласкава
І плыве каля ложка,
Як пава.

– Ты хвараеш?
Замучылі лекі?
Пацярпі,
Не хвалюйся, маленькі!

Хочаш – коўдру тваю
Я папраўлю!
Хочаш – кветак у шклянку
Пастаўлю!

Каля хворага
Без адпачынку
Завіхаецца
Тая дзяўчынка.

Лоб малога пагладзіла,
Бровы, –
І Сяргейка заснуў,
Як здаровы.

І ў сне ўжо,
Што быў нібы казка,
Ён пытае:
– Скажы, калі ласка,
Хто ты?
– Ласка.
– Якая?
– Такая,
Што маленькім
Заснуць памагае.

– Дык застанься са мной,
Мая Ласка!
– Я спяшаю ў калгас,
Да Тараскі.

І, махнуўшы хусцінкаю
Белай,
Неўпрыкметку пайшла,
Паляцела.

Ціхі хлопчык
Ажно засмяяўся:
Ён з хваробай сваёй
Развітаўся!

* * *

Пасварылася з Надзяй
Ларыска.
І за што?
З-за малочнай ірыскі!

Да дзяўчынак
Прыходзіла цёця
Надарыла цукерак
Блазноце.

І дражэ,
І «падушак»
І «мішак».
Немалое багацце
Ў малышак!

Адно цешся з салодкіх
І еш
Ды сябровак частуй ты...
Дык не ж!

Стала крыўдна старэйшай –
Ларысцы,
Што ў Надзеі –
Яшчэ і ірыскі!

Вось старэйшая,
Каб не журыцца,

Адабрала ірыскі
Ў сястрыцы.

Хто паможа
Надзейцы ціхмянай?
Хто ёй верне
Прысмак адабраны?

Можа, цёця?
Яна на рабоце.
Можа, мама?
На працы таксама.

Памагла ёй
Дзяўчына-краса,
За плячмі –
Залатая каса.

І адкуль яна толькі
Ўзялася,
Як пазнала,
Што спрэчка ўзнялася?

На маленькіх нагах
Неабутых
Падышла да дзяўчынак
Надзьмутых.

Белай хусткаю
Твар абмахнула,

На сястрычак
Лагодна зірнула.

— Я завуся, — гаворыць ім,
Ласкай,
Вы паслухайце
Простую казку!

Я прыйшла
Ад Сяргейкі-Хварэйкі,
Я прыйшла
Ад Тараскі-Падпаска.

Сумаваў той без Ласкі
За статкам,
Калі ў поле падаўся
За таткам.

А пасля пабыла я
За морам,
За бязмежным
Блакітным прасторам.

Там чакаў мяне
Бедны, пануры
Хлопчык з чорнаю-
Чорнаю скурай.

У краіне,
Дзе сонца багата,

Гэты хлопчык
Застаўся без таты.

Тату ворагі злыя
Забілі,
Бо змагаўся ён
Супраць насілля.

Супраць гора змагаўся
Адважна,
Клікаў волю
Ў свой край неабсяжны...

Пацямнелі,
Як быццам ад ночы,
Васільковыя
Ласчыны вочы.

Залатую касу
Запляла,
Пацішэлых сястрыц
Абняла.

І тады запытала
Ларыса:
– А як хлопчыка клічуць?
– Патрысам.

І ўжо шэпчуцца ціха
Дзяўчынкі...

Ім цяпер
Не да прыкрых учынкаў!

Трэба другу
Пісьмо напісаць,
Падарунак яму
Пераслаць.

І пачула тут госця:
«Патрысік!
Шлём табе мы салодкіх
Ірысак.

І дражэ,
І «падушак» — малышак.
Толькі з'елі мы
Некалькі «мішак».

З падарункам прымі,
Калі ласка,
Нашу светлую
Шчырую Ласку!

Не гаруй,
Мы цябе не забудзем
І пра татку
Раскажам мы людзям.

Будзем дружныя мы
Між сабою

І навек
Пасябруем з табою!..»

* * *

Вось вам, дзеці,
І ўся мая казка
Пра дзяўчынку харошую –
Ласку.

Ласка ўсіх вас
Пабачыць жадала,
Але часу ў яе
Дужа мала.

А таму покуль стрэнецца
З вамі,
Будзьце, дзеці,
Ласкавыя самі!

## *Уладзімір Мазго*

### СВЕТА З ІНТЭРНЭТА

Кожны дзень
суседка Света
не вылазіць
з Інтэрнэта.
Замяняе Інтэрнэт
для Святланы цэлы свет.
Толькі ў свеце
віртуальным
сумна Свеце
без рэальных
і спагадлівых
сяброў,
Без ракі,
Грыбных бароў...
Не заменяць
Цуды веку
Чалавеку –
Чалавека!

## *Пятрусь Макаль*

### ПАКЛІЧ У ГОСЦІ СОНЦА

Калі на сэрцы хмарна,
Калі ў душы зіма,
Не вохкай, дружа, марна
І не ўздыхай дарма.
Не зеляней ад злосці
У смутку і журбе –
Пакліч ты сонца ў госці,
Як друга да сябе.
Насустрач небасхілу
Далоні працягні –
І спусціцца свяціла
У дом твой з вышыні.
Дружы з блакітнай казкай,
Сябрам заўжды ў жыцці
І позіркам, і ласкай
Свяці, свяці, свяці!

## *Алена Масла*

### ЗОРАЧКА

Далёка-далёка ў касмічнай прасторы жыла Зорачка. Была яна такой маленькай, што нават зямляне не маглі разгледзець яе ў свае магутныя тэлескопы. І таму, напэўна, Зорачка сумавала.

«Ах, – думала яна, – шчаслівыя мае сястрыцы. Іх бачаць з далёкіх планет – і яны бачаць далёкія планеты. А я... Што з таго, што я кожны дзень расчэсваю свае залатыя валасы і абнаўляю зіхоткую сукенку? Нікому не патрэбна мая прыгажосць. Сястрыцы кажуць, што я шчаслівая – мне Фея падаравала самае доўгае жыццё. Але навошта яно мне? Каму я патрэбна?.. А яшчэ сястрыцы кажуць, што людзі, якія жывуць на планеце Зямля, захапляюцца хараством зорнага неба. А я нават нікога не парадавала...» – ціха ўздыхала Зорачка.

І вось аднойчы, калі яна так разважала, нехта гукнуў яе. Зорачка азірнулася на голас і ажно заскакала ад радасці, убачыўшы сваю старэйшую сястру.

Прывітаўшыся з госцяй і распытаўшы, як жывуць іх сваячкі, Зорачка папрасіла:

– Сястрыца! Ты так многа ўсяго бачыла, раскажы мне што-небудзь.

– О, я нават не ведаю, з чаго пачаць сваё апавяданне. Памятаеш, я і раней расказвала табе пра Зямлю. Яна мне падабаецца найбольш. Там жывуць вельмі цікавыя істоты – людзі, якія кажуць: «Падае зорка – чакай шчасця...» Ой, – спахапілася раптам яна, – я ж галоўнае забылася! Глядзі не згары ад радасці. Старэйшая Зорка даручыла мне перадаць, што тваё месцазнаходжанне змяняецца: з гэтай пары ты будзеш жыць разам з намі!

– Вось дык сюрпрыз! – і Зорачка стрымгалоў кінулася ўслед за сястрой, хутчэй заспяшалася на новае месца.

Спыніўшыся, усклікнула ад здзіўлення:

– Якая тут прыгажосць! Куды ні глянь, зоркі карагоды водзяць! А вось гэты блакітны шар і ёсць Зямля? Ой, здаецца, я ўжо бачу людзей!..

Захопленая, зачараваная, Зорачка гатова была закрычаць на ўсё неба: «Я шчаслівая, шчаслівая! Я буду доўга жыць!..»

Праходзілі дні за днямі. Не шкадуючы свайго святла, Зорачка разгаралася ўсё ярчэй і ярчэй. Найпрыгажэйшым яе ззянне станавілася тады, калі з дому на планеце Зямля выходзіла дзяўчынка. Задумлівая, з блакітнымі

стужкамі ў косах, яна гадзінамі глядзела на зорнае неба. І Зорачка цягнула да яе свае цудоўныя рукі-промні. Нібы адчуўшы іх дотык, дзяўчынка радасна ўсміхалася.

Але аднойчы вечарам дзяўчынка не выйшла. Не было яе на другі і на трэці дзень. Зорачка кідала заклапочаныя позіркі на Зямлю. І, зазірнуўшы праз акно ў пакой дома, дзе жыла яе маленькая сяброўка, убачыла яе. Толькі што гэта з ёй? Гэта была яна — і не яна...

Задумлівы позірк хаваўся пад цяжкімі павекамі, змучаны тварык пасталеў і асунуўся — дзяўчынка цяжка захварэла.

У адно імгненне Зорачка зразумела ўсё. Век людзей жахліва кароткі. І дзяўчынка можа раней адмеранага — і так кароткага — чалавечага веку пайсці з Зямлі. А яна па-ранейшаму будзе гарэць на небе?

«Ты з нас самая шчаслівая: табе Фея падаравала самае доўгае жыццё... — прамільгнула ў свядомасці. — Людзі кажуць: падае зорка — чакай шчасця...»

— Дзяўчынка, я табе падарую сваё жыццё, табе... — І Зорачка залатой слязінкай скацілася з неба.

А потым доўга-доўга на планеце Зямля выходзіла з дому дзяўчынка і махала рукой Зорачцы, якая для яе так і засталася жывой.

## *Іван Муравейка*

### ШКАДЛІВЫ КАМЕНЬ

На дарозе камень
Нечага ляжыць.
Па дарозе Саня
Некуды бяжыць.

Як ні ў кога, ў Сані
Кемны, пільны зрок:
Ён убачыў камень
І звярнуў убок.

– Буду асцярожным,
Лепей аббягу –
Спатыкнуцца можна
І зламаць нагу.

На дарозе камень
Нечага ляжыць.
Па дарозе Саня
Некуды бяжыць.

Але сёння ў Сані
Прытупіўся зрок:
Не зірнуў на камень,
Не звярнуў ўбок.

Выпадку такога
Той не прапусціў:
Хлапчука за ногі
Нечым падчапіў.

Грымнуўся імгненна,
Прыпыніўся «крос»,
Абабіў калені
І расквасіў нос.

Раззлаваўся Саня:
– Ах ты, лежабок!
І шкадлівы камень
Адкаціў убок.

## ЯБЛЫКІ ДЛЯ СЯСТРЫЧКІ

Захварэла Антошава сястрычка Зіна. Яе і ў дзіцячы садок не павялі. Ляжыць яна ў ложку маркотная, маўклівая. Мама кажа, што Зіна моцна прастудзілася і ў яе тэмпература. Як жа можна прастудзіцца, калі зараз лета і сонейка свеціць горача?

Антоша падышоў да Зінінага ложка і сеў на краёчку.

– Зіна, чаго табе хочацца з'есці?

– Нічога не хочацца, – адказала Зіна. – Хіба салодкі яблык пакаштавала б. Шкада, што нашы яблыні яшчэ зусім маленькія. Не цвілі нават.

Антоша падумаў і кажа:

– Я абавязкова дастану салодкі яблык.

«Дастану. А дзе? Яны ж не валяюцца на дарозе», – разважаў Антоша, калі выйшаў на вуліцу. І адразу павесялеў: яго вочы наткнуліся на суседскі сад. Там не адна, а тры салодкія яблыні. А яблыкаў на іх – аж галлё да самай зямлі нагнулася. «Дзядзька Федар і цётка Ганна нават не заўважаць, калі я два ці тры яблыкі адарву». Гэтая думка Антошу спадабалася. Да таго ж, у плоце ёсць лаз – адна дошчачка адхінаецца. А сабакі ў іх няма. І самога дзядзькі Федара няма. І цёткі Ганны няма. Яны на працы.

Антоша пастаяў трошкі, а потым пралез у сад і асцярожна, нібы баючыся, што яблыня зазвініць, адарваў два ружовашчокія яблыкі. Аднёс іх сястрычцы.

– На, еш. Смачныя.

– Мне хопіць аднаго, – сказала Зіна.

Зіна толькі хацела адкусіць яблык, як у хату ўвайшла мама.

– О, ты ўжо яблык ясі! Значыць, хутка паправішся. А хто табе прынёс яблык?

– Антоша.

– А ты дзе ўзяў?

– Ды я... Ды я... – прамямліў Антоша і апусціў галаву. – Зіначка ж захацела...

— Ты, Зіна, пакуль не еш яблык, — сказала мама. — З'ясі пасля абеду. Добра?

— Добра.

Мама пайшла ў агарод палоць буракі.

— Я дапамагу, — нерашуча прагаварыў Антоша. Ён здагадаўся, на што намякала мама, і думаў, што яна, засмучаная, адмовіцца ад яго дапамогі. Не адмовілася.

— А чаго ж — дапамажы, — згадзілася.

Каб хоць чым-небудзь згладзіць сваю правіннасць, Антоша працаваў старанна, як ніколі.

— Вунь дзядзька Федар з цёткай Ганнай прыйшлі, — паглядзела на Антошу мама. Ён уздыхнуў, абцёр аб штаны рукі і пайшоў у хату.

— Навошта ты забраў яблыкі? — надзьмулася Зіна. — Я зараз буду іх есці.

— Яшчэ нельга есці, — папярэдзіў сястрычку Антоша. — Я хутка вярнуся і, можа, прынясу табе твае яблыкі.

Ніхто ніколі не даведаецца, якая размова адбылася паміж дзядзькам Федарам, цёткай Ганнай і Антошам. Але мама здагадалася, бо яна бачыла, якім вясёлым выбег сынок з суседскай хаты. Ён нёс не два ружовашчокія яблыкі, а поўную шапку.

## **А***лесь Пальчэўскі*

### ДОБРАЕ СЛОВА

У трамвай праз пярэднія дзверы ўваходзіў старэнькі дзядок. Хлопчык убачыў, як цяжка падымацца старому чалавеку з нізкай прыступкі. Ён усхапіўся з лаўкі і падаў руку.

Дзядуля падзякаваў.

– Сядайце, калі ласка, на маё месца, – паказаў хлопчык на лаўку.

– Сядзі-сядзі. Мне недалёка ехаць.

Хлопчык быў настойлівы:

– Ну я вас прашу, дзядуля, сядайце.

Прыйшлося паслухацца. Дзядуля сеў, прыхіліў хлопчыка да сябе і спытаў:

– Як жа цябе зваць?

– Юра.

– Харошае імя, – пахваліў дзядуля.

– Я ў той дзень нарадзіўся, як Юрый Гагарын паляцеў у космас.

– Вунь што. Тады яно двойчы харошае... У якім жа ты класе, хлапчына, вучышся? – зірнуў дзядуля на Юраў партфель.

– У трэцім.

– Малайчына. Старайся, старайся. Я ў твае гады і аднаго класа не скончыў. Толькі

і ўмею распісацца. Ды і то навучыўся, калі мне было дваццаць гадоў.

— Дык вы і казак гэтых не чыталі? — Юра дастаў кніжку з партфеля.

— Не. Казкі расказвала мне маці.

— Ой, дзядуля, колькі цікавага вы не ведаеце! — пашкадаваў хлопчык. — Каб жылі блізка ад нас, я і вам чытаў бы... Таму і маме я кожны вечар чытаю.

Дзядуля ўздыхнуў: у яго свае такія ўнукі ёсць, могуць пачытаць, ды не вельмі дружаць яны з кнігай. Ён паглядзеў у акно і сказаў:

— Ну, мне скора выходзіць. Ты куды — у школу ці са школы едзеш?

— У школу, на другую змену. Мы пераехалі ў новы раён, а трэці клас я канчаю там, дзе жылі раней.

— Настаўнік ці настаўніца вучыць цябе?

— Настаўніца.

— Сядай на маё месца, — устаў дзядуля, — і перадай настаўніцы дзякуй. Скажы — ад дзядулі Сцяпана Міхайлавіча.

— Вы ведаеце нашу Вольгу Пятроўну?! — здзівіўся Юра і сеў на лаўку.

— Не. Але ты перадай ад мяне дзякуй, прашу цябе! — ужо з прыступкі гукнуў дзядуля.

«А за што перадаць дзякуй незнаёмай настаўніцы? — пацiснуў плячамі Юра. — Пры-

вітанне і тое знаёмым толькі перадаюць, а тут — дзякуй...»

Настаўніца ўвайшла ў клас, і Юра перадаў ёй дзядулеву падзяку. Вольга Пятроўна распытала, дзе і калі гэта было, трошкі захвалявалася і падзякавала вучню за прынесенае добрае слова.

А за што ўсё ж дзякаваў дзядуля настаўніцы? Можа, ты ведаеш?

## *Таццяна Сівец*

### ВАНДРОЎКА НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС

– Таня, хутчэй! Колькі можна цябе чакаць?!

Ну як мама не разумее, што нельга спяшацца, калі збіраешся на вуліцу! Гэта ж амаль як вандроўка на Паўночны полюс. Тым больш, калі гэта сапраўды вандроўка на Паўночны полюс! Але мама не ведае, ды і не трэба ёй ведаць: усё пасля прачытае ў газеце, калі Танечка дойдзе. А каб дайсці, трэба добра падрыхтавацца: бутэрброд, запалкі, шалік, шапка... Здаецца, усё.

– Таня, на вуліцы вясна, нашто табе зімовая шапка?!

Дзіўная мама! Зімой яна сварылася, калі Танечка не хацела надзяваць шапку, а цяпер пытаецца «нашто»!

– Здымі! Ты ж у ёй зварышся!

– Не зваруся. Мы з Валем і Кацяй будзем гуляць... у зіму!

– Вось жа свавольнае дзяўчо, – уздыхае мама, але пра шалік ужо нічога не кажа.

Валя і Каця ўжо чакаюць на вуліцы. Сонца па-веснавому прыпякае, так што сябры расчырванеліся і пачалі сварыцца.

– Не хочаш – не ідзі! – крычыць Каця.

– Я не хачу?! Гэта ты не хочаш! – абураецца Валя і глыбей нацягвае на вушы шапку.

– Я хачу!.. А ты... – не пагаджаецца Каця. І Танечка разумее, што калі зараз не спыніць сяброў, то на полюс яны не паспеюць дакладна.

– Так! Мы ўсе хочам ісці. Значыць, сварыцца нельга – забаронена!

– Чаму? – Валя пазірае здзіўлена на Танечку.

– Таму што! Пасварымся, разыдземся, згубімся, і на нас будуць паляваць страшныя пачвары – я ў кіно бачыла, – удакладняе Танечка.

Кацю перспектыва сустрэцца з пачварай сапраўды палохае, і яна першая працягвае Валю руку. Той паціскае, і абое запытальна глядзяць на Танечку. Першая не вытрымлівае Каця:

– Якія пачвары?

– Шасціногія? – з энтузіязмам вопытнага даследчыка пачвараў запытвае Валя.

– Не, здаецца, ног у іх было дзве... – сумняваецца Танечка.

– А вачэй, іклаў?.. – не адступае Валя.

– Не памятаю, я не глядзела далей, вочы заплюшчыла, а потым мама кіно выключыла, але іклы былі – вострыя такія...

— А людзей гэтыя пачвары елі? — Валя вырашыў даведацца пра невядомых монстраў як мага больш. А вось на Каціным твары было напісана жаданне ніколі пра іх не чуць, таму яна рашуча ўзяла Танечку за руку і пацягнула ўбок.

— Ты што? — здзівілася Танечка.

— Я нікуды не іду! — цвёрда заявіла Каця. — І табе не раю.

— Ну, мы ж не будзем сварыцца, і ўсё будзе добра, — пераконвае Танечка.

— А ты абсалютна ўпэўнена, што мы ніколі не пасварымся?

Танечка маўчыць. Валя падыходзіць да іх, на хаду сцягваючы шапку і размотваючы шалік.

— Я тут падумаў... На Паўночны полюс трэба ісці зімой. А то зараз там, напэўна, таксама ўсё растала. А я плаваць не ўмею, — ён крыху вінавата адводзіць вочы.

— Правільна! — радасна падтрымлівае яго Каця. — Лепш давайце караблі пускаць у той вялікай лужыне за домам!

— Ага! Я толькі збегаю пераапрануся і вазьму паперак — у майго бацькі іх цэлая шуфляда. Ён і не заўважыць, — у Валі гарэлі вочы ад прадчування. — Толькі — цур — я капітан!

— Чаму гэта ты? — не пагадзілася Каця. — Я таксама хачу быць капітанам!

– Дзяўчынкі капітанамі не бываюць!

– Бываюць!

– Не!

– Вы што, сварыцеся? – пытаецца Танечка. І Валя з Кацяй адразу змаўкаюць і не глядзяць адна на адну.

– Ладна, будзем па чарзе... – бурчыць Валя. – Толькі мая чарга – першая.

– Добра, – нечакана лагодна пагаджаецца Каця.

Яны бягуць дамоў пераапранацца. Танечка ўсміхаецца: добра, калі сябры не сварацца. І страшная пачвара тут ні пры чым!

## *Даір Слаўковіч*

### ВІНШАВАННЕ

Раней за ўсіх у школу прыйшлі дзяўчынкі. Потым пачалі збірацца хлопчыкі. Аднак дзяжурныя Поля Дзятко і Сіма Валожына з чырвонымі павязкамі на рукавах да дзвярэй другога «В» нікога не падпускалі.

– Што такое? Прэч з дарогі! – бушавалі хлопчыкі.

– Пацярпіце хвілінарку, – супакойвала іх Сіма. – Не хвалюйцеся.

– І доўгая ваша хвілінарка?

– Зусім кароценькая. Зараз пусцім.

Хтосьці з хлопчыкаў паспрабаваў зазірнуць у замочную шчыліну. Поля і Сіма адагналі цікаўнага.

– Можна, ужо можна, – пачуўся з-за дзвярэй голас Зіны Зязюлінай, ці Зязюлькі, як яе звалі ў класе. – Калі ласка, заходзьце, хлопчыкі!

Глядзяць хлопчыкі на Зязюльку, дзівяцца: заўсёды задзірыстая, ніколі нікому з хлопчыкаў не перапусціць, а сёння – што з ёю сталася? Ветлівая. Усміхаецца, ззяе ўся: ад новых боцікаў на нагах да ружовых банцікаў у косках. Ну і Зіна, ну і Зязюлька!

Зіна саступіла ў бок ад дзвярэй і сказала:

— Хлопчыкі! Дзяўчынкі нашага класа віншуюць вас з мужчынскім святам.

— Вось яно што! — ахае нехта.

— Ура! — закрычаў Саша Кірэц, узняўшы ўгору партфель.

На партах, дзе звычайна сядзелі хлопчыкі, ляжалі загорнутыя ў цэлафан і перавязаныя стужкамі пакуначкі.

Хвіліна — і зашамацела, паляцела на падлогу абгортка. На партах стаялі дванаццаць завадных браневічкоў. І дванаццаць арганчыкаў — гэтулькі, колькі хлопчыкаў у класе.

— Ура-а-а! — крыкнулі хорам шчаслівыя гаспадары падарункаў. У гэтым хоры патанулі просьбы Полі Дзятко і Сімы Валожынай, каб пазбіралі з падлогі паперу ад упакоўкі.

Тут празвінеў званок. У клас увайшла Клаўдзія Іванаўна, павіталася, спытала, што новага.

Дванаццаць пар нецярплівых рук выцягнулі з-пад вечкаў парт заведзеныя браневічкі. Секунда — і дванаццаць машын са скрыгатам папаўзлі па праходзе між парт да стала, да дошкі.

Стаіць Клаўдзія Іванаўна, а ля яе, як на парадзе, праходзяць браневікі. Толькі маленькія.

Скончыўся завод. Два браневікі заціхлі ў кутку, некалькі спыніліся ля акна, а ўсе астат-

нія ля дошкі. Настаўніца ўзняла вочы. На дошцы было напісана: «Віншуем нашых хлопчыкаў, будучых салдат, з мужчынскім святам!» І подпіс: «Дзяўчынкі».

— Я таксама далучаюся да віншавання дзяўчынак, — сказала Клаўдзія Іванаўна. — Але ж нашай Арміі патрэбны не абы-якія салдаты, а адукаваныя. Таму не будзем марнаваць часу. Разгарніце вашы чытанкі...

Раптам здарылася незвычайнае. Сярод шамацення кніжных старонак пачулася мелодыя. Яна нарадзілася пад адной з парт. «Ці-та-та-та-та!» «Эх ты, Юрачка!»

— У нас не ўрок спеваў, — сказала Клаўдзія Іванаўна. — Здайце музычны інструмент.

«Эх ты, Юрачка!» — пачулася ў другім канцы класа.

З-за парты ўстала Зіна Зязюліна.

— Клаўдзія Іванаўна, — Зязюлька закінула назад коску з ружовым бантам, — хлопчыкі невінаватыя. Гэта мы ім падарылі арганчыкі ды браневічкі. Не забірайце, калі ласка. І... не выклікайце сёння ні Сашу Кірца, ні Васю Гладкага — нікога з хлопчыкаў. А толькі нас, дзяўчынак.

— Сядай, Зіна. Я цябе выслухала, зразумела. Цяпер мяне паслухайце. Атрымаць у мужчынскае свята добрую ці выдатную адзнаку — гонар для любога будучага салдата. А дрэн-

ную – ганьба. Але дрэнных адзнак я ім сёння ставіць не буду. Хіба каторы сам мяне аб гэтым сігналам папросіць.

– Сігналам?

– Якім сігналам?

– Як пачую «Юрачку», здагадаюся: ёсць чалавек, якому неабходна двойка.

Урок чытання пайшоў сваім ходам. А на матэматыцы...

Да дошкі выклікалі Зіну Зязюліну. Клаўдзія Іванаўна прачытала задачку. Тут і «закукавала» Зязюлька. Стаіць каля дошкі, крэйду з рукі ў руку перакладае, уся перапэцкалася, а рашыць ніяк не можа.

Клаўдзія Іванаўна пачала выклікаць іншых. Задачу разабралі па костачках, а Зіна гэтак разгубілася, што ўжо і таго не разумее, што спачатку ведала.

– Садзіся, Зязюліна. Вымушана паставіць табе двойку.

Толькі Клаўдзія Іванаўна ўзялася за ручку, як пачуўся спеў арганчыка і з-за парты ўстаў Саша Кірэц.

– Кірэц, што з табою? – нахмурылася настаўніца. – Ці пра ўгавор забыўся?

– Не, Клаўдзія Іванаўна, не забыўся. Сігнал падаю. Стаўце мне Зязюлькіну двойку.

З-за парт усталі яшчэ адзінаццаць хлопчыкаў. Заігралі ў класе арганчыкі. На поўную

моц заігралі. Усе дванаццаць. Глядзіць Клаўдзія Іванаўна, твар сярдзіты. І раптам усміхнулася.

— Добра, рыцары, — сказала яна. — Няхай будзе па-вашаму. Не пастаўлю Зязюлінай дрэнную адзнаку. А вам, абаронцам, двойкі ўсё ж уляплю... Заўтра. Калі яна задачы гэтай ведаць не будзе.

Арганчыкі дружна заспявалі яшчэ раз і сціхлі.

## СЕЛЯДЦЫ НА ГРАДЗЕ

Юрка хадзіў у краму па селядцы. І Паўлік за кампанію: сябар жа.

Вярнуліся — мамы няма дома. Юрка паклаў пакупку на стол. Адрэзаў кавалак селядца, лусту хлеба і ўплятае за абедзве шчакі.

У Паўліка повен рот сліны набегла. Пракаўтнуў, адвярнуўся.

Выйшлі гуляць на двор.

— Ведаеш што, — раптам сказаў Паўлік, — давай селядзец пасадзім. На клумбе. Паглядзіш, які вырасце!

— Гы-гы-гы! Дзе гэта было, каб рыбіны ў зямлі раслі?

— То рыбіны. Яны не салёныя. А селядцы растуць. Хіба ты чуў, каб рыба салёная ў рацэ плавала?

Юрка такога не чуў, але стаяў на сваім:

– Усё роўна не веру.

– Ну і не трэба! Мая цётка ніколі селядцоў не купляе. Сама вырошчвае іх, як бульбу. У яе цэлы агарод такога дабра. А ты... ты – варона недаверлівая!

Хацеў Юрка сказаць сябру што-небудзь абразлівае ў адказ, але перадумаў: пасварышся, а гуляць з кім? Паблізу больш таварышаў няма. І хто ведае: мо праўда, што селядцы можна вырошчваць? Вось бы мама ўзрадавалася!

– Добра. Пасадзім хвосцік.

– Не, – запярэчыў Паўлік, – цэлы трэба. Калі хочаш, каб корч селядцоў вымахаў, не шкадуй аднаго пасадзіць.

Юрка прыкінуў: ад маці, вядома, пападзе. Спачатку. Затое потым...

– Я пайшоў, – насупіўся Паўлік. – Ты, відаць, сёння не выспаўся.

– Чакай. Як твая цётка садзіць: загортвае ў паперу ці не?

– Лепш у паперы. Будуць спакаванымі расці.

Юрка прынёс з дому селядца. Зрабілі на клумбе ямку, паклалі ў яе селядзец, прысыпалі зямлёй. Юрка пабег палівачку шукаць, бо «расаду» ж паліць трэба.

Вярнуўся, а сябра няма.

Юрка старанна паліў сваю пасадку і прысеў адпачыць. А хвілін праз колькі Паўлік зноў з'явіўся.

– Ну, не ўзыходзяць? – пытаецца. А ў самога губы блішчаць, нібы тлушчам памазаныя.

– Хіба пара ўжо?

– Зараз пабачым, – ён памацаў зямлю на клумбе. – Палівау?

– Ага.

– Малавата. Яшчэ трэба крыху.

Юрка пабег па ваду.

Паўлік азірнуўся, дастаў з кішэні пакунак, уторкнуў у зямлю, паперку зверху прадраў.

Вярнуўся Юрка з вадою. Глянуў – аж дух заняло.

– Узыходзяць?!

– А ты думаў! Бачыш, галава з вокам паказаліся.

Юрка запляскаў у далоні.

– Гатунак добры трапіўся... – сказаў Паўлік і дадаў: – Я пайду. А ты пакуль што парастак не чапай. Кволы ён.

Паўлік пайшоў, а Юрка вырашыў асцярожна падматычыць «расаду». Толькі крануў зямлю, як «расада» нахілілася набок, паперка разгарнулася, і з яе... выпала адрэзаная нажом галоўка селядца.

«Агароднік» здзіўлена пазіраў на «расаду». Нарэшце схапіў тое, што засталося ад селяд-

ца, шпурнуў у бок Паўлікавага двара і пайшоў дадому.

Давялося расказаць пра ўсё маці.

Мінула некалькі дзён. Ніхто не ўспамінаў пра гэтае здарэнне.

Неяк Юрка выйшаў на двор з лустай хлеба і кавалкам селядца.

Тут якраз Паўлік завітаў. Юрка разламаў лусту на дзве роўныя часткі, падзяліў селядзец і працягнуў сябру.

Паўлік пачырванеў як памідор.

– Я... я не думаў, што ты паверыш, – збянтэжана вымавіў ён. – Вось грошы. Мама на марожанае дала. Пойдзем і купім селядзец.

– Навошта, – усміхнуўся Юрка. – Лепш усё-такі купіць марожанае. Напалам з'ядзім, добра?

## *Мікола Янчанка*

### АДВЕДАЛІ

Любяць хлопцы дзядзьку Васіля. За тое, што заўсёды вітаецца і размаўляе з імі, як з дарослымі, што справамі іх цікавіцца. І хлопцы рады сустрэчы з дзядзькам. Хоць той спачатку і пакепліваў з іх. Сустрэў аднойчы Янку з Антосем і ну іх дакараць:

– Вы навошта ў майго верабейкі пёрка вырвалі?

– Гэта не мы, – пачаў апраўдвацца Янка.

– Чэснае піянерскае! – пакляўся Антось, хоць хадзіў яшчэ ў дзіцячы садок і, вядома, не насіў піянерскага гальштука.

– Як не вы? – усміхнуўся дзядзька. – Хто бегае хутчэй за ўсіх хлапчукоў нашага двара? Значыць, і майго верабейку вы дагналі і пёрка ў яго вырвалі.

І сапраўды, бегаюць яны хутчэй за ўсіх. Таму ціхі Янка хацеў нават папрасіць прабачэння і паабяцаць дзядзьку Васілю не вырываць пёрак у яго вераб'ёў. Ды Антось выручыў:

– Як жа мы дагонім таго вераб'я? У нас жа крыльцаў няма!

– Няўжо няма? – усумніўся дзядзька.

— Няма! — узрадаваўся Янка. — Во, рукі ў нас!

— Тады не вы, — згадзіўся дзядзька Васіль. — Даруйце! Даруйце, хлопцы.

Вось якія размовы былі! Цяпер дзядзька Васіль з іх не смяецца. А, сустрэўшы, вітаецца і пытае з усмешкай:

— Ну як жыццё маладое?

— Нішто сабе, — апускае галаву Янка.

— Добрае! — весела адказвае бойкі Антось.

А нядаўна дзядзька Васіль нават папрасіў хлопцаў дапамагчы яму:

— Я без вас як без рук, хлопцы. Дрэўцы не магу пасадзіць.

— Добра, — кажа Антось, — выручым.

І пайшлі, выручылі. Янка дрэўцы прытрымліваў, пакуль дзядзька Васіль прысыпаў камельчыкі зямлёю. Антось ваду маленькім вядзерцам насіў ды паліваў саджанцы.

І на забавы таксама запрашае хлопцаў дзядзька. У мінулую суботу сонечны дзянёк выдаўся.

— Гайда на рэчку! — кажа дзядзька. — На сонцы пазагараем. А мо і пакупаемся.

— Гайда! — узрадаваліся хлопцы. І пайшлі побач з дзядзькам.

Ішлі, бы вялікія. Як і ён, рукамі размахвалі. Пад крок яго падладжваліся. Прыйшлі да ракі. На сугрэве зацішнае месца выбралі. Скінулі кашулі і загараць пачалі. Пазагаралі — і да рэчкі. Але дзядзька спыніў іх:

– Відаць, купацца яшчэ ранавата. Я, як старэйшы, паспрабую.

І паспрабаваў. Толькі адразу ж з вады выскачыў:

– Халодная! – сказаў ён. – Але праз тыдзень можна будзе і купацца.

Праз тыдзень яны з самай раніцы стаялі ля чацвёртага пад'езда. Дзядзьку Васіля чакалі. Каб наконт прагулкі дамовіцца. Але хутка даведаліся, што дзядзька Васіль хворы.

– Напэўна, той раз прастудзіўся, – здагадаўся Янка.

– Праз нас цяпер чалавек пакутуе, – падтрымаў яго Антось і нечакана прапанаваў: – Зойдзем!

Зайшлі. Ляжыць дзядзька Васіль. Але, убачыўшы хлопцаў, павесялеў:

– Як жыццё маладое?

– Добра! – усклікнулі хлопцы.

– А я от злёг, – паскардзіўся дзядзька. – У горле дзярэ, і кашаль забівае.

Затым ён з цікавасцю слухаў навіны двара і дзіцячага садзіка, пахваліў свісткі, якія хлопцам куплялі.

– Пасвішчыце, мне не шкада, – прапанаваў Антось.

– Лепей вы, хлопцы. А то я закашляюся, – сказаў дзядзька.

Хлопцы і ну старацца. Так засвісталі, што цётка Аліна з кухні прыбегла:

— Што за гармідар?!

— Ніякага гармідару, — супакоіў яе дзядзька. — Проста сябры адведаць мяне прыйшлі.

— Гэта добра! — сказала цётка Аліна. — Бач, і табе лепей стала.

А дзядзьку Васілю сапраўды лепей стала. Ён ад душы засмяяўся, скінуў коўдру і прысеў на ложку. Затым пайшоў на кухню і прынёс хлопцам па цукерцы. На развітанне ж паабяцаў у наступную нядзелю пакатаць іх на лодцы.

— Куды гэта вы збеглі? — накінулася на хлопцаў маці Антося.

— Дзядзьку Васіля адведалі! — у адзін голас адказалі хлопцы і як доказ цукеркі паказалі. — Во!

## Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае

*Эдзі Агняцвет*

### БУДЗЬ ВЕРНЫМ, ДОБРЫМ СЫНАМ!

Раней за ўсіх яна ўстае,
Пазней за ўсіх кладзецца.
Яна жыве, яна пяе –
І дзецям лепш пяецца.

Ты рос, як цёплы каласок,
Пры месяцы і зорах
Пачуеш мілае «сынок»,
Хоць будзе і за сорак...

За словам «маці» ў свет пайшлі
Маленства, мара, мова.
І мір, і мужнасць на Зямлі –
Жыцця твайго асновы.

Каб не тужыла па начах, –
Ей падрастай на ўцеху!

Хай будзе ў матчыных вачах
Пабольш іскрынак смеху!

Ты не шкадуй ласкавых слоў
Для роднай, для адзінай.
Адказвай маці на любоў –
Будзь верным, добрым сынам!

## *Лідзія Арабей*

### МАМА

Паўлік жыў у дзіцячым доме. А дзіцячы дом — гэта такі дом, дзе жывуць дзеці, якія не маюць ні мамы, ні таты. Чаму ў Паўліка не было ні мамы, ні таты, ён не ведаў. Яму здавалася, што ён нарадзіўся і жыў у дзіцячым доме ўсё сваё жыццё. Паўліку тут было някепска. Меў шмат сяброў, у сталоўцы смачна кармілі, выдавалі новыя кашулькі, куртачкі, чаравікі. Але нечага яму не хапала. Не хапала, мусіць, таго таемнага, невядомага, што называлася словам «мама». Некаторыя дзеці называлі мамаю выхавацельніцу Людмілу Іванаўну. Калі яна з'яўлялася сярод іх, кожны хацеў дакрануцца да яе рукі. І Паўлік не раз спрабаваў падлашчыцца да Людмілы Іванаўны, але не мог праціснуцца, так шчыльна абступалі яе дзеці. Праўда, ён ведаў, што Людміла Іванаўна несапраўдная мама: не можа быць адна мама на ўсіх дзяцей, у кожнага хлопчыка і дзяўчынкі павінна быць свая мама.

Аднойчы ён падышоў да Каці, у якой нядаўна яшчэ была мама, і спытаў:

— А хто гэта — мама? Якая яна?

Каця схіліла на бок галоўку, задумалася. Пакруціла далонькаю.

– Мама... Ну, гэта самая прыгожая... І самая добрая... Яна ўсіх любіць...

– А дзе мая мама? – спытаў Паўлік. Каця зноў задумалася.

– Хто ж ведае... Можа, ходзіць дзе па вуліцы...

На тым размова і скончылася. А Паўлік задумаўся: «Калі мая мама недзе ходзіць па вуліцы, то, пэўна, яе можна знайсці?» І аднаго дня, калі ўсе дзеці пайшлі ў двор гуляць, знайшоў шчыліну ў агароджы і пралез на вуліцу.

Па вуліцы ішло шмат людзей – цёці, дзядзі. Паўлік хацеў знайсці сярод цёцяў самую прыгожую, але ўсе яны так хутка прабягалі, што ён не паспяваў разгледзець. Непадалёку быў сквер. На лавачках сядзелі людзі. Там было куды спакайней, чым на вуліцы, і Паўлік збочыў у сквер.

Тут таксама хадзілі, сядзелі на лавачках цёці. У скверы іх лягчэй было разгледзець. На адной лавачцы сядзела цёця і вязала нешта пруткамі. На каленях у яе ляжаў вялікі клубок сініх нітак. Цёця здалася Паўліку прыгожаю. Ён нясмела падышоў да яе і спытаў:

– Цёця, можа, вы мая мама?

Цёця перастала варушыць пруткамі і здзіўлена паглядзела на Паўліка:

– А ты што, згубіў сваю маму?

– Не, я не губляў яе. У мяне зусім няма мамы.

– Сіротка, значыць, – сказала цёця. – Але ты, хлопчык, памыліўся. Я не твая мама, – і зноў пачала варушыць пруткамі.

А Паўлік падумаў, што не такая ўжо гэтая цёця і прыгожая. Ён і праўда памыліўся. І пайшоў далей па алейцы. Мінуў некалькі лавачак, на якіх сядзелі цёці з дзецьмі, але ніводная з іх не здалася яму такою, каб аказацца яго мамаю.

Каля адной лавачкі Паўлік зноў запыніўся. Тут сядзелі цёця з дзядзем. Цёця абдымала дзядзю за шыю. Значыцца, яна яго любіць. А Каця сказала, што мама добрая, што яна ўсіх любіць. І была гэтая цёця прыгожая. Паўлік пастаяў крыху ўбаку, потым адважыўся і нясмела падышоў.

– Цёця, вы мая мама? – спытаў ён.

Цёця спалохана зірнула на яго:

– Гэта ты ў мяне пытаешся, хлопчык?

– У вас, – ветліва адказаў Паўлік.

– Ты што! Якая я табе мама, – цёця, здаецца, нават зазлавала. – Пойдзем, – сказала яна дзядзю.

Калі цёця паднялася, то аказалася такой высокаю, што Паўлік зразумеў – такая не магла быць яго мамаю. Ён засумаваў. Аказва-

ецца, не так проста знайсці маму. Можа, яна ходзіць не там, дзе ён шукае? Хлопчык цяжка ўздыхнуў. Ён ужо не спадзяваўся на ўдачу. Ішоў па алейцы, не вельмі і прыглядаючыся да цёцяў. Але адна зноў кінулася яму ў вочы. На лавачцы сядзела цёця ў белым капялюшыку і чытала кнігу. Паўлік аглядзеў яе з аднаго боку, з другога некалькі хвілін, падышоў да яе.

— Цёця, — нясмела загаварыў ён, — можа, вы мая мама?

Цёця апусціла кнігу, глянула на Паўліка.

— А як цябе зваць? — спытала яна.

— Паўлік.

— А колькі табе гадоў?

— Пяць...

— А дзе ты жывеш?

— У дзіцячым доме...

Цёця ласкава пагладзіла яго па галаве.

— Трэба падумаць, успомніць, можа, я і праўда твая мама...

Яна ўзяла Паўліка за руку і павяла ў дзіцячы дом. Потым доўга нешта гаварыла з Людмілай Іванаўнай. А праз нейкі час прыйшла ў дзіцячы дом з дзядзем і сказала Паўліку:

— Я — твая мама, а гэта — твой тата. Збірайся, сынок, пойдзем дадому.

Так Паўлік знайшоў сваю маму. Нездарма людзі кажуць: «Хто шукае, той знаходзіць».

# СТРАЛЕЦ І РЫБАК

*Беларуская народная казка*
*ў апрацоўцы Алеся Якімовіча*

Былі ў бацькі два сыны. Выраслі яны, як дубы, а бацьку ўсё няма палёгкі.

Большы, праўда, стаpанны быў хлопец, ды вось бяда: змалку ўсё розныя пасткі майстраваў, а як падрос, дык дастаў сабе стрэльбу і не разлучаецца з ёю. Людзі на работу ідуць, а ён стрэльбу на плячо ды шмыг у лес ці на балота. Цягаецца ўвесь дзень, дахаты ж з пустымі рукамі ідзе, галодны як воўк. Топча лапці, а прыбытку ніякага. Калі ж часам і ўпалюе якое зайчаня, дык хутчэй нясе пану, каб той даў пораху.

Перш сварыўся на яго бацька, потым бачыць — нічога не парадзіш, калі ў сына такая ахвота.

А меншы сын такі гультай удаўся, што хоць ты яго з хаты гані. Дзень і ноч сядзіць з вудаю на рэчцы, за гаспадарку ж ані не бярэцца. Наловіць жменю печкуроў ці яршоў — якая ад іх карысць? Кату паласавацца.

Пачаў і на яго бацька сварыцца, што толькі час марна траціць. Але і меншы сын не слухае бацькі, бо, вядома, ахвота горш няволі.

А каб апраўдацца перад бацькам, што з пустымі рукамі прыходзяць, выдумляюць сыны розныя прычыны.

Стралец расказвае:

— Сёння з самага ранку натрапіў я на чараду коз. Была там каза з казлянятамі ды стары казёл барадаты. Але толькі я злажыўся, каб стрэліць, ажно ў казла, ліха на яго, у ноздрах восы заказыталі. Ён як чмыхнуў, дык цэлы рой восаў вылецеў з ноздраў. Давай тыя восы казу з казлянятамі кусаць... Ну, яны і пасмалілі, як шалёныя, у гушчар. Я за імі. Выскачыў на палянку, а там стаіць на задніх лапах вялізны, як вол, мядзведзь. Чмыхае мядзведзь носам ды абараняецца пярэднімі лапамі ад чмялёў. Ну, думаю, гэта, відаць, толькі што выйшаў з яго чмяліны рой. У такі час мядзведзі вельмі злосныя. Пабаяўся я страляць у яго, а хутчэй скокнуў на елку. Дык вось і сядзеў там, на елцы, увесь дзень, пакуль мядзведзь не пайшоў...

Рыбак расказвае:

— Сяджу гэта я на беразе, цікую за паплаўком. Раптам нейкі шчупачышча цоп за кручок — і на дно! Я за вудзільна, цягну, ажно жылы ў мяне трашчаць. Давалок да берага, а шчупак віль хвастом — і будзь здароў... Бадай цябе! Закінуў другі раз вуду. Зноў той шчупачышча-дурнішча папаўся. Падцягнуў яго да

берага, хацеў рукамі ўхапіць, ды не ўтрымаўся і — шабулдых у ваду!.. Насілу жывы выкарабкаўся.

Слухае іх бацька і толькі галавою ківае:

— Праўду людзі кажуць, што ў стральца дым густы ды абед пусты, а рыбак, як намочыцца, дык і рыбы яму не захочацца.

Думаў, думаў бацька, як яму адвучыць сыноў ад благой прывычкі, ды нічога не можа прыдумаць.

Аднойчы зайшоў да яго стары жабрак і папрасіўся нанач. Разгаварыўся бацька з жабраком, на сыноў паскардзіўся.

— Выгадаваў, — кажа, — дзяцей, а падмогі на старасць ніякай. Бо вядома: стралец страляе, а гаспадарка гуляе!

Выслухаў жабрак бацькаву скаргу і параіў, што яму зрабіць, каб прывучыць сыноў да гаспадаркі. Назаўтра бацька кажа сынам:

— Вось што, сынкі, ёсць у мяне адна далёкая радня. Пайду я да яе. А вы сабе жывіце як хочаце.

Сабраўся і пайшоў.

Засталіся сыны гаспадарамі. Доўга яны гаспадарылі ці нядоўга, але хутка дажыліся так, што няма чаго, як кажуць, і на зуб палажыць. Пачалі браты спрачацца, хто вінаваты. Спрачаліся, спрачаліся, а да праўды так і не дайшлі.

Толькі вось праз нейкі час зноў завітаў да іх той жабрак. Ну, вядома, трэба накарміць чалавека, а ў братоў ні кавалка хлеба.

Стралец дакарае рыбака:

– Няхай бы ты хоць якую рыбіну злавіў, каб было чым чужога чалавека прыняць.

Рыбак адказвае стральцу:

– Няхай бы ты хоць якое казляня падстрэліў...

Паслухаў іх жабрак і кажа:

– Дзякую вам, хлопчыкі, за клопат. Ёсць у мяне хлеб, што добрыя людзі далі.

Дастаў ён з торбы хлеб, сала і пачаў частаваць стральца і рыбака. Сорамна ім прымаць пачастунак ад беднага жабрака, ды голад не цётка.

Накінуліся браты на жабракову торбу і як бачыш усю апрасталі.

– Чаму вы такія бедныя? – пытаецца ў іх жабрак. – Хіба ў вас няшчасце якое, ці што?

Браты цяжка ўздыхнулі:

– Зусім, дзядуля, прапала наша гаспадарка...

– А як жа вы раней жылі?

– Бацька гаспадарыў, дык хлеб і вёўся.

– А што ваш бацька: малады ці стары?

– Ды зусім ужо стары.

– Вось бачыце, – кажа жабрак, – ён стары ды гаспадаркаю карміўся сам і вас кар-

міў. А вы маладыя, дужыя і без хлеба галееце...

Брыдка стала братам, радзей пачалі яны са стрэльбай ды вудай цягацца, а больш гаспадаркай займацца.

Мінуў год-другі, і зажылі яны як трэба.

Тым часам вярнуўся бацька з гасцей. Паглядзеў: гаспадарка як мае быць!

Зарадаваўся ён і кажа:

– Вось цяпер я магу спакойна і паміраць, бо бачу, што вы розуму набраліся: ловіце, страляеце і гаспадарку даглядаеце.

## *Тамара Бунта*

# ДАЛОНЬКІ З ПУШЫНКАМІ

Уладзік зайшоў на кухню і моўчкі сеў за стол. На кухні смачна пахла: бабуля пякла блінкі. Але Уладзік незадаволена нахмурыў бровы.

– Хочаш блінок? – спытала бабуля. – Для цябе пяку!

Яна стаяла каля пліты і не бачыла, што ўнук хмурыцца.

– Не хачу! – незадаволена адказаў Уладзік.

Бабуля зняла з патэльні апошні блінок і падышла да ўнука. Яна ласкава пагладзіла яго па галоўцы.

– Не трэба! – зноў незадаволена сказаў Уладзік і, матлянуўшы галавой, скінуў бабуліну руку.

– Чаму ж не трэба?.. – сказала бабуля ўсміхаючыся. – Я ж цябе люблю...

Яна села побач на крэсла.

– Ну, што здарылася?

«Што здарылася, што здарылася?!. – сярдзіта падумаў Уладзік. – Нічога не здарылася!» І праўда: нічога не здарылася. Яму проста стала сумна. Нядаўна ён хварэў, і таму пакуль сядзіць дома. Вось яму і сумна.

— А ты мяне любіш? — раптам спытала бабуля.

Уладзік, насупіўшыся, упарта маўчаў.

— Пагладзь мяне па руцэ, — папрасіла бабуля і паклала сваю руку на стол. — Калі ласка...

Уладзік сціснуў рукі ў кулачкі і схаваў іх за спінай.

— А, разумею... У цябе на далоньках, мусіць, выраслі злыя калючкі, і ты баішся мяне падрапаць? — сказала бабуля.

— Няма ў мяне ніякіх калючак! — запярэчыў Уладзік. Але неяк не надта ўпэўнена запярэчыў.

— Давай праверым! — прапанавала бабуля. — Ану, пакажы свае далонькі!

Уладзік трохі павагаўся, але ўсё ж такі дастаў рукі з-за спіны і расціснуў кулачкі. Яму і самому хацелася паглядзець, ці не выраслі на яго далонях калючкі ад таго, што ён чамусьці сярдуе на бабулю.

— Ура! — узрадавалася бабуля. — Аніякіх злых калючак у цябе няма, і ты можаш смела пагладзіць мяне па руцэ!

Яна сама ўзяла руку Уладзіка і правяла ёю па сваёй.

— Ды ў цябе далонькі не з калючкамі, а з пушынкамі! — усклікнула бабуля.

— І пушынак аніякіх у мяне няма! — сказаў Уладзік, але ўжо зусім не сярдзіта.

— Як гэта няма? — здзіўлена спытала бабуля. — А чаму ж тады твае далонькі такія пяшчотныя і ласкавыя?

Уладзік памаўчаў, а потым сказаў:

— Таму што я таксама цябе люблю.

## *Алена Васілевіч*

### МАЯ ГАСПАДАРКА

Раніцай бабуля наліла мне шклянку малака — запіць снеданне — і сказала:

— Канчай, унучак, есці, ды бярэмся за гаспадарку. Твае дзядзька і цётка напрацаваліся ўжо недзе ў полі, пакуль ты спаў.

— За якую гаспадарку? — не зразумеў я.

— А я табе раскажу.

Ну што ж, за гаспадарку дык за гаспадарку. У нас у горадзе ніякай гаспадаркі няма. А калі ў бабулі яна ёсць — буду дапамагаць. Так мне і мама дома сказала: «Глядзі, Вова, дапамагай бабулі. Яна старэнькая».

Бабуля і кажа:

— Пайдзі, унучак, зірні, куды гэта падзеліся нашы падушачкі.

— Добра, бабуля, зараз!

Я ўсхапіўся з-за стала і хуценька пабег у «новую» хату — так называлі чысты і заўсёды прыбраны пакой, дзе мы з бабуляй спалі. Там усё было ў парадку: ложкі засланы, а падушкі, узбітыя бабулінымі рукамі, узнімаліся ледзь не да столі. Маленькія падушачкі-думкі таксама ляжалі на месцы...

— Бабуля, яны ляжаць на ложках! — Мне нават дзіўна было з бабулінага загаду: сапраўды, куды ж ім дзецца — гэтым яе падушачкам?

— А дзіцятка ты маё! — пляснула рукамі бабуля і аж затрэслася ўся ад смеху. — А я думаю, чаго гэта ён у тую хату пабег, а ён падушак глядзець...

— Ты ж сама загадала мне, — пакрыўдзіўся я, не разумеючы, што магло так рассмяшыць бабулю.

— Дурненькі, гэта ж я сказала, каб ты пайшоў паглядзеў, дзе нашы гусяняткі ходзяць.

— Гусяняткі?.. А ты ж сказала: «Ідзі паглядзі падушачкі...»

— А з чаго ж падушачкі робяць?

— З чаго? Не з гусянят жа!..

— Ды пэўна ж — не з гусянят... — зноў засмяялася бабуля.

І растлумачыла мне, што падушкі робяць з пер'я і пуху, а пух і пер'е расце на гусях. А гусі вырастаюць з гусянят. Вось і выходзіць, што гусяняткі і сапраўды маленькія падушачкі...

Я ўсё зразумеў і другі раз ужо не ашукаўся б.

Пад вечар, як спала гарачыня, я ўзяў пужку — яе мне звіў з канапель дзед Васіль — і пагнаў на выган бабуліных свіней: старую рабую і двух чорных вепручкоў. Стаю сабе

ля плота і свішчу пужкай у паветры: ж-жык! ж-жык! Цвіце жоўты, як сонейка, адуванчык — я па ім ж-жык! Паўзе па дарозе чорны бліскучы жук — я і яго ж-жык! Толькі адвярнуўся — аднекуль прыляцеў і кружыцца белы матылёк. Я і на яго замахнуўся — ж-жык! Але матылёк замахаў крыльцамі і паляцеў у жыта.

А я ўсё ж-жык і ж-жык у паветры!

Раптам чую, крычыць з поля цераз дарогу бабуліна суседка, цётка Ігналіха, — яна там буракі палола.

— Вова! Што ты там робіш? Паглядзі, дзе тваё сала ходзіць!

Глянуў я навокал: ляжыць мая торбачка з хлебам і салам, як і ляжала.

— Нідзе яно не ходзіць, — крычу ў адказ. — Ляжыць каля мяне.

— Ляжыць каля цябе?! А ты паглядзі добра, што твае свінні робяць?

Я азірнуўся яшчэ раз. Сапраўды, свіней на выгане не было. Куды ж яны маглі падзецца? І раптам убачыў іх. Яны рылі лычамі бульбу за плотам. Я кінуўся выганяць свіней, а цётка Ігналіха стаяла са жменяй зелля ў руках і адчытвала мяне.

— Бач ты яго! Знайшоў сабе занятак з пугай. Глядзеў бы лепей свіней, калі прыгнаў пасвіць.

— А вы ж казалі — сала... — запярэчыў я і тут жа здагадаўся: дык сала — гэта ж тыя самыя свінні! Усё роўна як і падушачкі... Усё тут наадварот завецца, усё не так, як у нас дома, у горадзе...

А то аднойчы мы з дзедам Васілём вазілі ў калгасе снапы. Дзед пасадзіў мяне на воз, сам ідзе збоку, канём кіруе. А насустрач нам старшыня калгаса.

— Што гэта ты, — кажа, — Вова, на хлебе едзеш?

А я адказваю:

— Я не на хлебе, я на снапах сяджу.

Ён засмяяўся і гаворыць дзеду:

— Вось, адразу відаць, горад! Вучы яго, дзед, як хлеб расце, вучы!

Усё вучы ды вучы — быццам я і сам не вучуся і нічога не разумею. Паказала мне бабуля, як прапалоць граду, дзе расла морква, дык я так чыста выпалаў, што ніводнай зялінкі не засталося... І вучыць не трэба было.

Або скажа мне бабуля: «Ідзі, Вова, стрэнь наша малачко. Яно ўжо недзе за рэчкай — ідзе дадому». Значыць, трэба ўзяць лусту хлеба ці жменю бурачнага лісту і ісці сустракаць нашу карову Белку. Яна так у бабулі прывучана: стрэнь чым-небудзь, а то міне двор і пойдзе па ўсёй вёсцы... Калі ж Белка не пры-

ходзіць дадому, бабуля злуецца і крычыць: «Ото ж удалося малачко!»

Але мяне ўжо тут не ашукаеш! Малако, значыць, карова! А карова, значыць, малако!

Я сваю гаспадарку ўжо добра ведаю!

## ВЕРНІСАЖ

Цэлы тыдзень мы з сястрой спрачаліся, сварыліся і некалькі разоў нават добра пабіліся. Мы вырашалі, які падарунак лепей зрабіць маме ў дзень Восьмага сакавіка.

Сястра сказала:

– Я вышыю маме сурвэтку. Коцік хлебча з талеркі малако.

Ох! Коцік хлебча малако!.. На сурвэтцы. А потым гэтая сурвэтка будзе ляжаць на хлебніцы. І з хлебніцы трэба будзе браць і есці хлеб!.. Большай недарэчнасці нельга было прыдумаць.

– Ну, ведаеш, я з тваім коцікам есці хлеб з адной хлебніцы не збіраюся! – абурыўся я.

– А хіба я збіраюся табе яго дарыць? – укалола мяне сястра.

– Не мне, дык маме. Усё роўна.

– А вось і не ўсё роўна. Мама любіць усякія мае падарункі. І не твая справа, што захачу, тое і падарую!

Гэтай упартасці не магла прабіць ужо нават сетка (звычайная капронавая сетка, з якой мы ходзім у магазін). Сеткай гэтай я не раз карыстаўся, калі мама пакідала нас з сястрой удваіх і калі на мяне ўскладваўся абавязак выхоўваць сястру... Сёння займацца выхаваннем у мяне не было часу: да свята заставаўся ўсяго адзін толькі дзень, а мы не падрыхтавалі для мамы яшчэ ніякіх падарункаў.

І я пайшоў на хітрасць. Я надаў свайму твару выраз глыбокай развагі, нейкі час маўчаў, нібыта заняты сур'ёзным роздумам, а потым так звярнуўся да сястры:

– Коцік хлебча з талеркі малако, безумоўна, таксама нядрэнна... Але ж у мінулым годзе ты таксама вышывала маме коціка.

– Не, у мінулым годзе я вышывала зайчыка.

– Гм... Вось бачыш. А ў дзіцячым садзе таксама быў зайчык?

– Не, у дзіцячым садзе, калі я была ў старэйшай групе, я вышыла маме вішанькі. А ў малодшай групе я выразала маме прыгожы зялёны кружок. А на яго наклеіла яшчэ маленькія чырвоныя кружочкі... Калі не верыш – магу паказаць. Усе мае падарункі ляжаць у маміным пісьмовым стале. Там усё маё багацце ляжыць, кажа мама. Мама кажа,

што яна хавае яго і аддасць мне, калі я вырасту вялікая...

Перагаварыць або спыніць маю сястру гэтаксама немагчыма, як немагчыма ўгаварыць яе не рабіць тое, што нікому не патрэбна і не цікава.

— Добра, добра, — зрабіў я ўсё-такі спробу спыніць яе.

Але дзе там! Адзін момант — і сястра разлажыла перада мной папку з яе багаццем, якое захоўвалася ў маміным стале. Падумаеш багацце! Пісьмо маме, калі мама ляжала ў бальніцы. Літары друкаваныя — і ўсе шыварат-навыварат:

МАМАЧКА Я БЕЗ ЦЯБЕ СУМУЮ

Незразумела толькі, чаму мама не разарвала гэтыя каракулі і не выкінула іх вон...

А то яшчэ ў гэтым «багацці» ляжаць сестрыны малюнкі. Ваза, падобная да вядра. І стол, у якога ўсе чатыры ножкі з аднаго боку... Потым сястра пачала выхваляцца пасмачкай валасоў, якую адстрыглі, калі ёй было дзевяць месяцаў. Пачала выхваляцца сваімі зайчыкамі і вішанькамі...

Я ўвесь гарэў нібы ў агні: і навошта маме спатрэбілася хаваць увесь гэты Натчын хлам? Не хапала яшчэ адной сурвэткі... А маме, безумоўна, няёмка будзе сказаць, што ёй надакучылі гэтыя коцікі і зайчыкі! Бедная мама!

Я, напрыклад... Я таксама рабіў падарункі маме на святы. Праўда, летась я забыўся пра мамін дзень. А ў дзень мамінага нараджэння атрымаў двойку за паводзіны... Падумаеш, па ўроку батанікі пацягнуў за касу Лорку-зубрылку, а настаўніца ўбачыла... Затое ў гэтым годзе я вырашыў зрабіць маме незвычайны падарунак! Такі падарунак, якога ніхто не зробіць.

– Ведаеш што, – завязваючы сваё багацце назад у папку, звярнулася да мяне сястра. – Я ўжо не буду вышываць коціка. Я перадумала.

– А што ж ты будзеш?

– Я падарую маме малюнак. Прыгожы, прыгожы, як у нашым музеі, дзе карціны.

– Малюнак?! – я аж падскочыў ад нечаканасці.

Як гэта я сам не здагадаўся. Мама так любіць, калі мы малюем, або іграем (сястра іграе на скрыпцы, я таксама крыху іграю, але мама кажа, што я лянуюся), або чытаем добрыя кніжкі...

У мінулую нядзелю мы хадзілі з мамай у музей і бачылі там столькі ўсякіх карцін! Ідучы дадому, мама сказала нам:

– Бачыце, дзеці, якую мы з вамі сёння радасць атрымалі.

Дык чаму ж і сапраўды не зрабіць маме гэтую радасць. Я ж таксама магу падараваць

ей малюнак. І, напэўна, не горшы за Натчын...

— Я намалюю маме птушку! — паведаміла сястра з другога пакоя. Яна ўжо раскладвала на стале паперу і рыхтавала ваду для фарбаў. І рабіла гэта так урачыста, што я не вытрымаў, крыкнуў ёй:

— Падумаеш, задавака! І аддай, калі ласка, мае фарбы, я таксама буду маляваць.

— Жадзёба!

— Кажу табе, аддай!

— А вось і не аддам!

Нічога больш не кажучы, я накіраваўся да таго месца, дзе звычайна вісела наша сетка.

— Усё роўна не аддам! Усё роўна! — захныкала Натка.

— Плакса-вакса-гуталін, на насу гарачы блін! — падражніў я сястру.

— А ты... А ты...

Нарэшце нам надакучыла сварыцца і мы ўзяліся за маляванне. Сястра малявала птушку, а я... Я вырашыў намаляваць карціну зімовага лесу. Такую якраз, як у мастака Шышкіна.

— Ты хутка ўжо скончыш? — праз кожныя пяць хвілін пыталася ў мяне Натка.

Праз адчыненыя дзверы я бачыў, як сястра сядзела, высунуўшы кончык языка, старанна сцірала нешта сцiркай, потым малява-

ла пэндзлікам, а потым зноў сцірала і зноў малявала. Яна расчырванелася і аж спацела – так старалася. У мяне ж... Я таксама стараўся. Але мой зімовы лес атрымліваўся такім зялёным і стракатым, якім не быў ён і летам. Я ўзяў другі аркуш і замест лесу намаляваў адну толькі яліну. Падумаеш... Затое поруч з ялінай я намаляваў прыкіданы снегам пень. Пень мне спадабаўся. Тады я намаляваў яшчэ адзін пень і таксама прыкідаў яго снегам. А поруч з ім яшчэ адзін і яшчэ адзін... Я так захапіўся, што не заўважыў, калі была скончана мая карціна. Праўда, атрымаўся не зімовы, а ссечаны лес...

– Ты ўжо хутка скончыш? – неўзабаве зноў запытала ў мяне сястра, размахваючы сваім малюнкам у паветры. Так яна сушыла яго.

– Хутка, – няпэўна адказаў я, на самай справе не ведаючы, як мне быць.

– А ў мяне ногі не атрымліваюцца, – паскардзілася Натка. – Можа, ты мне намалюеш ногі, Вовачка?

Ага, як намаляваць ёй ногі, дык тады я ўжо Вовачка...

– Давай сюды, – згадзіўся я.

І зрабіў гэта знарок: цікава паглядзець, што там у яе атрымалася? Натка прынесла свой малюнак.

– Вось бачыш, усё добра, толькі ногі ў мяне...

— Ногі ў цябе... А якая гэта птушка?

— Голуб...

— Голуб? Які ж гэта голуб! Гэта ж варона!

— Сам ты варона! — накінулася на мяне Натка, аднак у час зразумела: яшчэ адна абраза, і я адмоўлюся маляваць ногі яе птушцы.

— І зусім не варона! І зусім голуб, як у нашага дзядзі Колі. Шэранькі...

— Шэранькі... А дзюба?

Дзюба ў Натчынага голуба сапраўды была доўгая і панурая.

— А хвост?

Хвост таксама быў, як у вароны.

— Эх, мастачка!.. Давай я табе пакажу, як малююць сапраўдныя мастакі!

Я узяў у Наткі пэндзлік. Р-раз. Д-два. Р-раз. Д-два... Птушка абаперлася на зграбныя сізыя ножкі, здаецца, вось-вось зробіць некалькі нетаропкіх кароценькіх шажкоў...

— Ой, які прыгожанькі! Які прыгожанькі! — заляскала ў далоні сястра. Яна так захаплялася сваім голубам, што мяне аж злосць разабрала. Намалявала нейкую варону, а форсу колькі! Каб не мае ногі, дык наогул не было б на што глядзець...

— Падумаеш, задавака!.. «Вароне дзесьці бог паслаў кавалак сыру».

Я чакаў, што Натка накінецца на мяне, будзе злаваць, плакаць... А яна раптам як

засмяецца, як заплёскае яшчэ мацней у далоні.

— Ой, як цудоўна! Ой, як цудоўна! А я не ведала, як назваць свой малюнак!.. Ты мне, Вовачка, толькі дамалюеш яліну. Яліны ў цябе вельмі добра атрымліваюцца! А сыр — сыр я і сама намалюю!

І Натка ўзялася за сыр. За мой сыр. Бо гэта ж я ёй падказаў яго. А сам я сядзеў над сваім лесам і ўсё падмалёўваў і падмалёўваў прыкіданыя снегам пні...

Вось табе і зімовы лес. Вось табе і Шышкін... Безумоўна, лепш за ўсё было б узяць новы аркуш і, як кажа наш настаўнік малявання, памяняць тэму...

Скончыўшы з сырам, задаволеная сваім малюнкам, сястра звярнула нарэшце ўвагу і на маю работу.

— Што гэта ў цябе — адны пні? — Вочы ў Наткі шырока расплюшчыліся, губы ад здзіўлення выцягнуліся... І раптам яна як пакоціцца ад смеху на канапу:

— Ой, памру! Ой, памру!

— І нічога смешнага няма, — пакрыўдзіўся я, прыкрываючы свае пянькі чыстым аркушам паперы. — Вельмі ўжо твая варона...

— Ведаеш... Ведаеш, як трэба назваць тваю карціну? — ледзь прамовіла скрозь смех Натка.

— Ну, як? — я не чакаў ад яе нічога добрага. Натка зноў пакацілася на канапу.

— Плакала... Плакала Саша... як лес высякалі...

Дзіўна, але я таксама не пакрыўдзіўся на сястру. Як і яна, я таксама запляскаў у далоні і ў дадатак перакруціўся яшчэ на адной назе.

— Натка — ты геній!..

І тут жа зрабіў подпіс пад сваёй карцінай: «Плакала Саша, як лес высякалі...»

* * *

Назаўтра мы сустрэлі сваю маму з работы яшчэ на парозе. Мы тут жа ўзялі ў яе з рук цяжкую сумку. (Мы стрымаліся! Мы не спыталі яе на гэты раз: «А што ты прынесла нам?..») Мы дапамаглі ёй распранучца і ўрачыста, пад рукі, павялі яе ў пакой: там, на самым відным месцы, віселі нашы малюнкі — Натчын голуб, або «Вароне дзесьці бог паслаў кавалак сыру», і мой зімовы лес, або «Плакала Саша, як лес высякалі...»

— Ого! — ад прыемнага здзіўлення мама спынілася за некалькі крокаў ад нашых малюнкаў. — Ого! — паўтарыла яна. — Дык я трапіла на вернісаж!

Мы ніколі не чулі гэтага слова: вернісаж. І не ведалі, што яно азначае.

– Віншую цябе са святам, мамачка, – не вельмі ўпэўнена прамовіла Натка.

– І я віншую цябе... – гэтак жа няўпэўнена ўслед за сястрой паўтарыў і я.

– Дзякуй, дзякуй, мае залатыя мастакі! – пацалавала па чарзе Натку і мяне мама. – Ну, і калі ў нас сёння вернісаж!.. Дык на вернісажы звычайна мастакам гавораць прыемныя словы, хваляць іх... Вось і я...

Мама хуценька адвярнулася да свае цяжкае сумкі, дастала адтуль дзве каробкі цукерак і дала іх нам – Натцы і мне.

Вось што, аказваецца, азначала гэта дзіўнае слова – вернісаж. Нам з сястрой яно спадабалася.

## Пятро *Васючэнка*

### ЖАЛАСЛІВАЯ ПРЫНЦЭСА

У Краіне-Дзе-Ніколі-Не-Плачуць жыла-была прынцэса Людвіка Жаласлівая. У гэтай краіне працавалі і зараблялі грошы сур'ёзныя людзі, якія не мелі часу не толькі на тое, каб плакаць, але і смяяцца. Прынцэса ж была несур'ёзная, бо шкадавала ўсіх бедных.

Аднойчы прынцэса гуляла па садзе са сваёй фрэйлінай.

– Навошта вы мяне ў лужыну штурхаеце? – сярдзіта казала фрэйліна.

– Прабачце, але вы маглі наступіць вунь на тую зялёненькую жабку.

– Які жах! – сказала фрэйліна і страціла прытомнасць.

Фрэйліна часта губляла прытомнасць, усе да гэтага прывыклі. Таму прынцэса не спалохалася і нават паспела вызваліць з павуціння мушку-зелянушку.

Мушка ўмела гаварыць.

– Дзякуй табе, прынцэса, што выратавала мяне з лапаў гэтага кашлатага павука. За гэта я скажу табе, дзе тваё шчасце. Яго прынясе табе чалавек, у якога на пальцы будзе зялёны пярсцёнак.

— Дзякуй! — сказала прынцэса. — Я і так шчаслівая. У нашай краіне ўсе шчаслівыя. Такі ў нас закон.

— З кім гэта вы размаўляеце, ваша высокасць? — запыталася фрэйліна, якая да гэтага часу ўжо апрытомнела. — З павуком?

— Не, з мушкай, — адказала Прынцэса, якая не ўмела хлусіць.

— Які жах! — прамовіла фрэйліна і зноў страціла прытомнасць. А пасля таго, як ачуняла, пайшла дакладваць каралю Генрыху XI Сур'ёзнаму пра паводзіны дачкі.

«Як гэта несур'ёзна, — падумаў кароль, выслухаўшы аповед фрэйліны. — Жабкі гэтыя, жучкі, чарвячкі... Нашаму бізнесу такая жаласлівасць толькі на шкоду. Трэба дачку хутчэй замуж аддаць, каб стала сур'ёзнай».

Назаўтра перад каралеўскім палацам стаяў натоўп жаніхоў — каралёў ды прынцаў, шыкоўна прыбраных.

Прынцэса мусіла размаўляць з імі пра кошты на рынку і курс валюты. Але яна не марнавала часу і паспела перавязаць лапку параненаму вераб'ю. Гэта заўважылі жаніхі і пачалі паміж сабою перашэптвацца:

— Жаласлівая! На паляванне з ёю не паедзеш. Ваяваць забароніць. Не патрэбная нам такая жонка!

І жаніхі памалу пачалі разыходзіцца. Толькі адзін застаўся, зусім не падобны да іншых. Усяго хараства ў яго было – добрыя і крыху сумныя вочы і маленькія вусікі. За тое жаніхі зласліва празвалі яго каралём Вусенем.

– Выходзь за мяне замуж, прынцэса, – сказаў ён. – Мне цябе шкада.

– Вось як? – здзівілася прынцэса. – Гэта ж я вас павінна шкадаваць, бо я – жаласлівая.

– Пойдзем у маю краіну, Людвіка, – сказаў кароль Вусень, – і я навучу цябе смяяцца і плакаць.

З гэтымі словамі кароль Вусень працягнуў прынцэсе руку, і яна пабачыла на ягоным пальцы зялёненькі пярсцёнак.

«А мне ён і без пярсцёнка спадабаўся, – падумала прынцэса. – У яго добрыя вочы».

– Ну і выбрала! – здзівіўся кароль Генрых XI Сур'ёзны. – Па-мойму, гэта несур'ёзна. Але гэта твой выбар.

І Жаласлівая Прынцэса пайшла следам за каралём Вусенем у ягоную далёкую краіну.

– Чаму вы такі сумны, ваша вялікасць? – спытала яна.

– Млосна мне без слёз і смеху. Але ты не палохайся, што б ні здарылася, – адказваў кароль Вусень.

Пад вечар каралю зрабілася зусім блага, і яны мусілі спыніцца ў прыдарожнай карчме.

Уначы ў хворага караля пачаліся сутаргі. Ногі і рукі здранцвелі і сталі нерухомыя. Цела пакрылася шорсткім панцырам. Але на застылым, бы маска, твары ззялі добрыя, крыху сумныя вочы.

Нікога ў жыцці Жаласлівая Прынцэса не шкадавала так моцна. Слёзы закапалі з яе вачэй. Дзве пякучыя слязіны ўпалі на панцыр, і той раскалоўся, бы шкарлупіна яйка. Кароль падняўся з ложка, памаладзелы, бадзёры, прыгожы. Цяпер яго можна было называць не кароль Вусень, а кароль Матыль, бо за плячыма ў яго пераліваласе перламутрам пара яркіх крылаў.

«А мне ён і раней падабаўся не менш», – падумала Жаласлівая Прынцэса.

– У маёй краіне ўсе лятаюць. І кузуркі, і чарвячкі, і людзі, – сказаў кароль Матыль. – Ты таксама станеш там крылатай.

– А мой тата? Мы запросім яго да сябе? – спытала Жаласлівая Прынцэса.

– Абавязкова! – паабяцаў кароль. – Толькі спачатку навучым яго таму, што ўмеем самі.

...Я чуў, што днямі кароль Генрых XI атрымаў ліст ад дачкі з Краіны-Дзе-Смяюцца-І-Плачуць. Казалі, што, прачытаўшы той ліст, кароль павёў сябе зусім несур'ёзна: рагатаў і плакаў, як дзіця.

## Міхась *Даніленка*

### САМЫЯ ДАРАГІЯ ПАДАРУНКІ

У Івана Іванавіча два праўнукі, Ігар і Паўлік. Але стары не любіць называць іх праўнукамі, жартуе:

– Лепей будзьце ўнукамі. Так і я сябе маладзейшым адчуваю.

Ігар і Паўлік ведаюць: дзеду шмат гадоў. Восенню восемдзесят пяць стукне. Ён некалі ваяваў, мае баявыя ўзнагароды. Дзед, праўда, не любіць іх паказваць, ды хлопчыкі ўпотай, калі яго няма побач, разглядваюць тыя медалі і ордэн.

Набліжалася памятная дата – дзедаў юбілей.

– Што падарыць табе, дзядуля? – пыталіся Ігар і Паўлік, калі прыходзілі ў госці.

– Нічога не трэба, – адказваў дзед. – Раскажыце лепш, што добрага зрабілі, і я буду самым шчаслівым чалавекам на свеце.

Надышла восень. У гарадскім скверы дрэвы амаль пагублялі лістоту. Пад нагамі шапацела, калі хлопчыкі ішлі віншаваць дзеда з юбілеем.

У кватэры падзівіліся: увесь стол у вялікім пакоі быў застаўлены кветкамі і падарункамі. Нехта прынёс чайнік са свістком, нехта –

кнігі, нехта – гадзіннік, які вызвоньваў светлую мелодыю...

– Чым жа вы, мае дарагія, парадуеце дзеда? – пацікавіўся Іван Іванавіч.

Паўлік першы пахваліўся:

– Я старэнькую бабулю цераз вуліцу перавёў. І яна мне падзякавала.

– А я сам памыў дома падлогу, – паведаміў Ігар.

– Дзядуля, глядзі, якую я табе кавеньку змайстраваў, – паказаў Паўлік палку, якую хаваў за спінаю. – Каб табе лягчэй хадзіць было.

– А я ўчора яшчэ чаравікі твае, дзядуля, пачысціў, – прыгадаў Ігар. – Хіба ты не заўважыў?

– Заўважыў, заўважыў, – сказаў дзед. – І за кавеньку дзякуй. Для мяне гэта – самыя дарагія падарункі, – і прыгарнуў да сябе ўнукаў. – І далей рабіце ў жыцці толькі добрае. І сваім родным, і сябрам, і іншым людзям.

## *Уладзімір Дубоўка*

### ПРА ДЗЕДА І ЎНУКА

**1**

Недзе далёка
ў вёсцы маленькай
век дажываў свой
дзедка старэнькі.

Старасць – не радасць.
Сядзе абедаць –
ежа ліецца
з лыжкі ў дзеда.

Пазалівае
чысты абрус так
ён і заціркай,
ён і капустай.

З гэтай прычыны
дзеда старога
есці саджалі
каля парога.

Там ён і снедаў,
там і абедаў,
там ён з унукам
меў і бяседы...

## 2

Дзедаў унучак,
мамін сыночак,
ножык узяўшы,
сеў у куточак.

Нешта майструе,
нешта складае.
Будзе, напэўна,
цацка якая.

Маці пытае:
– Любы сыночак!
Што ж ты майструеш,
сеўшы ў куточак?

Што ж гэта будзе,
скрыначка быццам?
– Будзе, матуля,
гэта – карытца.

Як пастарэеце
з татам абое,
вас не прыму я
есці з сабою.

Каля карытца
вас пасаджаю,
поснай заціркі
паналіваю...

Тата на маму,
мама на тату
глянулі моўчкі:
«Хто ж вінаваты?»

**3**

З гэтага часу
дзеда старога
больш не саджалі
каля парога.

Так, як усюды,
у кожнай сямейцы,
разам з сабою
далі яму месца...

Казачка гэта
вельмі старая,
ходзіць па свеце
з краю да краю.

Хто пра яе
і забудзецца, можа,
ўнучак маленькі
зноў дапаможа:

Ён пачытае.
Хоць ведаюць людзі,
але напомніць
лішнім не будзе.

## **М***ар'ян Дукса*

### ТАТАВА МАШЫНА

Навіной хвалюся вось:
А у нас
Машына ёсць.
Не, не цацка завадная,
А сапраўдная такая.
Не машына – проста чары:
Што за колы,
Што за фары,
Нібы зроблена
З эмалі –
Па ёй промні заскакалі.
Толькі вось
Цяпер дахаты
Не спяшаецца мой тата.
Зараз тата забывае,
Што вячэра астывае.
Кажа мама мне:
– Бяжы!
Тата недзе ў гаражы.
– Ой, гараж – машыны хата,
Адпусці вячэраць тату.

## Васіль Жуковіч

### ДЗІЎНЫ ГОРАД

Горад бачыў я цудоўны
у далёкай старане,
горад быў ласункаў поўны,
ён запамятаўся мне.

З цукру там былі дарогі,
ледзянцовыя масты,
шакаладныя стаялі
кветкі, дрэвы і кусты.

Білі там фантаны фанты
і ракою поўнай цёк
ну такі ўжо свежы, смачны
ды з мядовым пахам сок!

І марожанага горы
там ляжалі, быццам снег...
Бачыў я салодкі горад
у сваім салодкім сне.

## **В**_асіль Зуёнак_

### СМАЧНЫ СОН

Сніўся Пецю смачны сон:
На батоне ехаў ён.

Лётаў Сцёпка на бліне,
Як на цуда-дыване.

Цыркачом Сымон да ганка
Прыкаціў на абаранку.

Кліма ўзняў аж да аблок
Дырыжабль-агурок.

Паддаваў Мікіта пары –
Бег цягнік за самаварам:
Як вагоны – шклянкі, плюшкі,
А замест білетаў – сушкі.

Ды галодны бег Дзяніс –
Абаранак мігам згрыз.

А пасля – зблажэў зусім:
Паўбатона адкусіў.

І ў дадатак, на закуску,
Агурком Дзяніс захрускаў.

Да бліна не дацягнуўся,
Блін у рукі сам вярнуўся:
Апусціўся, бо дачасна
У ім без масла
Цяга згасла.

Толькі чаю не папіў,
Бо Мікіта затрубіў.

Тут і Пеця прахапіўся,
Смачны сон перапыніўся...

# КАТОК — ЗАЛАТЫ ЛАБОК

*Беларуская народная казка*
*ў апрацоўцы Алеся Якімовіча*

Жылі дзед з бабай. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць. Вось баба і кажа дзеду:

— Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі гарчык мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок. Выскачыў з дуба каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак, паслала мяне баба ссекчы дубок, завезці на рынак, прадаць і купіць гарчык мукі на хлеб.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе ў вас мука!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго мукі поўныя засекі.

Спякла баба хлеб, сама наелася, дзеда накарміла і кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і заціркі наварыць. Ды солі няма. Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго солі.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць — солі няма!

— Едзь, дзед, дахаты: будзе соль!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго солі цэлая дзежка стаіць.

Наварыла баба заціркі, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і капусты паспытаць. Вастры, дзеду, тапарок, едзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго капусты.

Навастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць, соль ёсць — капусты няма!

— Едзь, дзед, дахаты: будзе капуста!

Прыехаў дзед дахаты, а ў яго капусты поўная кадушка!

— Ай, як добра! Вось каб цяпер яшчэ сальца... Мы б з табою капусты наварылі, сальцам закрасілі б. Не палянуйся, дзеду: вазьмі тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго сальца.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: просіць баба яшчэ сальца да капусты.

— Добра, дзед, едзь дахаты: будзе сала.

Прыязджае дзед дахаты, а ў яго сала цэлы кубелец!

Рады дзед, рада баба. Сталі яны жыць ды пажываць, дзецям казкі казаць.

І цяпер жывуць, хлеб жуюць, капустаю з салам закусваюць.

Вось вам казка, а мне абаранкаў вязка.

## *Уладзімір Лінскі*

# ПРЫГОДЫ НУЛІКА

*(урыўкі)*

### Хто такі Нулік

Жыў-быў Нулік.

Сумна жыў, абы-як. Спытаеце чаму? Ды таму, што быў адзінокі. Ні з кім не сябраваў, ні да каго не хадзіў у госці. Ды як ён мог пайсці, калі ў яго не было нават ног. І рук не было. І вачэй. І носа. І рота.

Нулік быў ніхто, нічый, ніякі. Ён уяўляў сабой роўны абадок, які нібыта саскочыў з курынага яйка. Было яно абвязана дроцікам ад «носіка» да «пяткі» — і раптам вылузнулася з палону. А тая абвязка і стала Нулікам.

На што быў падобны Нулік?

Ды багата на што. На дзірку ад абаранка. На пялёсткі рамонка. На гадзіннік, пярсцёнак, абруч, кола. На савіныя вочы. На пятачок парасяці. На кольцы ў нажніцах.

Дзе жыў Нулік? Ды абы-дзе. Мог жыць у мыльных бурбалках-пухірах. У клубах дыму. На пяску. На слівавых дрэвах. Нават на воблаках.

А што рабіў Нулік?

Ды нічога. Ён умеў толькі палежваць: то на правым баку, то на левым. Мог стаяць, калі нехта яго падтрымліваў, каб не кульнуўся. Той нехта мог быць ці гурбай снегу, ці сасновымі іголкамі, ці выпадковым ветрыкам.

Аднойчы ветрык-падарожнік і нашаптаў Нуліку пра казачнага Калабка. Помніце, ляжаў-палежваў Калабок, ды раптам і пакаціўся.

З акна на лаву, з лавы на падлогу, а далей – праз дзверы ў двор. І памінай баба з дзедам як звалі Калабка.

Задумаў і Нулік паспрабаваць шчасця. Захацеў і ён пабачыць свету. З дапамогай ветрыку пакаціўся Нулік па зялёнай траўцы, пасля – па сцяжынцы. Выскачыў на шырокую роўную вуліцу. Каціўся, каціўся, пакуль не стукнуўся аб сцяну высокага цаглянага дома. Упаў Нулік на асфальт. Думаў, тут яму і канец надышоў. Ды раптам яго нехта падняў...

## Міколка-ратавальнік

Жыве ў высокім доме, на сёмым паверсе, хлопчык Міколка. Вельмі ж ён пацешны. Выйдзе на вуліцу, сядзе на лаўку і сядзіць, думае. А дзеці гушкаюцца, у пясочніцы корпаюцца. У яго пытаюцца:

– Што робіш, Міколка?

– Варон пералічваю...

А то скажа, што балконы лічыць у сваім доме, галіны на клёне, кветкі на газоне.

Як толькі ні клікалі Міколку: і грамацеем, і матэматыкам, і, не паверыце нават, дзядзькам Колем. Ленка з пятага паверха склала пра яго дражнілку:

Дзядзька Коля – велікан,
Уваліўся ў мамін жбан.
А ў жбане малако,
Дзядзя Коля – ко-ко-ко...

З верасня Міколку пачалі называць Нулікам, бо пайшоў вучыцца ў нулявы клас. Ён, канечне, не вельмі падобны на нуль. Хутчэй на лугавога коніка. Танклявы, падцягнуты, толькі скакаць не любіць. Ходзіць павольна, задуменна.

От аднойчы ішоў ён, пра нешта думаў. А можа, пліты лічыў, па якіх ступаў? Ды раптам аж войкнуў ад знаходкі. Каля самай сцяны ляжаў сапраўдны Нулік. Міколка быццам пачуў яго голас:

– Ратуйце мяне!..

Хлопчык Нулік ухапіў у рукі лічбу Нулік і панёс у сваю кватэру. Бег па лесвіцы і ўвесь час адчуваў у руках не проста абадок з дроціка, а нешта як быццам жывое.

Міколка ўскочыў у свой пакой. Паклаў знаходку на белы аркуш паперы, які ляжаў на

яго пісьмовым стале. Ухапіў каляровыя алоўкі і пачаў маляваць Нуліку вочы, нос, рот, вушы.

І здарыўся цуд. Вочы ажылі, і сінія «кропачкі» пачалі азіраць Міколку. Нос Нулікаў чмыхнуў. А рот заварушыўся, і ў пакоі пачуўся піскліявы голас незвычайнага госця:

— Дзе я?.. Што са мной?..

Міколка расказаў усё, як было. Нулік войкнуў:

— Вой, як моцна я ўдарыўся аб сцяну.

— Цяпер у цябе ёсць вочы, будзеш бачыць, куды каціцца, — супакоіў Міколка.

— Хачу не каціцца, а ісці, як ты, — папрасіў Нулік.

Міколка хуценька дамаляваў Нуліку рукі, ногі. На галаве зрабіў прычоску — накруціў маленькіх нулікаў. І перад ім паўстаў жывы Нулік, якога Міколка не бачыў ні ў сваім падручніку, ні ў мульціках.

## Першыя крокі

Як толькі Нулік стаў на ногі, яму захацелася агледзець Міколкаву кватэру. Ён скокнуў са стала на крэсла, з крэсла — на дыван, які ляжаў на паркетнай падлозе. Тут Нулік адчуў раздолле і пачаў перакульвацца з ног на рукі, з рук на ногі.

— О-пля! — Госць стаў на ногі-нулікі і падбухторыў Міколку: — А ты так умееш?

— Не спрабаваў...

Міколка і Нулік пачалі куляцца на дыване. Ім было весела і смешна.

Раптам Нулік прыпыніўся і спытаў:

— Слухай, Міколка, а ты можаш высока падскочыць?

— Магу! Глядзі!..

Міколка ўскінуў рукі ўгору, як быццам хацеў узляцець. Ды толькі адарваўся ад падлогі. Тут жа і прысеў.

— Э, трэба во як! — Нулік узмахнуў рукамі і, нібыта надзьмуты шар, узляцеў аж да столі. Прысеў на люстру. Пераскочыў на шафу. Сядзіць там і дражніць Міколку: — Падскоквай да мяне. Адсюль усё бачна.

Міколка падставіў табурэтку, хацеў лезці на шафу, але ў пакой якраз зазірнула бабуля і асіплым голасам сказала:

— Чаго вэрхал падняў?.. Куды лезеш?..

— Я гуляю з... — Міколка хацеў прызнацца, з кім ён пасябраваў, але з-пад столі, з самага верху шафы Нулік тоненька чмыхнуў.

Вось так: «Ап-цхні!»

А Міколку пачулася: «Сціхні!» Ён і змоўк.

Затое бабуля ўсхвалявалася:

— Чхаеш? Зноў прастудзіўся. О Божа, што скажа мама?! Марш на кухню чай піць. Пасля ўрокі будзем рабіць.

Нулік усё чуў, ды мала што разумеў. Калі бабуля з Міколкам выйшлі з пакоя, ён саскочыў з шафы, сеў у крэсла і задумаўся. Чаму бабуля зазлавала на Міколку? Чаму не дазваляе яму дурэць? Навошта людзі п'юць чай? Навошта дзяцей прымушаюць рабіць нейкія ўрокі?..

Ад гэтага роздуму Нулік аж засумаваў. Захацелася, як і раней, бесклапотна катацца па вуліцах. Але ж трэба выручаць сябра Міколку. А як?..

# Янка Маўр

## ШЧАСЦЕ

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ як мага, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і ўсялякая зеляніна, што жыве навакол, дыхае, шамаціць і запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і мне. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскокваючы на аднойназе.

Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць. Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. Я лагодна ўсміхаюся яму, ківаю галавой і кажу:

— Добра жыць на свеце, браток, га?

Тварык хлопчыка засвяціўся яшчэ больш, але ён нічога не сказаў.

Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык. Здавалася, што ён вось-вось нешта скажа.

Я яго разумеў. Але ён, відаць, гэтага не ведаў, бо ўсё глядзеў мне ў вочы, нібы чагосьці

чакаючы ад мяне. Ён заліваў мяне сваім шчасцем, а я ў адказ нічога не мог яму даць. Мне трэба яму нешта сказаць. Але што? Што яму сказаць, каб перадаць усю тую цеплыню, якую я ад яго адчуваю?

– Як цябе зваць? – сказаў я нарэшце, каб толькі не маўчаць.

Хлопчык нічога мне не адказаў. Сваім дзіцячым інстынктам ён, відаць, зразумеў, што словы гэтыя сказаны так сабе, абы сказаць. Мала таго: твар яго перастаў свяціцца, нават неяк балюча скрывіўся.

А потым... потым з грудзей яго вырваўся крык!.. Два словы толькі было ў гэтым крыку:

– Дзядзька!.. Шапка!..

Але гэтага было досыць, каб зразумець, хоць і са спазненнем, усю тую трагедыю, якая адбылася тут, на мосце, у гэты радасны летні дзень.

У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў, відаць, першы раз. Добрая шапка, шэрая, каляная. Яна ахапіла не толькі галаву хлопчыка, але ўсё цела і душу. Гэта ж праз яе сёння такі цудоўны дзень, а я гэтага не ведаў. І сонца так шчодра свеціць толькі дзеля таго, каб усе здалёк маглі бачыць шапку, а я не заўважыў яе і зблізку. Адзін усяго толькі крок заставалася зрабіць – і ўся сустрэча пайшла б прахам. Ці

магла чулая дзіцячая душа сцярпець такую несправядлівасць, такое халоднае бяздушша? І яна не сцярпела...

Я адчуў сябе вельмі вінаватым і кінуўся выпраўляць сваю віну.

– Ах, якая цудоўная ў цябе шапка! – крыкнуў я. – Пакажы, пакажы!

Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю. Я зняў з яго галавы шапку. Яна сапраўды хрусцела, як бляшаная. Хлопчык глядзеў на мяне ўдзячнымі вачыма, бы на свайго збаўцу.

– Які казырок! І шнурок! І гузікі два! – стараўся я. – А падкладка якая цудоўная! Хто купіў?

– Мамка! – з гордасцю адказаў хлопчык. Несправядлівасць была выпраўлена.

І мы абодва, зноў шчаслівыя, разышліся кожны сваім шляхам.

## *Людміла Рублеўская*

### ЯК ТАТА СТАЎ СУПЕРМЕНАМ

*(урывак з аповесці-казкі «Прыгоды мышкі Пік-Пік»)*

Аднойчы, калі ўсе ў кватэры паснулі, пабегла мышка Пік-Пік на кухню чым-небудзь падсілкавацца. Ну гаспадары, ну галота! Ні цукерачак, ні торцікаў, ні печыва не пакінулі на стале для беднай мышкі! Толькі... два пернічкі, палова шакаладкі, жменька разынак, чатыры арэшкі, адзін яблычак... Хіба гэта можа выратаваць ад галоднай смерці? Ды яшчэ ёсць вялікі гаршчок на пліце... Пахне з-пад накрыўкі, праўда, смачна. Здаецца, грэчневай кашай з малаком. Ну, не з голаду ж паміраць... І мышка ўскараскалася на пліту, адкінула накрыўку і скокнула ўніз. Каша сапраўды аказалася смачная. І мышка выела ўсё да донца. А вылезці — як? Гэта спецыяльна, мусіць, робяць такія вялікія гаршкі — каб сумленных мышак лавіць. Вакол — чыгунныя гладкія сценкі... Цёмна... Страшна зрабілася Пік-Пік, і яна закрычала:

— Ратуйце!

Мышыны голас гучаў з пустога гаршка так гучна і страшна, што ўсе прачнуліся – Мама, Тата, Веранічка, Пепіта.

– Што гэта? Хто крычыць? – пыталіся яны адно ў аднаго, а мышка ўсё благала:

– Лю-у-дзі! Сю-у-ды!

Людзі і котка згрувасціліся перад дзвярыма на кухню.

– Там іншапланецяне, – упэўнена прашаптаў Тата. – Я даўно заўважыў, што яны нам знакі пакідаюць – на вазонах кветкі ламаюць.

– Не, там Баба Юга! – сказала Веранічка. Нікога страшнейшага яна пакуль не ведала.

– А мне здаецца, гэта рабаўнік. Ён лез да нас праз фортку і зашчаміўся. Па тэлевізары нядаўна пра такое распавядалі, – запярэчыла Мама.

– Глупства! Я здагадваюся, хто гэта, – прамуркатала Пепіта і слізганула на кухню.

Пепіта адразу зразумела, адкуль страшны голас. Яна скочыла на пліту, зірнула ў гаршчок.

– Так я і думала! Прывітанне, шкодніца! Ну добра, зараз дапамагу...

Пепіта паспрабавала дастаць Пік-Пік, але, на жаль, толькі папхнула гаршчок і той са страшэнным грукатам упаў на падлогу, пакаціўся...

Па той бок дзвярэй кухні пачуліся крыкі.

– Як ты мог адпусціць туды бедную Пепіту? – дакарала Тату ўгневаная Мама. – Ты ж мужчына! Ратуй нас!

Тата сціснуў сківіцы, пабег у калідор, узяў малаток і – на кухню... У цемры спатыкнуўся аб гаршчок і з усяе сілы стукнуў па ім малатком. Бедная аглушаная Пік-Пік выскачыла са сваёй чыгуннай турмы і слізганула ў норку. Стала ціха. Мама асцярожна зайшла на кухню і запаліла святло.

– Што... што тут рабілася?

– Ды так, – сціпла сказаў Тата. – Былі рабаўнікі, толькі нейкія слабыя. Стукнуў аднаго малатком, дык і збеглі.

Мама застагнала, паклала таблетку пад язык і пакіравалася ў ложак. А на кухню асмелілася зайсці Веранічка.

– Тата, прызнайся, што тут было насамрэч?

– Ды так, – сціпла сказаў Тата. – Баба Юга швэндалася. Стукнуў яе малатком па касцяной назе, яна і ўцякла.

Веранічка з захапленнем паглядзела на Тату і пайшла спаць. А Пепіта, якая сядзела ўвесь гэты час на пліце, фыркнула і шматзначна прамовіла:

– Ну, я дык ведаю, што было на самай справе...

– Так, табе я магу сказаць праўду, – прашаптаў Тата. – Гэта былі іншапланецяне. Каб не стукнуў я малатком па іх лётаючай талерцы, невядома, чым бы гэта скончылася...

Пепіта аж мову страціла ад здзіўлення. Тата паклаў малаток на месца і таксама пайшоў спаць. А Пік-Пік мармытала абурана ў сваёй норцы:

– Гэта неадменна штукарствы амерыканскага гангстара Мікі Маўса... Вось помслівы які... Не хоча зміравацца, што я яго разлюбіла.

## МЫШКА ПІК-ПІК РОБІЦЬ САБЕ МАКІЯЖ

*(урывак з аповесці-казкі «Прыгоды мышкі Пік-Пік»)*

Аднойчы днём прыснілася мышцы Пік-Пік каўбаса. І так захацелася мышцы яе з'есці, што і сон прапаў. Пік-Пік думала: «Котцы Пепіце далі цэлую палку каўбасы за прыгажосць. А я – самая прыгожая мышка ў свеце! Чаму ж ніхто не прапануе каўбасу мне? Што ж зрабіць, каб на мяне звярнулі ўвагу?»

І ўспомніла мышка, як Веранччына Мама робіць макіяж – фарбуе павекі рознакаляровымі парашкамі, якія называюцца «цені», зачарняе вейкі тушшу, пудрыцца, намазвае вус-

ны памадай, а пасля Тата ёй кажа: «Якая ж ты ў мяне прыгожая!»

«Трэба зрабіць макіяж!» — вырашыла мышка.

Залезла мышка на пісьмовы стол, зняла з паліцы скрынку з Мамінай касметыкай і села перад люстэркам.

Больш за ўсё мышцы спадабалася памада ў прыгожым залатым футаральчыку. Пафарбавала мышка памадай нос. Ах, як прыгожа! Нафарбавала яшчэ вушы і хвосцік. Пасля Пік-Пік зачарпнула лапкай туш і нафарбавала вусы. «Гэтага мала», — падумала мышка і абвяла вочкі чорнымі кругамі.

Што б яшчэ памазаць? Адкрыла мышка Пік-Пік каробку з Маміным ценямі. Там было многа-многа рознакаляровых квадрацікаў.

«Ну, не буду ж я па адной фарбе важдацца!» — вырашыла мышка, лягла проста на цені і некалькі разоў па іх пакачалася.

Скурка ў Пік-Пік зрабілася стракатая, рознакаляровая, як вясёлка. Знайшла мышка яшчэ футаральчык з бліщчынкамі, адкрыла яго і ўсе блішчынкі на сябе высыпала!

У давяршэнне Пік-Пік зачарпнула пудры і напудрыла шчокі і лоб.

«Вось цяпер ва ўсім свеце няма нікога прыгажэйшага за мяне!» — падумала мышка і важна пайшла, задзёршы носік, паказацца ўсім.

У зале сядзеў Тата і чытаў газету. Раптам нехта перад ім сказаў: «Пі-пі!» Тата падняў вочы і ўбачыў, што на яго ідзе стракатая, бліскучая істота, з чырвонымі вушкамі, чорнымі вусамі, белымі плямамі на шчоках і доўгім чырвоным хвастом!

«Гэта іншапланецянін! – падумаў Тата. – Зраблю выгляд, што мяне няма, а то ён забярэ мяне ў лётаючую талерку!»

І Тата падціснуў ногі і схаваўся пад газету.

«Што гэта з Вераніччыным Татам?» – здзівілася мышка Пік-Пік і пашыбавала на кухню. А там сядзелі Мама, Веранічка і Пепіта і пілі цёплае малако.

І вось зайшло на кухню стракатае, бліскучае страшыдла з чырвонымі вушамі і чорнымі вусамі. Мама вырашыла ратаваць сям'ю і лінула на страшыдла сваё малако. А з другога боку на страшыдла абрынулася малако з кубачкаў Веранічкі і Пепіты. На падлозе ўтварылася вялікая белая лужына з рознакаляровымі разводамі. А ў лужыне сядзела разгубленая шэрая мышка.

Засмяяліся Мама, Веранічка і Пепіта. А мышка Пік-Пік заплакала. Яна так старалася, а тут усю прыгажосць змылі!..

Усе перасталі смяяцца, і Мама дала мышцы кавалак каўбасы, каб тая не плакала. Схапіла мышка Пік-Пік каўбасу і пабегла ў норку.

А Мама, Веранічка і Пепіта пайшлі ў залу і там убачылі пад газетай Тату.

— Што ты робіш? — здзівілася Мама.

— Тс-с-с! — сказаў Тата. — За мной прылятаў іншапланецянін. Можа, ён яшчэ шукае мяне!..

Паглядзелі Мама, Веранічка і Пепіта вакол і не знайшлі ніякага іншапланецяніна. Тады Тата згадзіўся злезці з крэсла і схаваўся пад коўдру на ложку.

А мышка Пік-Пік з'ела каўбасу і заснула, думаючы: «Я ўсё-такі самая прыгожая мышка ў свеце!»

І спала яна так моцна, што яе не разбудзіў нават роспачны крык Мамы, якая знайшла на сваім стале тое, што засталося ад яе касметыкі!

## Васіль Ткачоў

### ДАРОГА

Максімка з татам сабраліся ў суседнюю вёску – праведаць бабулю з дзядулем. Купілі гасцінцаў і раніцай пакрочылі на аўтобусны прыпынак. Селі на лаву, чакаюць. Аўтобуса ўсё няма. Можа, зламаўся? Тата, пачакаўшы трохі, прапанаваў:

– А давай, Максім, пехам пойдзем. Што нам той аўтобус!

Хлопчык насупіўся:

– Я пехам не хачу. Гэта ж няблізка. Ды і навошта тады аўтобус прыдумалі?

– Бачыш: няма яго, аўтобуса, – развёў рукамі тата.

– Лепш пачакаем, – Максімка, седзячы на лаве, боўтаў нагамі. – А то пойдзем, а ён нас дагоніць. Тады крыўдна будзе. Ішлі, ішлі, і ўсё дарэмна...

Тата не стаў пярэчыць. Сядзяць, чакаюць. І размаўляць быццам няма пра што. Усё ж тата не вытрымаў, першы ўзняўся з лавы:

– Аўтобуса, відаць, сёння не будзе. Але ж ты лянуешся ісці да дзядулі з бабуляй, то заставайся дома, а я пайду адзін. Добра?

– Не, хадзем, тата, разам, – пагадзіўся хлопчык і хуценька ўскочыў з лавы: ён ужо засумаваў па бабулі з дзядулем.

Сын і бацька, узяўшыся за рукі, крочылі па дарозе, а яна шэрай стужкай бегла і бегла наперад.

Свяціла сонейка, твары абвяваў свежы ветрык, а ў небе пырхаў жаўрук і, здавалася, радуючыся людзям, пасылаў ім з неба сваю песню.

– Гэта ён нас хваліць, што пешшу ідзём, – заўважыў тата.

Максімка памахаў жаўруку і гучна сказаў:

– Дзякуй табе, птушачка!

Прайшлі яшчэ трохі полем, і дарога нырнула ў лес. Тата запаволіў хаду, паглядзеў на сына:

– Чуеш? Гэта дзяцел тукае: тук-тук-тук! А чаму ён так тукае, ведаеш?

Максімка паціснуў плячыма:

– Забаўляецца, мусіць?

– Не, сынку: гэта ён корм сабе і сваім дзеткам здабывае. Пад карой у старых дрэў шмат розных казюрак жыве, вось ён і дастае іх. Працавітая птушка дзяцел. Ён не толькі корм здабывае – і лес ратуе ад розных караедаў.

Перад крынічкай спыніліся, напіліся халоднай, як лёд, вады. Крышачку адпачылі і пайшлі далей.

— А вунь, бачыш, ямы, — паказаў тата на акопы, што зараслі ўжо густым кустоўем. — Іх нашы салдаты ў вайну капалі, калі займалі тут абарону, каб вораг не прайшоў у нашу вёску.

— І не пусцілі? — зацікавіўся Максімка.

— І не пусцілі, — упэўнена сказаў тата. — Бачыш, наша вёска жыве... А маглі б і спаліць яе немцы. Тады і мы не жылі б тут. Трэба дзякуй сказаць салдатам.

Хлопчык ледзь чутна прашаптаў:

— Дзякуй... — і падаў тату руку: з ім нястрашна.

А потым закукавала зязюля: «Ку-ку! Ку-ку! Ку-ку!» Тата папрасіў Максімку, каб той лічыў, колькі разоў пракукуе птушка. Максімка лічыў, лічыў... і збіўся.

— Ну, і колькі ж? — спытаў тата. Хлопчык развёў рукамі, а потым знайшоўся:

— Багата разоў!

Тата ўсміхнуўся:

— Значыць, у нас з табой наперадзе яшчэ ўсё жыццё, калі зязюля накукавала нам шмат гадоў.

Амаль каля самай дарогі яны ўбачылі сунічную палянку. Ягад было столькі, што яны і самі наеліся, і для бабулі з дзядулем назбіралі.

Перад самай вёскай Максімку з татам дагнаў аўтобус. Шафёр прытармазіў, вызірнуў

з акенца і кіўнуў галавой: «Залазьце, пешаходы!»

– Дзякуй, мы ўжо прыйшлі, – адказаў яму тата.

– Матор закапрызіў, – быццам апраўдваўся шафёр перад хлопчыкам і ягоным татам. – Давялося падлячыць яго. Спазняцца больш не будзем.

І націснуў на газ. Але Максімка зусім не шкадаваў, што пешшу прыйшоў да бабулі з дзядулем. Якая, аказваецца, цікавая гэтая дарога!

## Іван Шамякін

### ХІТРУННЯ

Шасцігадовай Машы і яе старэйшаму брату Сяргею цётка пад Новы год прынесла дарагі па нашым часе падарунак – добры кулёк цукерак, самых адменных: «Мішка», «Чырвоная Шапачка», «Вавёрачка», «Крыжачок», «Грыльяж» і яшчэ нейкія, назвы якіх я і забыў ужо.

Цётка сказала:

– Хацела аддаць вашай бабулі, каб захавала да навагодняй ночы. Ды ўбачыла, як вы глядзіце на мяне з пытаннем: «А што прынесла цётка?» – і ўручаю іх вам. Але дайце абяцанне, што вы не будзеце есці іх у старым годзе. Пакладзіце пад ёлку і лічыце, што вам прынёс Дзед Мароз.

Сярожа сказаў:

– А я павешу іх на ёлку. Як яны ўпрыгожаць яе!

Цётка і бабуля ўхвалілі такую задумку:

– Малайчына, Сярожа! Убачыце, як заззяе ваша ёлка! А Машы задумка гэтая зусім не здалася прывабнай.

Ёй хацелася хутчэй пакаштаваць цукеркі – хаця б па адной кожнага гатунку. Яна такі паспела запусціць ручку сваю ў кулёк, як толькі брат адвярнуўся. Ды якая там жменька – тры цукеркі змясціліся! Яна схавала іх у кішэні сваёй сукенкі. А потым пачала падбіваць Сяргея:

– Давай жа пакаштуем хоць па адной. Можа, яны горкія.

– Яшчэ што скажаш. Хіба бываюць цукеркі горкія?

– Бываюць, калі доўга ляжаць у магазіне.

– Цяпер нічога доўга не ляжыць, – зазначыў хлопец, бо часта чуў гэта ад бабулі, ад бацькоў, цяпер, маўляў, у магазінах усё разбіраюць умомант.

Брат, выдаючы сябе за дарослага, злітаваўся над сястрой і даў ёй дзве цукеркі.

– А гэтыя вешаю! Дай іголку з ніткай. Я буду чапляць іх. Але глядзі, Маша, сарвеш з ёлкі – атрымаеш па руках. Цябе ж трэба вучыць, каб ты не была сквапнай. Ты ведаеш, які гэта грэх – быць сквапнай?

Брат умела падвешваў цукеркі на ёлку, стоячы на табурэце. Маша падавала. Але не стрымалася, каб яшчэ колькі ўпотай не сунуць у кішэню; збегала ў свой пакой і схавала ў скрынку, у якой ляжала яе любімая лялька.

Сяргей саскочыў з табурэткі, замілавана агледзеў сваю працу. Ёлка ззяла ад каляровых абгортак.

– Шкада, не хапіла на гэты бок, ад акна.

Маша цяжка ўздыхнула, шкадуючы, што не хапіла. Весела сустрэлі Новы год. Але ёлка стаяла да Ражаства Хрыстова.

Пасля Каляд бабуля сказала:

– Здымайце вашы цукеркі, а то высахнуць.

Сярожа палез здымаць. Маша затрымалася на кухні – бліжэй да бабулі.

І раптам пачуўся крык і стогн. Ці не зваліўся хлопец? Кінуліся ў пакой. Сярожа стаяў на табурэце.

– Што такое, унучак?

– Ты паглядзі, што ў гэтых цукерках?! Сухі хлеб! Ён зрываў прыгожыя абгорткі, мяў, і з іх сыпаліся крошкі сухога хлеба.

– Гэта яе работа! Яе!

– Чыя? – спытала Маша.

– Твая!

– Мая? Ну, ведаеш... За такую абразу раней выклікалі на дуэль. Ты будзеш на каленях прасіць у мяне прабачэння.

Бабуля прыкрыла хусткай рот і ледзьве стрымлівала смех.

– А хто замест цукерак напхаў хлеба?

– Можа, у магазіне.

— Хітрунння ты! Хітрунння! Каму ў магазіне гэтым займацца?

— Ёсць каму, — аўтарытэтна, з пераканаўчасцю дарослай сказала Маша.

Доўга ў доме смяяліся з гэтых цукерак. Але ніхто не вінавацціў Хітрунню. Нават Сяргей смяяўся разам з усімі. Вось такая наша Маша! Была. Пакуль не вырасла.

# Вясенні дзень год корміць

## Алесь *Бачыла*

### МАМА

Свет вялікі... Словы, словы...
Колькі іх — і не злічыць!
Толькі «мама» на ўсіх мовах
Скрозь аднолькава гучыць.

І хоць розных моў таксама
Ў цэлым свеце о-ё-ёй!..
Толькі мамы, нашы мамы,
Размаўляюць на сваёй.

Той, што змалку сэрцу блізка,
На якой зімой і ў май
Пела маці над калыскай:
«Спі, мой сынку, засынай».

Адганяла цень трывожны,
Атуляла дабратой

І спявала... Хіба ж можна
Адрачыся песні той?

Хай табе не засціць памяць
Аніякая імгла...
Калі крыўдзіў хто, ты ж маму
Клікаў... Мама ўсё магла:

Адагнаць бяду, нягоды,
Холад, немарач, адчай...
Добрым сынам будзь заўсёды
І яе не засмучай.

## *Антон Бялевіч*

### ВЯСЁЛКА НАД ПОЛЕМ

Лугам рыжым,
Полем чорным
Ды раздзетым гаем
Прабіваецца вясна к нам:
— Вас вітаю з маем!

З першым громам
Ды з вясёлкай,
З дождҗыкам вітаю.
Залатым ключом праменным
Вам я адмыкаю
З-пад ільдоў азёры, рэкі,
З-пад снягоў палеткі...

Цеплынёй вясна дыхнула —
Засінелі кветкі.

Жаўрукоў вясна сыпнула
З рукава ў блакіты.
Рукавом другім махнула —
Падскочыла жыта
На вяршок, другі і трэці
На калгасным полі.

Не было ж вясны такое,
Не было ж ніколі!

Заспявалі,
Загукалі
Лес і пералескі.
Засінелі,
Зажаўцелі
Лотаць і пралескі.
Забялелі,
Зружавелі
Яблыні і вішні.
Пад вясёлку залатую
Нашы людзі выйшлі.
А яна п’е воду з рэчкі,
З блакітнага плёса.
Як вясёлка маладая,
З гэткім ясным лёсам
Заручыліся навекі
Гарады і сёлы.
І, як сейбіт, дбайна шчасце
Сее май вясёлы!

## СОНЕЙКА ГРЭЕ

Сонейка ты, залатое!
Колькі цёмных, сумных дзён
Мы чакалі, дарагое,
У нашых хатках ля акон
Тваіх ясных цёплых косак,
Твае ласкі і пяшчот,
Што збудзілі б жыццё вёсак,
Поле, траўку, лес, чарот...
Разбудзілі б птушак хоры,
Жаб зялёных грамаду;
Растапілі б снегу горы,
Адагрэлі б і ваду...

* * *

І прыйшоў вось час жаданы:
Рады мы вясну сустрэць,
Просім сонца край каханы
Абудзіць і абагрэць.

## **В***асіль Вітка*

### ВЯЛІКДЗЕНЬ

Траўка брацца пачала.
У імша́ніку пчала
Прачнулася і гудзе:
– Хутка ўжо Вялікі дзень!

А людзі між сабою
Пацяшаюцца вярбою.
Ніхто нікога не міне́ –
Ні цябе, ні мяне.

І мяне, і цябе
Кожны дубцом сцебане́:
– Не я б'ю, вярба б'е,
За тыдзень – Вялікдзень!

– І ты, родны народ,
Будзь здароў на ўвесь год!

## *Артур Вольскі*

### УПАРТЫ СНЕГ

Лесам,
полем
красавік
ходзіць без сцяжыны.
Ажно бачыць –
снег не знік
з цёмнае лагчыны.

Красавік яму:
– Чаму
не ўцякаеш з логу?
Праляжаў усю зіму,
час ужо ў дарогу.
Дык не будзь
упарты гэткі,
цеплыні чакаюць
кветкі...

Снег не белы,
снег счарнелы,
хоць аселы,
але смелы:

– Мне па густу гэты кут
у лясах сасновых.

Праляжу спакойна тут
да завеяў новых!..

Красавік,
каб скончыць сварку,
на падмогу кліча хмарку:
– Хмарка,
хмарка,
набяжы,
снег сагнаць мне памажы!

Прыпыніла хмарка бег.
Сыпле дожджык часты.
І пабег
з лагчыны снег
ручайком блішчастым.

Красавік адразу ў смех:
– Знік нарэшце
ўпарты снег!
Ды ў адказ звінеў ручай:
– Ты зімой мяне страчай!
Я скарыцца не магу,
я да мора дабягу.
Узнімуся
з мора парай
і зраблюся
снежнай хмарай,
каб па небе,
без дарог,
зноў вярнуцца
ў гэты лог!..

## **М***іхась Даніленка*

### ГОЛАС ВЯСНЫ

Як быў я малы, тата часта ў канцы зімы казаў:

– Пойдзем, сынок, на двор, пакажу табе вясновыя слёзкі.

– Адкуль тыя слёзкі возьмуцца? – дзівіўся я. – Мароз на шыбах вунь якія ўзоры размаляваў!

– І ўсё адно вясна ўжо радаснымі слёзкамі ўмываецца. Зірні сюды.

Мы станавіліся пад застрэшак, дзе ўгравала сонца. З вострых ледзяшоў, што звісалі са стрэх, адна за другой зрываліся празрыстыя кроплі. Яны выбівалі ў снезе круглыя роўныя ямкі.

«Кап-бульк! Кап-бульк!» – усміхалася радасна вясна. І жэўжыкі-вераб'і навыперадкі стараліся пакупацца ў першай вясновай вадзе. Натапырвалі пер'е, яршыліся, аж пырскі разляталіся ад заядлых купальшчыкаў.

А мы з бацькам ішлі далей за хату, дзе пачынаўся лес, і на прыгорку, каля высокіх сосен, знаходзілі першыя жоўценькія кветачкі.

– Бач, падбелы з’явіліся. Вось яны – першыя кветкі вясны, – тлумачыў мне бацька. – Дзе зацішна і сонечна, там і шукай іх.

На парыжэлым падталым снезе поўзалі нейкія чырвоныя жучкі і даўганосыя камарыкі. Бацька казаў, што ўсе яны пачулі голас вясны.

– Прыслухайся добра. Ты таксама той голас пачуеш, – гаварыў бацька.

І я прыслухоўваўся.

Ціха шумелі сосны. Са зламанай галінкі бярозы адна за другой сцякалі на зямлю светлыя чысцюткія кропелькі. Стукаў у кару дрэва дзяцел. Не так, як зімой, а часцей: пэўна ж, прагаладаўся за зіму небарака. Упершыню пасля зімы спявалі сініцы. І нават у поўдзень у мурашніку яшчэ напаўсонныя мурашкі пачыналі варушыць вусікамі. Быццам абнюхвалі халаднаватае, але з адметнымі вясновымі пахамі паветра...

І цяпер, як трохі вышэй пачне хадзіць сонца, а прамяні яго стануць цяплейшымі, я, як некалі мне бацька, кажу свайму Сашу:

– Апранайся, сын. Пойдзем слухаць голас вясны.

## **В***асіль Жуковіч*

### ГУКАННЕ ВЯСНЫ

Свята песенькай сустракаем,
вясну весела мы гукаем:

«Жавароначкі, прыляціце,
цёпла лецейка прынясіце».

Ходзім радасна карагодам.
Выглянь, сонейка, дай пагоду!

Шчасце-долечку мы гукаем,
мы зямлю сваю адмыкаем.

«Жавароначкі, прыляціце,
зямлю-матухну абудзіце».

Жыта-жыцейка хай рунее,
кветкі-красачкі хай квітнеюць.

Свята шчырае мы сустрэлі.
Птушкі з выраю прыляцелі.

## *Клаўдзія Каліна*

### ПЕСНЯ ВЯСНЫ

Злая Зіма пасля доўгай вандроўкі падалася назад у свой край, дзе ніколі не бывае лета, дзе ўсё закута ў лёд і занесена снегам.

Яна ішла па дрымучым лесе. А следам з мяшком снегу за плячамі бегла Завея. Яе сівыя кудлы былі не прычэсаны, адзенне вісела на ёй пашарпанымі шматкамі.

– У-у-у-у! – жаласна завывала Завея. – Гэта бязлітаснае Сонца так рада Вясне, што хоча загубіць нас.

– Не выходзь на прагаліны, трымайся ценю, – сказала Зіма.

А за імі з праталінкі на праталінку бегла басаногая Вясна. На плячах у яе сядзелі дзве птушкі і весела спявалі:

> Уцякай, злы Мароз,
> Кідай санкі, бяры воз!

Там, дзе ступала Вясна, падымала галоўку блакітная кветачка пралеска. Яна выпроствала сваю зялёную ножку і цягнулася ўсе вышэй і вышэй да Сонца.

Убачыла Зіма пралеску, азірнулася і гнеўна пагразіла Вясне:

– Я замарожу твае кветкі!

Вясна ўсміхнулася, кіўнула на блакітнае неба і адказала на пагрозу:

– Паслухай, як заліваецца звонкай песняй жаваранак. Яго ты не замарозіш. А гэта мой пасланец.

Злосная Зіма закрычала што мела сілы на Вясну:

– Рана ты смяешся! Глядзі! – І дзьмухнула Зіма холадам на блакітную кветачку, а Завея страсянула галавой, заматляла сваімі кудламі і сыпнула з мяшка снегам.

Вясна знікла ў снежнай завірусе. Зіма ўзрадавалася сваёй сіле. Яна бачыла, як упалі шэранькімі камячкамі і схаваліся ў кустах жаваранкі, як паніклі і апусцілі галоўкі пралескі.

– Ха-ха-ха! – зарагатала Зіма. – Хто з нас дужэйшы? Дзе твае кветкі, Вясна? Чаму змоўк жаваранак? Я ўсё загубіла, усё памарозіла. А мая служка Завея замяла іх снегам, пахавала навекі.

Выйшла Зіма з-пад густых ялін на паляну, радасна паглядзела на засыпаную снегам зямлю і гукнула зноў:

– Прыгажуня-вясна, хто тут гаспадыня, я ці ты?

Пачула гэта ласкавае Сонца, выглянула з-за хмар і сваімі цёплымі праменнямі прай-

шлося па зямлі. Адразу падняўся ўгору жаваранак. Зноў палілася ў вышыні цудоўная песня Вясны і Сонца. Зноў падняла галоўку сіняя пралеска. Памытая снегавой вадой, яна яшчэ больш пахарашэла.

Застагнала ад лютай злосці Зіма, падхапіла Завею ды ходу далей, на поўнач.

## *Алесь Клышка*

### СЫХОД ЗІМЫ

Кропелька ляціць у лужы,
З ледзяшоў зіма сцякае.
Маразы, завеі, сцюжы
З ручаінай уцякаюць.
Хто паспеў ў рацэ схавацца,
Хто пад лёдам у азерцы,
Кожны мусіць ратавацца...
Цесна снегу у вядзерцы.
Бо яму таксама трэба
У ваду ператварыцца,
Каб затым узняцца ў неба
І на луг дажджом праліцца.
Сонца лужы прыпякае,
Як у люстэрка ў іх глядзіцца,
Куркі смагу наталяюць –
Дужа смачная вадзіца.
Хлопцу Ясіку раздолле –
Карабель свой адпускае
У струмень імклівы, вольны,
Што да мора паспяшае.
Хутка ад зімы і следу
Не пакінецца ў прыродзе.
Панавала да абеду.
– Выйшла, – кажуць у народзе.

# *Якуб Колас*

## ПЕРШЫ ГРОМ

*(урывак)*

Голасам моцы, ціха і важна
Гром пракаціўся ўгары.
Луг адазваўся грому працяжна,
Лес адгукнуўся стары.

Гай страсянуўся, дрыгнула поле,
Долы той гук паняслі.
Ў гэтым раскаце чуецца воля,
Чуецца радасць зямлі.

Ў грукаце гэтым многа ёсць сілы,
Чуецца моц і прастор...
Першыя громы! Сэрцу вы мілы,
Люб мне ваш смех паміж гор.

## КРАСКА[1]

Краска, мілая мая,
Госця веснавая!
Як ты хораша цвіцеш
У глушы, любая!

[1] *Кра́ска* – тое, што і кветка.

З ціхім усмехам з табой
Вецярок жартуе,
І цябе ў вясёлы дзень
Сонейка цалуе.

Што ж на тварыку тваім
Легла задуменне?
Што нявесела глядзіш,
Мілае стварэнне?

І не радуе цябе
Дзень вясёлы мая,
Голас радасны вясны,
Песня маладая?

Я хацеў бы адгадаць
Дум тваіх гаворку,
Я б хацеў развесяліць
Краску, маю зорку.

Што гаруеш ты аб тым,
Што і ты без волі,
Што краса ўся адцвіце
Без пары і долі?

Ці па тым, што вецярок
Разлучыў з лугамі,
Дзе б ты гутарыць магла
З пчолкамі, з чмялямі?

Я любуюся табой,
І мне смутна стане,
Што ў астрозе хараство
Усё тваё завяне.

Што адна ты адцвіцеш
Век свой сіратою, –
А багата ж адарыў
Май цябе красою!

Краска, красачка мая,
Мілае стварэнне!
Што ж на тварыку тваім
Легла задуменне?

## *Янка Купала*

### ВЯСНА

Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы,
Болей не мерзне душа ні адна,
Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.

Рэчкі бурлівыя, ўчора санлівыя,
Сёння усталі, плывуць і бурляць;
Рыбкі шмыглівыя скачуць, купаюцца,
К небу прыветна з вадзіцы глядзяць.

Пушчы паважныя, зімку праспаўшыя,
Радасна песні зайгралі свае;
Лісці зашасталі, птушкі зачыркалі,
Свішча салоўка, і дзяцел клюе.

Поле травіцаю сочнай адзелася,
Выйшла скацінка і дружна скубе,
Каля скацінкі падпасвіч з жалейкаю
Ходзіць навокал ды йграе сабе.

Грай, грай, жалеечка! Грай, грай, вясёлая!
Выйграй з вясною і долечку мне;
З пушчаю, з птушкамі, з вольнымі ветрамі
Грай мне аб шчасці, грай аб вясне!

## **М***ікола Маляўка*

# ВІШНЁВАЕ ВОБЛАЧКА

Ад квецені вішнёвай
Яснела ўсё вакол,
Як быццам з неба воблачка
Спусцілася на дол.

Пацешыліся пчолкі,
Над кронай адгулі,
І лісцікі зялёныя
Красуюць на галлі.

Здаецца, не асыпаўся
На дол апошні цвет,
А воблачка вішнёвае
Сплыло ў далёкі свет.

## Паўлюк Прануза

### РУЧАЁК

Нядаўна снег бялеў, іскрыўся,
Мільгалі лыжы і канькі,
Ды ручаёк тут нарадзіўся –
Маленькі, кволенькі такі.

Вясне і сонцу дзеці рады,
Глядзяць на стужку-ручаёк.
Мікола кажа: – Гэй, рабяты,
Я затрымаю, каб не ўцёк.

Пад смех і жарты праз хвіліну
Хлапечай спрытнаю рукой
Пясок зграбае для плаціны
І ручаю гаворыць: – Стой!

А ручаёк і не зважае
На перашкоду і далей
Сабе дарогу прабівае,
Звініць, булькоча весялей.

Бяжыць наперад і наперад.
Вось у лагчыну збег з гары,

Нясе караблікі з паперы,
Чаўны з сасновае кары.

Дужэйшым робіцца, віецца
Між вольх і маладых ракіт.
Маленькім, кволенькім здаецца,
Але праб’ецца да ракі.

## *Юрась Свірка*

### СВЯТА

Сёння ў нашай мамы свята,
Падарыў ёй кветкі тата.

Пажадаў ён любай маме
Быць заўсёды самай-самай.

І прыгожай, і шчаслівай,
І вясёлай, і руплівай.

Аж свіціцца мама наша:
Атрымаў дзясятку Саша.

Пастараўся наш Панаска:
Ён нацёр паркет да бляску.

Пахваліла мама Аду –
У пакоях скрозь парадак.

Тата сам гатуе стравы,
Ён старанны і рухавы.

Прыхінае мама кветкі:
– Дзякуй, бацька! Дзякуй, дзеткі!

Незабыўная нядзеля,
Мама як памаладзела.

І з усмешкай кажа тата:
– Падарылі маме свята.

## *Максім Танк*

### ГАЛІНКА І ВЕРАБЕЙ

– Галінка-вярбінка, –
Прасіў верабей, –
Мо пакалыхала б
Маіх ты дзяцей?

Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.

– Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!

Казулі не хочуць.

– Ідзіце, ваўкі,
Лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць.

Ваўкі не схацелі.

– Прыходзьце, стральцы,
Каб непаслухмяных

Ваўкоў правучыць,
Якія не хочуць
Казуляў караць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць...

Пайшлі паляўнічыя
Ў лес на ваўкоў:
Спалохана зверы
Пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў
Лавіць і караць;
Казулі пабеглі
Галінку ламаць,
Галінка ж вярбінка
Са страху хутчэй
Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.

З тых дзён без спачынку,
Каб кожны быў рад,
Калыша галінка
Малых птушанят.

## ІРЫНКА

Ірынцы спадабалася
Цудоўная вясна.
Як восені даждалася,
Пайшла прасіць яна,

Прасіць нябёс не хмарыцца,
Вятроў — не галасіць,
Срабрыстых росаў раніцай
На травах не гасіць;

Каб сонейка высокае
Свяціла на палі,
А кветкі сінявокія
Зноў на лугах цвілі;

Прасіць сям'ю крылатую
З лясоў не адлятаць,
Бярозку расахатую
Лістоў не атрасаць...

Прасіла яна шчыра так,
Прасіла ўсю зіму,
І мо вясна аж з выраю
Вярнулася таму.

Вярнулася, пяе ізноў
З бярозкай над ракой,
Пяе сярод дуброў, лугоў
З Ірынкаю малой.

## САДЗІЦЕ ЛЯСЫ!

Садзіце лясы!
Садзіце лясы
Ва ўсе гадавіны,
Прыгоды, часы!

І саджанцам,
Як немаўлятам, зялёным
Давайце на хрэсьбінах
Гэтых імёны –

Імёны сваіх
Незабыўных бацькоў,
Імёны каханых,
Імёны сяброў.

Імёны падзей,
Што палаюць зарою,
Імёны авеяных
Славай герояў

І рознапляменных
Народаў, дзяцей,
Імёны сузор'яў
І нашых надзей.

Каб дрэвы і ранняй,
І позняй парой
Заўсёды шумелі
Над мірнай зямлёй.

## Кастусь Цвірка

### КОЦІКІ

За вёскай, ля балоцінкі,
Ў галлі вярбы старой,
Маленечкія коцікі
Хаваліся зімой.

Мялі наўкол мяцеліцы,
Гулі ў кустах пустых,
Ды коцікі ў аселіцы
Не чулі нават іх.

Салодка спалі ў коўдрачках,
Чакаючы вясну.
Прыгрэла сонца шчодрае –
Збудзіліся ад сну.

Паскідвалі ўсе чысценька
Адзежыны з сябе
І, жоўтыя, пушыстыя,
Паселі на вярбе.

## Ц*ётка*

### ГУТАРКІ АБ ПТУШКАХ

### (Жаваранак)

Сцюдзёна яшчэ малым дзеткам у хаце: большую палову дня жэўжыкі шыюць каля печы. Праўда, дзед штодня цешыць унукаў, быццам вясна ўжо блізка, што вось-вось ужо за гэтым лесам вялікім, што за рэчкай стаіць.

– Ужо прыйшла б, – кажа дзед, – але надта змучылася, ідучы здалёку, дык прылягла крыху на прыгорку і адпачывае.

– А як, дзядок, вясна выглядае? Да каго падобна? – дапытваюцца зацікаўленыя ўнукі.

– А такая маладая, пекная паненка ў зялёнай сукенцы; таваркі яе – розныя кветкі, пакорныя служкі – галасістыя птушкі. Ось, хутка прышле да нас некаторых з іх, прымерам, – жаваранка-песняра і кветку-пралесачку.

– А калі ж, дзедулёк, жаваранак прыляціць?

– А тады, як вы, жэўжыкі, па тры боханы хлеба з'ясцё.

– Дзедка, то мы будзем завіхацца.

— Вядома, завіхайцеся: на зарок не адкладайце.

«Але, мусіць, то дзед жартуе, — думаюць дзеці, — бо якая тут вясна ідзе, калі дзед апранаецца ў кажух, на рукі пхне суконныя рукавіцы».

Нездарма сямілетні Юзюк, учарэпіўшыся дзеду за шыю, пытае:

— Ты, дзядуля, мусіць, апрануўся так цёпла, каб зіму хутчэй спудзіць?

— Э-э, будзеш і ты, жэўжык, калісьці таксама на старасць цёпла ўхутвацца, як і твой дзед, а цяпер адчапіся ад маёй шыі, бо ты ж не званок, а я не конь!

— Але затое ж я твой унучак, — бойка адказвае Юзюк, — і як прычаплюся да тваёй, дзедулёк, шыі, то так прырасту, як барадаўка да крывога носа.

— Ой, Божа мяне крый ад такога гумзака, як ты, Юзючок!

— Ну, то купі мне боты, дзедулёк.

— Што-о? Боты?

— Але боты такія, як у музыкі Банадыся.

— Ох, які ты здагадлівы, унучак! Вясна, як піць даць, стане на дварэ, мо ўжо жаваранкі заўтра запяюць, а ты ботаў захацеў.

— Дзядуля, дзедулёк, купі, купі, — ужо хліпаючы, прыстае ўнук.

– Цыц, дзіцятка! Утры нос і перастаць хліпаць, як будзеш добры, паслухмяны, то мо жаваранак сам здагадаецца і прынясе табе боты.

– І мне, мне! – свіргоча дзіцячая драбяза.

Марыля, Настка, Казюк чапляюцца за калені дзеда.

А дзед ходзіць па хаце, як стары баравік паміж сыраежкамі.

– Дзядуля! Як той жаваранак прыляціць, то няхай мне хустачку прынясе чырвоную, – просіць Марыля.

– А мне – дудку і коніка, – ласіцца Казюк.

– Добра, дзеткі, добра, зараз выйду на падворак і гукну, каб усё маім унучкам малым жаваранак папрыносіў.

Дзед выходзіць скаціне даваць. Дзеці гуляюць па хаце і чакаюць яго. Дзед варочаецца:

– А што, дзядулю, ці сказаў жаваранку?

– Не, дзеткі, жаваранка я і не бачыў, бо толькі выходжу з хаты, манюся яму загадаць, ажно мароз, такі сівы, з вялікай, доўгай барадой, – цап мяне за рукі: «Не смей, – кажа, – клікаць жаваранка, абудзіш вясну, і зараз маю ўсю работу папсуе гэта нягодная баба. А ў мяне цяпер, – кажа, – найважнейшая справа ідзе: мост будую цераз вашу рэчку». – «А што мне за дзела да твайго мо-

ста, – адказваю, узлаваўшыся, – мне мае ўнукі бліжэйшыя, я для іх хачу жаваранка клікнуць». – «Ціха, пачакай, – кажа мароз, – я тваім унукам лепшых цацак пекных нарысую на вокнах, а жаваранак няхай яшчэ пасядзіць за морам».

– Дзедулёк! То жаваранак за морам? Раскажы нам, дзе ён?

– Раскажу пасля, цяпер не маю часу: трэба дровы на вячэру сеч. А вы, дзеткі, пакуль што пагуляйце, маткі слухайце, старшыя малодшых не крыўдзіце, а я зараз вярнуся.

На дварэ сцяплела. Вада са стрэх капае. На полі лысеюць прataліны. Дзе якое дзіцянё вырвецца з хаты, шмыргае босае па вуліцы. Вераб'і юшкаюцца на сметніку. Слонка бліжэй глядзіць з неба. Дзед, чутно здалёку, шкулдыкае ў вялікіх ботах: шлэмб, шлэмб. Перад дзедам ляціць Юзюк: крычыць, пішчыць, рукамі, нагамі выкідвае, галавой круціць, усё роўна як той жарэбчык-пярэзімак, сарваўшыся з прывязі.

– Жаваранак! Жаваранак прыляцеў! – крычыць.

– Ціха, не вый! Усё роўна што жару ў горла нахапаў, – сцішае маці, высунуўшы галаву праз дзверы.

Дзеці меншыя, як мышы, каторае бокам, каторае скокам, выкульваюцца ў сені.

— Пайшлі дахаты. Перамерзнеце, хварэць будзеце, бахуры, — маці ўпіхае дзяцей у хату. Крык і піск.

— Унучаткі, рыбачкі мілыя, — загоджваючы справу, адзываецца дзед, — чаго плачаце?

— Жаваранка хочам убачыць!

— Пакажу, жэўжыкі, пакажу, толькі слухайце маткі і сыпце ў хату, акно вам адчыню. Паволі лезьце, дзеці, на лаву, не папіхайцеся. Юзюк! Не штурхай Казюка. Пачакай, Марылька, я цябе падсаджу. Ну, ціха цяпер, дзеці, слухайце.

— Пяе! Во! — Казюк паднімае ўгару пальчык, — ціры, ціры, ці-і-ір, цір, цір... Ай, як пяе!

Як ад іскры, загараюцца тварыкі дзетак. У дзеда свецяць вочы, мо залатыя дукаты.

— Птуль мой, даўно жданы, — шэпча старавіна, — будзіш народ да працы, звоніш над нашым краем...

— Дзедулёк, во, во — ужо над нашай хатай пяе... чуеш, дзедулёк?

— Чую. Ужо чацвёрты год, як усё той самы да нас прылятае. Але годзе, дзеткі, надта холад верне ў хату, трэба акно зачыніць.

— Яшчэ, яшчэ, дзедулёчак, хочам паслухаць хоць крышку...

— Годзе, унукі, годзе: лепш я вам раскажу аб жаваранку, толькі адыдзіце ад акна.

— Але, але! Раскажы нам шмат, шмат...

— Гэта, дзеткі, залежыць ад вас: будзеце сядзець ціха – раскажу вам больш, а пачнеце выкручвацца – скажу менш. А цяпер – гыля ад акна!

— Дзядуля, ужо мы ціха седзімо... чакаем...

— Зараз, зараз, вазьму толькі плашкі, лучыны нашчапаю.

Стары дзед сядае, дзярэ лучыну, а дзеткі, збіўшыся ў кучку, ужо і губкі разінулі.

— Ось, слухайце, унучкі. Жаваранак – невялічкая, як ведаеце, птушачка з чорнымі жвавымі вочкамі, сама шэранькая, зямліста-бурага колеру, дык пёрачкі падыходзяць якраз пад колер зямлі, так што здалёку, калі жаваранак сядзіць на зямлі, то трудна і прыкмеціць, а гэта шмат яго бароніць ад напасці; бо трэба вам ведаць, дзеткі, што жаваранак мае шмат ворагаў, ой, шмат, а найгоршы паміж іх – гэта добра вам знаёмы... ну, жэўжыкі, каторы з вас першы згадае?

— Сабака!

— У-га! Якраз стрэчны брат яго. Адгадвайце яшчэ.

— Воўк! Воўк!

— І не ён.

— Ну то і не ведаем! Хто, дзедулёк, хто?

– О-ёй, унучкі, добра толькі падумайце, я вам памагу: вусаты, на кілбасы ласы, на прыпечак сядзе – мыецца...

– Кот! Кот!

– Так – ён, гад, шмат марнуе жаваранкаў. Цягаецца, шэльма, па полі, а як жаваранак прыкурне на раллі, кот падгледзіць, падкрадзецца: цап-лап, хмурлык – і птушачкі як не было. Дрэнна, што жаваранак аблюбаваў весціся па нізкіх месцах, бо дзеля гэтага яго можа з'есці і крот, і мыш, і лісіца, і шмат іншых звяркоў і звяроў; угары – у лёце – жаваранка ловяць меншыя і большыя каршуны. Хоць і губяць жаваранкаў розныя ворагі, аднак ён не хаваецца: больш, чым жыццё, міла яму свабода, дык жыве на прасторы, пяе людзям на ўцеху, а ворагам на прыманку.

Для гнязда свайго выбірае жаваранак заўсёды ў адной і той самай ваколіцы роўнае, адкрытае месца: сенажаць, папар або жытнюю ніву, выкашкае там сабе ямачку пад каменьчыкам ці грудкай зямліцы, назносіць туды саломінак, сухой траўкі, саўе гняздо, акругліць яго. А каб было аздабней і цяплей у хатцы, то яшчэ высцеліць усярэдзіне конскім валоссем. Віць гняздо жаваранку памагае і жаваранчыха, а як ужо пабудуюць яго, тады яна пачынае несці маленькія зеленаватыя або чырванаватыя з бурымі кра-

пінкамі яечкі. Нанясе іх штук чатыры-пяць і садзіцца на пятнаццаць дзён, але час ад часу падмяняе сядуху сам жаваранак. Як выйдуць дзеткі, крыху падгадаваўшы, вучаць іх бегаць і лётаць, а пасля і пушчаюць у свет. Але пакуль далей расказваць, закуру перш люльку, а вы, унучкі, пабегайце тым часам, ножкі папрастуйце.

— Ну, пабрыкалі, і годзе, сядайце, будзем гутарыць далей. Як толькі бацькі-жаваранкі пераканаюцца, што іх дзеткі ўжо розуму набраліся і самі сабе могуць даць рады на свеце, пачынаюць закладваць другую сямейку, падчысцяць, падправяць гнёздачка, самка накладзе туды зноў чатыры-пяць яечак, супольна — па чародцы — грэюць іх, ажно пакуль зноў не пакажуцца голенькія, брыдкія, з вялікімі галоўкамі, сляпыя, мала чаго большыя ад добрай бабіны, дзеткі. Пачынаецца новы клопат: трэба ж кожнае ў пару накарміць, зважаючы, каб аднаму не было многа, другому мала, ды пасцельку даглядаць, каб заўсёды была ў парадку і чыстасці, ды ад ворагаў — колькі змога і сіла — бараніць сваю сямейку, словам, гультаяваць некалі; але ў іх мамка на татку, татка на мамку не здаюцца, каб усё ў парадку было, абаім трэба добра завіхацца, затое і дзеткі хутка і здорава растуць. Праз некалькі тыдняў глядзі — бацькам

палягчэнне ўжо ў працы ёсць: павыскаквае моладзь з гнязда, куды ў каторы бок параспаўзаюцца ды самі сабе ўжо стараюцца харчоў. Спачатку, праўда, туга ідзе праца: угледзеўшы, напрыклад, дзе якую мушку ці кузюрку, здаецца, і добра прырыхтуецца, як мае быць прыцэліцца, носікам – дзюб, – мошка паляцела, а сам паляўнічы ляжыць дагары і ножкамі перабірае. Ну, але гэта байкі – чаго на свеце не бывае, – страпянецца ды зноў за работу.

Падкачаюцца гэтак дзеткі і пайшлі сабе ў свет, а старыя тым часам, калі восень добрая і цёплая, яшчэ справяцца і трэцюю сямейку выгадаваць, абы яды хапала.

– Дзедулёк, а куды ж жаваранкі на зіму адлятаюць?

– За мора, дзеткі, за мора, у цёплы край, дзе зімы няма...

– То і там яны, дзедулёк, гнёздачкі робяць і гадуюць дзетак?

– Не, жэўжыкі мае, не. Голад і холад толькі заганяюць жаваранкаў у тую цёплую, багатую і пекную краіну; але як бы яна ні была пекная, а для жаваранкаў яна сумная, бо чужая. Там яны не толькі не гадуюць дзетак, але нават песенькі сваёй залацістай чужынцам не пяюць, свой галасок, усю сілу яго для

нас з вамі, жэўжыкі, пакідаюць, для свайго роднага краю.

Затое паслухайце жаваранка тут: які голас, голас! Проста сляза Божая! Хоць, праўду кажучы, не ўсе яны аднолькава пяюць, — от, не раўнуючы, як у людзей: адзін цягне грубей, другі — цяней.

Ось, напрыклад, жаваранак, што сягоння пеў, — гэта сярэдняй рукі спявака, а той, што на Мацеевых гонях вядзецца, — проста перлы сыпле з-пад сінявы нябеснай. І як толькі яны вытрываць могуць столькі пець, бо трэба ведаць, што жаваранкі спяць толькі гадзіны дзве-тры, а рэшта праз увесь час найбольш песнямі забаўляюцца. Пяюць толькі жаваранкі-самцы, а жаваранчыхі — вядома, гаспадыні — усялякія хатнія клопаты маюць, ім не да таго.

Каб не жаваранкі, нашыя палеткі шмат гінулі б ад усялякага паскудства: нападаюць на наша поле ўсялякія жучкі, мошкі, кузюркі, рабакі, але дзе ўжо завядзецца сямейка жаваранкаў, там у блізкасці гэтаму паскудству няма жыцця: выткнуў рабак нос — смерць, прысела мошка на кветачку — капут, жучок узлез колас глуміць — квіта.

Апошні раз усё гэта падчысцяць каля сябе жаваранкі, дык пасля прыходзіцца ўжо і далей лётаць за пажывай. Ну, але як прыцісне

холад, тады ўжо рады няма – трэба выбірацца з роднай старонкі...

Слухаючы, як жаваранкі ад святла да змяркання ажно заходзяцца, пеючы свае песні, хто б падумаў, што ім заўсёды добра і весела жывецца. Тым часам бывае ўсяк. Апроч бяды ад ворагаў, аб якіх я ўжо спамінаў вам, дзеткі, жаваранкі яшчэ і паміж сабою не заўсёды складна жывуць. Праўда, жаваранак з жаваранчыхай, калі ўжо дабяруцца да пары, то праз усё жыццё сваё разам трымаюцца, і ніколі паміж імі нават сваркі не бывае, але з іншымі – суседзямі – то часам так сварацца, ажно чупрыны кураць. Прычыны да звадкі розныя бываюць, вядома, як у суседстве: то за месца на гняздо, то за яду, а найбольш, калі часам жаваранчыха дзе згіне, а застанецца толькі сам жаваранак. Такому ўдаўцу, разумеецца, жыць сумна – няма куды прытуліцца, вось і стараецца ён усялякімі спосабамі як-колечы прыснасціцца да суседняга гнязда; але гэткай помачы не патрабуюць, гаспадар і гаспадыня няпрошанаму госцю так усыплюць, ажно пёркі ляцяць.

Туляецца гэтакі ўдавец без работы з месца на месца, пакуль не трапіць на жаваранчыху-ўдаву, да каторай з радасцю ідзе ў прымакі...

Ну, але што гэта, бахуры, заўзяліся вы дзеда мучыць, ці што? Цьфу! Ажно ў горле перасохла. Што я вам – млын ці дзед? Хоць бы вы жавараначка любілі, але дзе ж вашым гарбузіным галоўкам зразумець такую рэч...

– А я зразумеў, – круцячы галоўкай, пахваляецца Юзюк.

– Што ты, шпунт, зразумеў?

– А тое, што жаваранак вельмі карысная птушачка: яна нам пяе і шкоднікаў нашых ніў паядае.

– Маладзец! За гэта я цябе на печ, Юзюк, закіну.

– Не, не ўздужаеш, дзедулёк, не ўздужаеш, – падхопліваюць грамадой усе дзеці і чапляюцца дзеду на шыю.

– Ну, ну, толькі не ўсе разам, а то ў дзеда галава сухая: адкруціце яе, як даспеўшую макаўку, і ўсе казкі высыплюцца.

## *Уладзімір Ягоўдзік*

# ВЯЛІКАЯ СІНІЦА І ЯЕ СЯСТРЫЦЫ

Гэтую невялічкую жвавую птушку ўсе добра ведаюць. Цёмная шапачка на галоўцы, белыя шчочкі, на жоўтым жывоціку – чорны гальштук. Яе звонкі бадзёры галасок чуваць здалёк:

– Ці-ці-ці... Пінь-пінь!.. Ці-ці-сі-і... Пінь-пінь!..

Вялікая сініца – найбольшая і самая адважная сярод сваіх сястрыц, якія жывуць у нашых лясах і парках. Іх цэлая сямейка – ажно дзесяць прыгажунь! Я назаву кожную, каб ніводную не пакрыўдзіць.

Белая сініца-князёк гняздзіцца толькі на Палессі, а сіняя – ахвотна гаспадарыць у гарадскіх парках і скверах.

Па берагах рэк і азёр, у зарасцях трыснягу і чароту можна ўбачыць вусатую сініцу, а ў хваёвых лясах – чубатую.

Па суседстве з імі жывуць даўгахвостыя сініцы-апалоўнікі і самая маленькая з сясцёр – сініца-маскоўка.

Ёсць яшчэ падобныя адна да адной як дзве кроплі вады сяброўкі: сівая сініца і бурагаловая сініца.

Усе гэтыя сястрыцы сустракаюцца ў Беларусі круглы год. У вырай адлятае толькі славуты будаўнік рэмез. Сваё гняздо ён будуе ў выглядзе мяккай рукавічкі, якую падвешвае на галінку дрэва. Вецер гайдае галінку і бясплатна люляе рэмезавых птушанят.

Каб пасябраваць з сініцамі, трэба зімой насыпаць у кармушку сланечнікавых семак. Сюды хутка наведаецца вялікая сініца. Яна пакаштуе семкі і запросіць сяброўак. Потым прыляціць сіняя сініца з блакітнай шапачкай на галаве. Калі ласунак спадабаецца, яна пакліча бурагаловую сініцу...

А назаўтра – смела адпраўляйцеся ў вандроўку, каб пазнаёміцца з астатнімі сястрыцамі. Яны пакажуць вам рэмезаву рукавічку, але наўрад ці вы зможаце яе надзець.

## ДВА БРАТЫ-ВЕРАБ'І

За акном – сонечны зімовы ранак. Навокал у казачнай шэрані стаяць здранцвелыя дрэвы. Выбежыш на вуліцу – шчокі апячэ калючы злюка-мароз. Міжволі схаваеш нос у каўнер. А яны сядзяць на галінках вішні ці рабіны, як пушыстыя камячкі, і бадзёра крычаць на ўвесь двор:

– Ціў-ціў!.. Жыў-жыў!.. Ціў-ціў!.. Жыў-жыў!..

Ну як не пачаставаць такіх герояў хлебнымі крошкамі ці семкамі сланечніку?!

З усёй птушынай сям'і — гэта самыя блізкія нашы суседзі. Яны заўсёды селяцца побач з людзьмі, а гняздзяцца пад стрэхамі ці ў шчылінах будынкаў. Таму іх называюць дамавымі вераб'ямі.

«Старога вераб'я на мякіне не правядзеш», — сцвярджае народная прымаўка. Сапраўды, дамавыя вераб'і асцярожныя і кемлівыя птушкі. Апроч таго, вялікія чысцёхі, бо круглы год любяць купацца ў лужынах або ў пяску. Некаторыя гаспадары лічаць, што вераб'і — нахлебнікі і шкоднікі, спусташаюць агароды і сады. Але ўсё якраз наадварот — гэта шчырыя нашы прыяцелі. Вясной і летам, калі кормяць сваіх птушанят, яны знішчаюць пражэрлівых вусеняў і мноства іншых насякомых.

Арнітолагі б'юць трывогу: за апошнія дваццаць гадоў колькасць дамавых вераб'ёў у Беларусі зменшылася больш як напалову. Значыць, невыпадкова грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» назвала нашага крылатага суседа птушкай 2003 года.

У дамавых вераб'ёў ёсць родныя браты — палявыя вераб'і. Яны таксама жывуць на вясковых вуліцах і ў гарадскіх дварах. Як адрозніць паміж сабой гэтых блізкіх родзічаў? А вельмі проста: у палявых вераб'ёў на шчочках здалёк відаць чорныя плямкі.

# Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць

## *Эдзі Агняцвет*

### САЎКА ЗА СТАЛОМ

Ляжаць ля талеркі відэлец і нож.
Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.
— Ну і што ж?
Ляжаць — хай ляжаць, іх не буду чапаць.
Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.

З талеркі ён сёрбае крупнік — ой-ой!
Кавалачак мяса хапае рукой.
Ён з пальцамі лезе ў гарачы кампот,
Абрусам ён выцер і шчокі і рот.

Пасля на талерку падручнік паклаў —
І кнігу карміў ён аб'едкамі страў...

Відэлец не ўцерпеў:
— За цэлы мой век
Мне трапіўся першы такі чалавек!

Ускочыла лыжка і ну рагатаць:
– Хі-хі, ха-ха-ха, ён дурненькі, відаць!

А нож узлаваўся і тупнуў нагой:
– Давайце паслужым мы справе другой!
Пакінем яго аднаго за сталом,
А самі запішамся ў ме-та-ла-лом!

Саскочылі разам яны са стала –
Ніякая сіла спыніць не магла.
Відэлец, і лыжка, і нож – ля дзвярэй.
Збянтэжыўся Саўка:
– Чакайце, э-гей!

А тыя ляцяць, азірнуцца не хочуць.
– Хі-хі, ха-ха-ха! – толькі лыжкі рагочуць.
Бяжыць недарэка з пустымі рукамі...
Чым скончыцца ўсё?
Вы прыдумайце самі.

## *Анатоль Астрэйка*

### РАЗМОВА АБ ПРАФЕСІЯХ

Раз сышліся на двары
Юныя рамеснікі
І пачалі гаварыць
Аб сваіх прафесіях:
Што каштоўней, што важней
Для краіны і людзей.

– Я шліфую, я тачу
Рэчы далікатныя,
Справу токара лічу
Самаю выдатнаю.
Нават трактар без мяне
Кола з месца не скране.

– Муляр з цэглы дом кладзе,
Сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
Працы больш шаноўнае.
Дзе ні вуліца, ні пляц,
Як паглядзіш – мой палац.

– Што ты нам ні гавары –
Вушы не развешу я,
Я за слесара, сябры,

Вось дзе дык прафесія.
Ні замок, ні нож, ні крук
Без маіх не зробіш рук.

— За варштатам я стаю,
Тку адменнай пражаю,
Я прафесію сваю
Лічу самай важнаю.
Апранаю я народ
У бастон і каверкот.

— Ты залішняе ўзяла,
Пасмяшыла жартамі,
А сякера, а піла
Нікуды не вартыя?
Без сякеры, без пілы
Не зрабіць і чапялы.

— А вось справа швейная
Самая надзейная:
Абыходзіць голка свет,
Кожны голкаю адзет.

— А шавец? Браток, уваж!
Чым жа не выдатны я?
Вы без ботаў, без гамаш
Ні на што не здатныя:
А ў абутку — любата,
Ці мароз, ці хлюпата.

– Дайце слова, мне пара,
Марна вокал ходзіце,
Лепшай, чым у друкара,
Працы вы не знойдзеце.
Без кніжок ды без газет
Не абходзіцца ўвесь свет.

Слаўны наш савецкі край,
Моладзі жыць весела,
Ты любую выбірай
Сам сабе прафесію:
Навучайся і працуй,
Толькі сілы не шкадуй.

## *Ядвіга Бяганская*

### СЛАНЕЧНІКІ

Жэнік увесь дзень чым-небудзь заняты. То ён дапамагае маме і бабулі на кухні, то разам з братам майструе што-небудзь, то з дзедам у садзе корпаецца.

– Гультаям сумна жыць на свеце, – часта кажа бабуля.

І гэта праўда. Жэня сам ведае: варта яму нейкі час застацца без работы, і адразу робіцца сумна. Тады ён пачынае хадзіць з пакоя ў пакой і надакучаць:

– Ну дайце мне якую-небудзь работу! Ну што мне рабіць?

І, баючыся, каб мама не сказала заняцца кубікамі або якой-небудзь гульнёй, ён тут жа дадае:

– Я хачу табе дапамагаць.

А дапамагаць ён любіў. Ды гэта і зразумела: дапамагаючы дарослым, можна даведацца столькі цікавага!

Увесну, калі бабуля з мамай рабілі градкі, Жэнік пачаў прасіць:

– Бабулька, я хачу зрабіць сабе градку. Можна, бабуля?

Ну як тут не дазволіць хлопчыку, калі ён так просіцца, так ласкава зазірае ў вочы?

Хутка ў Жэніка з'явіліся і рыдлёўка, і граблі, і палівачка. Рыдлёўку і палівачку мама купіла ў магазіне, а граблі зрабіў сам дзед.

Градку дапамагаў капаць старэйшы брат, Уладзік. Хлопчыкі слухаліся бабулю і стараліся рабіць усё так, як раіла яна.

Калі градка была гатова, пачалася сяўба.

Жэніку хацелася, каб на яго градцы было ўсё, што сеяла бабуля на вялікіх градах. Але, параіўшыся, браты вырашылі, што для ўсяго не хопіць месца, і таму пасеялі толькі салодкі гарошак, моркву, рэпку і мак. А па краях градкі пасадзілі сланечнікі.

Першым на градцы ўзышоў гарох. Следам за ім вылезлі з зямлі сланечнікі, за сланечнікам – рэпка, морква і мак.

Хлопчыкі вельмі старанна даглядалі свае пасевы. Асабліва Жэнік. Уладзік, дык той, бывала, пойдзе з сябрамі рыбу лавіць або суніцы збіраць і забудзецца на градку. А Жэнік увесь дзень ля яе пахаджвае: то пустазеліну якую вырве, то яшчэ раз палье раслінкі.

– Паглядзі, Уладзік, як няроўна яны растуць, – сказаў аднойчы Жэнік. – Рэпка з морквaю растуць паволі, а гарох, мак і сланечнік вунь якія ўжо.

— Яны, відаць, навыперадкі стараюцца — хто каго абгоніць, — пажартаваў Уладзік.

Зацвіў нарэшце на градцы вусаты гарох, а неўзабаве распусціліся белыя і ружовыя макі. Над кветкамі з ранку да вечара лялі матылькі, весела гулі працавітыя залатыя пчолкі. Жэнік з цікавасцю назіраў, як пчолы залазілі глыбока ў кветачкі і, усміхаючыся, падганяў іх:

— Спяшайцеся, спяшайцеся, бо хутка зойдзе сонца і кветкі заплюшчаць на ноч свае вочкі.

Але больш за ўсё хлопчыку падабаліся сланечнікі. Яны так спяшаліся расці, што хутка перараслі самога Жэніка.

— Яны ўсіх перарастуць, — казала бабуля.

— І маму? — недаверліва пытаўся хлопчык.

— І маму і тату, — усміхалася бабуля.

Мінуў некаторы час, і Жэнік сам пераканаўся, што бабуля гаварыла праўду.

— Тата стань побач з маім сланечнікам, — папрасіў аднаго разу Жэнік.

Тата падышоў да сланечніка. І што ж вы думаеце? Сланечнік быў куды вышэйшы за тату!

— Хутка яны да самага неба дарастуць, — смяяўся Уладзік.

Да неба сланечнікі, вядома, не дацягнуліся, але выраслі высачэзныя. А потым зацвілі.

Кветкі ў іх былі ярка-жоўтыя і, мусіць, большыя за татаў саламяны капялюш.

— А ведаеце, унучкі, чаму яны сланечнікамі называюцца? — сказала аднойчы бабуля.

— Чаму? — у адзін голас запыталі браты.

— Бо яны самі, нібы сонца. Бачыце, якія агністыя іх прамені-пялёсткі. І няўжо вы дагэтуль не заўважылі, што сланечнік заўсёды паварочвае свой тварык да сонца.

Непрыкметна мінула квяцістае цёплае лета. На гародзе ўсё пачало даспяваць. Даспелі і Жэневы сланечнікі. І тады на градку пачалі прылятаць вераб'і. Яны зляталіся цэлымі чародкамі, садзіліся на сланечнікі і спрытна выдзёўбвалі з іх пукатыя буйныя зярняты. Але хлопчыкі не крыўдзіліся на птушак. На кожным сланечніку была такая безліч зярнят, што іх хапіла і птушкам, і Уладзіку, і Жэніку з сябрамі.

А самы вялікі сланечнік хлопчыкі занеслі на школьную выстаўку. Ён яшчэ і цяпер там красуецца.

## **В***асіль Вітка*

### ХТО ШТО РОБІЦЬ

Даглядае пчол пчаляр,
Стол майструе сталяр,
Шыбы ў вокны ставіць шкляр,
Беліць сцены маляр,
Чысціць комін камінар,
Сыры варыць сыравар,
Ну а цукар – цукравар.

З футра выкраіў каўнер
Мне на паліто кушнер,
Боты мне пашыў шавец,
Новыя штаны – кравец,
Цацку з дрэва майстры
Выразалі – разьбяры.
Цяпер сам разбяры,
А што робяць ганчары,
Бандары, цесляры,
Муляры, млынары,
Дактары, друкары?
Хто даглядае трактары,
А хто коней на стайні,
А хто вучыць нас?

## *Артур Вольскі*

### АД А ДА Я ПРАФЕСІЯ МАЯ

Хто працуе на сяле
шчыра і заўзята,
каб было ў нас на стале
усяго багата?
Каб у радасці цвіла
з году ў год няспынна
і магутнаю была
родная краіна?
Пра гэта вам
ад А да Я
раскажа
азбука мая.

АГРАНОМА, як вядома,
не застаць вясною дома.
Аглядае поле ён,
каб дало багаты плён.

БУЛЬБАВОД, бульбавод –
у турботах круглы год.
А інакш, скажы, адкуль бы
мелі б мы удосталь бульбы?

У вёсцы ўрач ВЕТЭРЫНАРНЫ
таксама час не траціць марна –
і ўдзень гатовы і ўначы
жывёле хворай памагчы.

ГАНЧАР – сапраўдны чараўнік.
Ён гліны ўзяў камяк,
і вось збанок на крузе ўзнік,
а потым – круглы гляк.

Нельга сельскай гаспадаркі
уявіць нам без ДАЯРКІ,
хоць даўно ужо звычная
дойка электрычная.

Лістота апала пад ветрам асеннім,
і ЕГЕР участак абходзіць лясны,
глядзіць, каб хапіла ласям і аленям,
дзікам і казулям кармоў да вясны.

ЖЫВЁЛАВОД глядзіць жывёлу,
і вынік працы ўсім відзён:
бычок маленькі быў і кволы,
а сёння з цэнтнер важыць ён.

ЗААТЭХНІК – кнігу ў рукі,
у яго такі занятак:
па ўсіх правілах навукі
развіваць калгасны статак.

Калгасу кожнаму цяпер
патрэбен вельмі ІНЖЫНЕР,
бо без яго тэхнічных ведаў
калгас бы поспехаў не ведаў.

КАВАЛЬ хоць і не гне падковы,
ды робіць людзям шмат паслуг.
Ён змайстраваць дэталь гатовы,
наладзіць барану ці плуг.

Шумець, расці маладняку,
дзе бор стары адчуў знямогу...
І лес удзячны ЛЕСНІКУ
за клопат і за дапамогу.

Плывуць камбайны — «Колас», «Ніва»,
за імі ў жыцце — чысты след.
МЕХАНІЗАТАРЫ да жніва
падрыхтавалі іх як след.

НАСТАЎНІК вучыць нас і ў школе
і па-за школай вучыць нас,
каб мы любілі ферму, поле,
каб шанавалі свой калгас.

Горды я і тата горды,
бо пачулі сёння ўказ:
атрымае днямі ОРДЭН
наш праслаўлены калгас.

З калгаса ў горад з кожным
ідзе ўсё болей бочак з мёдам.
А даглядае пчол ПЧАЛЯР,
іх друг і рупны гаспадар.

Знае ўсё РАХУНКАВОД –
дзе даход, а дзе расход.
Лічыць з ім рублі і тоны
калькулятар электронны.

Вырас дом, прыгожы самы.
Ад зары – у войнах жар.
Хто рабіў для вокнаў рамы,
дзверы хто рабіў? СТАЛЯР.

Ён арэ, скародзіць, сее
і камбайн вадзіць умее.
На сяле таму ўсе чыста
паважаюць ТРАКТАРЫСТА.

УЧОТЧЫК строгі ўлік вядзе,
кім колькі зроблена і дзе.
Работы не цураецца –
з усімі сам стараецца.

Як толькі ўбачыш ФУРАЖЫРА,
дык адчыняй вароты шырай.
На ферму ён кармы вязе,
каб свінні большалі ў вазе.

Чорны, белы хлеб ці здобу
еш, але не забывай
быць удзячным ХЛЕБАРОБУ,
што вырошчваў ураджай.

У ЦЯЛЯТНІЦЫ – дзетсад.
Не для дзетак, для цялят.
А цяляткі – нібы дзеткі,
ім і догляд трэба гэткі.

Па ўзгорках, па лугах стракатых
ЧАБАН пасе авечы статак.
Увосень будзе шмат для дзетак
і рукавічак і шкарпэтак.

ШАФЁР, хоць страчан рэйсам лік,
машыну ўпэўнена вядзе.
Нагружан з верхам грузавік,
ані зярнятка не ўпадзе.

Работа лепей спорыцца
ў цяпле ды пры святле.
ЭЛЕКТРЫК, як і ў горадзе,
патрэбен на сяле.

Каб выпадковых страт не несці,
разлікі ўсе законна весці,
патрэбны стаў па новым часе
і ЮРЫСКОНСУЛЬТ у калгасе.

А Я? Яшчэ ў дзетсадзе я.
Але ў калгасе — ўся сям'я.
І, як апошні скончу клас
ці нават інстытут,
я не пакіну свой калгас,
мая работа — тут!

## СТАЛЯРЫ

Мы са Слаўкам —
сталяры:
робім лаўку
на двары.

Жоўтыя апілкі
сыплюцца
з-пад пілкі.
Стружкі
з-пад рубанкаў —
вязкай абаранкаў.

Мы для лаўкі
дошкі
падгаблюем трошкі.
Вось гатова спінка.
Вось гатовы ножкі.

Тук-так-ток,
тук-так-ток —
заспяваў малаток.

Ды чамусьці цвікі
загінаюцца ў бакі.
Выпраміш — і зноўку
хіліць цвік галоўку.
Аж да стомы
працавалі,
але лаўку
змайстравалі.

Мы абодва
рады надта,
ды прыйшла сястрычка
Ната.
Паглядзела і сказала:
— З вашай працы
толку мала.
Нават боязна садзіцца.
Можа лаўка разваліцца...

Я ў адказ:
— Наадварот!
Прастаіць яна сто год...

Ната зноў:
— Ну што ж,
паглядзім...

Я — да Слаўкі:
— Сядзем?
— Сядзем!

Я саджуся.
Сеў і Слаўка...
Нас дваіх
трымае лаўка.

— Во, — кажу я
да сястры, —
мы са Слаўкам —
сталяры!

## *Віктар Гардзей*

### МОЙ ТАТА — ТРАКТАРЫСТ

**1**

Шумяць заснежаныя сосны,
Палеткі сцюжа замяла.
Зімой і летам парк дзівосны
Стаіць наводшыбе сяла.

Ніколі ў ім не пахне бэзам,
Дразды не свішчуць і шпакі,
Затое грукатам жалеза
Усе напоўнены куткі.

У парку гэтым незвычайным —
У гаражах і на двары —
Відны машыны і камбайны,
Стаяць плугі і трактары.

Тут культыватары, і дыскі,
І сеялкі застылі ў рад.
Якому сэрцу ды не блізкі
Калгаснай тэхнікі парад!

Цераз лагчыны і пагоркі
Ляцяць адсюль і звон і свіст.

Ажно душа пяе ў Ягоркі:
– Мой тата – слаўны трактарыст!

**2**

Мароз трашчыць, завея ў вочы,
Гудзе трывожна сіні бор.
Ягорка спіць, а тата з ночы
Спяшае на машынны двор.

Рукамі спрытнымі ў майстэрні
Свой трактар будзе ён «лячыць»,
Таму што, каб пасеяць зерне,
Прастояў не павінна быць.

Дрыготкі бляск электразваркі
Палосамі сягае ўдаль.
Станкі святлом заліты яркім –
Шчыруюць токар і каваль.

Пад вечар захад стаў барвовы,
Нібы ў агні жалезны брус.
І вось прыгожы і «здаровы»
За браму выбег «Беларус».

Глыбокі снег дратуюць колы,
Без перашкод матор гудзе.
І ў таты позірк зноў вясёлы:
– Ну што ж, няхай вясна ідзе!

**3**

Пупышкамі набракла голле –
Цяпло прынеслі ў гай гракі.
І зазвінелі ў наваколлі,
Нібы званочкі, ручайкі.

Ягорка, пагуляўшы ў садзе,
Бяжыць на поле раніцой:
Там – на блакітным даляглядзе –
Ракоча трактар за ракой.

Апошнюю сагнала крыгу,
І пасушэла між канаў, –
І тата ў веснавую кнігу
Радок свой плугам упісаў.

Там, дзе на трактары праехаў,
Да гарызонта, як струна,
Без недаробак і агрэхаў
Прамая легла баразна.

Ягорку бацькава вучоба
Прыдасца, што тут ні кажы:
– Сыночак, званне хлебароба
Як зрэнку вока беражы!

**4**

Гракі хутчэй крыляюць з гаю
На поле, дзе і шум і рух.

Ляжыць ад краю і да краю
Ралля, мякчэйшая за пух.

Над полем блізка загрымела,
І ветрык дожджыку прынёс.
У глебу, што якраз паспела,
Ячмень кладзецца і авёс.

Ракоча трактар цягавіта,
І скрозь чуваць шчаслівы смех.
Цячэ ў жалезнае карыта
Адборным зернем тоўсты мех.

Ад сеялкі ў прасцяг вясенні
Ляціць далёка кожны гук,
І прагне чыстае насенне
Такіх жа чыстых душ і рук.

Няхай расце ячмень вусаты,
Няхай шуміць аўса разліў.
Стаміўся сейбіт і араты,
Ды адпачынку не прасіў.

**5**

Рунь аксамітавым абрусам.
І – зелянее сенажаць.
У самы раз да «Беларуса»
Бульбасаджалку прычапляць.

А з гэтым клопатам не жарты:
Спрадвеку бульба – хлеб другі.
І трактар, што пашаны варты,
На полі робіць зноў кругі.

Гектараў сто, а то і болей,
Патрэбна бульбай засадзіць.
Вясной разбуджанае поле
Жалезам дацямна грыміць.

На славу людзі шчыравалі,
Садзілі клубні дзень пры дні:
Бягуць удалеч, нібы хвалі,
Радоў густыя грабяні.

Загнаўшы ў парк
Бульбасаджалку,
І трактарыст ідзе дамоў.
– Сягоння можна на рыбалку.
Капай, Ягорка, чарвякоў!

**6**

Бруіць на казачным улонні
Рака ў зарослых берагах,
Цяпельца бліскае ў сутонні,
І юшкай луг увесь прапах.

– Палетак бачыш за папасам? –
І тата паказаў рукой. –

Яго мой дзед за даўнім часам
Араў драўлянаю сахой.

Зямля была паліта потам,
Ды бедна родзічы жылі:
Палі, зарослыя асотам,
Прахарчаваць іх не маглі.

Той час прыгадваць нават горка.
Згасалі людзі без пары.
З палёгкай выдыхнуў Ягорка:
— Зусім другое — трактары!

За пацямнелым перакатам
Бугай забухаў у трысці.
— Пара дамоў! — падняўся тата. —
На працу ж раненька ісці.

**7**

Яшчэ і раз і два да лета
Яны наведвалі раку
І ля вады, за дзень нагрэтай,
Варылі юшку ў кацялку.

Тым часам адцвіла чарэшня,
І з дуба хутка пырснуў ліст.
Хто лён пасеяў? Ну, канешне,
Ягоркаў тата-трактарыст!

Затым расліны на палетку
Палоў, карміў, баранаваў,
І з лугавіны неўзаметку
Павеяў пах даспелых траў.

Пад вечар бліскалі зарніцы
На ўвесь абшар, на ўвесь калгас.
Так пачалася касавіца –
Турботны і вясёлы час.

Стракоча над ракой касілка
На санцапёку, на вятрах.
У загарэлага асілка
Работа спорыцца ў руках.

**8**

Стаіць спякота на канавах,
Аж хочацца схавацца ў цень.
Гурмой сябры ў духмяных травах
Куляюцца цалюткі дзень.

Ягорка папрасіў у таты:
– Пракос адзін дазволь прайсці?
Той засмяяўся: – Малаваты!
Патрэбна, сынку, падрасці.

Стагамі далячынь закрыта,
У гумны звезены цюкі,
А тут ужо даспела жыта,
Тапырыць вусы-асцюкі.

За вёскай раніцою золкай,
Ледзь заружовіцца зара,
Напамінае перапёлка,
Што жаць пара, што жаць пара.

З усмешкай цёплаю з-пад веек
Спыняе тату старшыня:
— Глядзеў, як жыта палавее?
Мяняй, браток, свайго «каня».

**9**

Пасля імклівых летніх ліўняў
Падсохлі сінія брады.
Камбайн павёў на покліч жніўня
Ягоркаў тата, як заўжды.

Палёў гарачае дыханне.
Пыляць паўсюль грузавікі.
Яны ад рання да змяркання
Адвозяць збожжа на такі.

Не даць прапасці ні зярнятку —
Жаць добра сёння і пасля.
Сабраць да грама, да астатку
Усё, чым шчодрая зямля.

Калоссе дзіўным перазвонам
Спрабуе падпяваць жніву.
Здаецца, караблём чырвоным
Плыве камбайн у сіняву.

Гартае вецер вал за валам,
І калі жыта – акіян,
То, несумненна, за штурвалам
Ягоркаў тата – капітан!

**10**

На ніве, ледзь раса прапала,
Камбайн гудзе сярод лагчын,
Гарачы час, і вельмі ж мала
У хаце тату бачыць сын.

Хай рукі і баляць начамі,
Жніво заўжды – ударны фронт.
Яшчэ хоць добра, што дажджамі
Не засцілае гарызонт.

Няшчадна смаліць, жоўкне траўка,
Пайсці б калі на чысты плёс,
Ды тут прарыў і там няўпраўка:
Паспелі грэчка і авёс.

А на чарзе – ячмень і лубін,
А на чарзе – яшчэ гарох.
Зноў паша выбіта, як бубен,
І нават быльнік перасох.

Пацiху ў подыху асеннім
Былое вяне хараство.

Прыходзяць стома і здзіўленне,
Калі канчаецца жніво.

**11**

Такая ў земляроба доля,
Ён хлебу ведае цану.
Камбайн у парк паехаў з поля —
Адразу плуг у баразну.

Уранні белыя туманы
Валожаць даль усё гусцей.
Наказ дзядоў не занядбаны:
Чакай зіму, а жыта сей!

Пачаўся спадцішка ў прыродзе
Ужо асенні пературус.
Ракоча пры любой пагодзе
Блакітны трактар «Беларус».

Птушыныя чароды міма
Ляцяць за сінія брады.
Зазелянее клін азімы,
Пакуль надыдуць халады.

Вунь праплываюць павуціны,
І клёкат чуецца з нізін.
Чырвонай хустачкай рабіны
Махае восень з-за асін.

**12**

— Работ увосень — цэлых восем, —
Вяскоўцы любяць паўтараць. —
Падымем лён, атаву скосім,
І трэба зябліва араць.

Галоўная ж цяпер турбота:
Убраць бы бульбу да нягод!
У працы абліліся потам
І трактарыст і палявод.

Бяжыць Ягорка між радкамі,
І весела крычыць хлапчук:
— Бульбакамбайн двума лычамі
Палетак рые, як вяпрук!

Плыве далёка гул маторны
Цераз балотцы і яры.
Гараць у час перадвячорны
Наўкол зіхоткія кастры.

Уецца дым у шэрым голлі,
І пачынаецца слата.
Спяклася бульба на вуголлі.
— Каштуй, Ягорка, — смаката!

**13**

У чаратах вада булькоча,
І цягне сырасцю з ракі.

Прыемна ўдвух насупраць ночы
Ісці дахаты нацянькі.

– Да працы, сын, прывыкні змалку, –
Ягорку тата павучаў. –
Ты помніш майскую рыбалку?
Дык я тады не ўсё сказаў.

Мой дзед быў моцнае пароды
І, хоць надзел араў сахой,
У пояс кланяўся заўсёды
Зямлі – карміцельцы людской.

Яна нікога не абмане
І ворагу не дасць на здзек.
Зямля – і ў сонцы і ў тумане –
Уся твая, твая навек.

Дзе баравінай, дзе азерцам
Перад табой адкрыўся свет.
Любі зямлю душой і сэрцам –
Такі бацькоўскі запавет.

**14**

Ягорку мілы тлум вясковы,
Ягорку любы родны край.
Духмяны, сонечны, мядовы
Спяклі на свята каравай.

Палеткі нанава ўзараны,
І вее стыласцю з гаёў.
У таты ордэн «Знак Пашаны»
І многа розных медалёў.

На месяц доўгі ў санаторый
Паехаў тата адпачыць,
Але і там, на Чорным моры,
Не змог любімы кут забыць.

Прыйшло пісьмо з далёкіх Сочы,
У тым пісьме — зямлі паклон.
Ягорка ўжо прагледзеў вочы,
Сумуючы каля акон.

Нарэшце чуецца за хатай
Такі знаёмы, родны крок.
— Ура! Дамоў вярнуўся тата!
— Ну, як ты жыў? Здароў, сынок!

**15**

Замёрзлі сажалкі і плёсы,
Прыйшла зіма, замкнуўся круг.
І снегапады і заносы,
Сінее лес, бялее луг.

Набытак зноў у таты плённы:
Якія б сцюжы ні мялі,
Ён, помнячы пра хлеб надзённы,
Вазіў кампосты на палі.

Цяпер жа раніцой завейнай
Спяшае на машынны двор.
Патрэбна ўсё зрабіць надзейна,
Каб на сяўбе не глух матор.

Ягоны трактар ласку знае,
Таму ні разу не падвёў.
Майстэрня сцюжу разганяе
Зіхоткім россыпам агнёў.

Цераз лагчыны і пагоркі
Ляцяць адсюль і звон і свіст.
І зноў душа пяе ў Ягоркі:
– Мой тата – слаўны трактарыст!

## *Сяргей Грахоўскі*

### КАСМАНАЎТЫ

Не спяць дарослыя і дзеці,
Глядзіць у неба цэлы свет:
Зноў касманаўты у ракеце
Да зорак пракладаюць след.

А на далёкім касмадроме
Шуміць вясною белы сад,
Чакае старту невядомы
Адважны новы касманаўт.

І мы свае гартуем сілы,
Гартуем волю з году ў год,
А падужэюць нашы крылы –
І мы адправімся ў палёт.

## *Хведар Гурыновіч*

### МАЛЕНЬКАЯ ДАЯРКА

Сёння я устала рана,
Не чакаючы званка.
Тварык вымыла старанна,
Напілася малака.

Спіць яшчэ наш каляровы
Тэлевізар на стале.
Ды чакаюць нас каровы –
Час даення настае.

Я насыпала ў кармушкі
Камбікорму і мукі,
А бязрогая Чарнушка
Хлеб жуе з маёй рукі

І абнюхвае мой плашчык,
Што жаўцее на сцяне.
Ласцы хочацца палашчыць
Языком сваім мяне.

Вось рагулі паслухмяна
Сталі ўсе ў раўнюткі рад.
І прыцмоквае старанна
Наш даільны апарат.

Пахваліцца вам магу я:
Покуль сонца йшло ўгару,
Мы ад кожнае рагулі
Надаілі па вядру.

А пасля юнак вясёлы
Падагнаў малакавоз,
Малако забраў усё ён,
На завод яго павёз.

Ён сказаў мне:
– Ты, Святлана,
Працавала недарма,
Зробяць там з яго смятаны
І марожанага шмат...

Уяўлю, пламбір як есці
Дружна будуць малышы,
Светла-светла стане ў свеце,
Добра-добра на душы.

Сонца свеціць ярка-ярка.
Я – маленькая даярка.

## *Сяргей Дзяргай*

### ЗЕРНЕ

Колькі ў ім моцы,
Ў маленечкім зерні,
Кволым на погляд,
Нібыта мізэрным.

Сёння бадзёра
Настроена зерне:
Што вінавата –
Людзям яно верне.

Хай сабе спёкі,
Дажджы, сухавеі –
Жыта ўзыходзіць,
Расце, палавéе.

Болей за сотню
На добрым сцябельцы
Дбала вырошчваюць
Нашы умельцы.

А не ўзрасці яна,
Гэта малеча, –

Голад на свеце,
Бяда і галеча.

Часам шкада яго
Ў жорны, на мліва,
Гэта маленькае,
Дзіўнае дзіва.

## *Васіль Жуковіч*

### ВЫБІРАЮ ПРАФЕСІЮ

Я хачу быць
футбалістам,
забіваць галы са свістам
галавой,
нагой,
рукой!

Вой! Што я кажу?!

Я хачу быць
машыністам,
электрычкі гнаць са свістам,
з хуткасцю —
сто,
дзвесце,
трыста
за хвіліну!..

Вой! Што я кажу?!

Я хачу быць
каскадзёрам.

Уявіце, я скачу,
са скалы скачу я ў мора,
у агонь скачу!

Вой! Што я кажу?!
Не хачу!

## *Казімір Камейша*

### ГАНЧАРЫ

Замесяць гліну, нібы цеста.
Глядзіш, і гліны не пазнаць.
І чуеш, што ў руках ёй цесна,
На волю просіцца яна.

Нібыта дыхае між пальцаў
Жывы і цёплы камячок.
Рука бывалага пушчанца
Не пашкадуе плескачоў,

Пакуль не зробіць паслухмяным,
Зусім падатлівым яго.
Але у печ яшчэ зарана,
Яшчэ зарана у агонь.

Яго кладуць на круг ганчарны:
Няхай пакружыцца усмак.
І вось у танцы незвычайным
Адчайна кружыцца камяк.

Спачатку выцягне ён шыю,
Пасля раздасца у баках.
І рысы свежыя, жывыя
На гліне выведзе рука.

Пасля ганчар яго пагладзіць.
І, закасаўшы рукавы,
Ён ручку, як руку, прыладзіць.
Збанок, і праўда, як жывы.

Пара яго і ў печ адправіць.
Ён урачыста едзе ў печ.
Яго суседзі злева, справа
За ім стараюцца паспець.

Ён возьме ў полымя трываласць.
І будзе печы ўдзячны ён,
Што гартавала, глянцавала
І ў сценкі пасяліла звон.

А з печы выплыве, — аж ззяе.
Хвала і гліне, і майстрам!
Жыве збанок, збанок спявае
На далані у ганчара.

## Кастусь Кірэенка

### ВУЧУСЯ Ў ТАТЫ

Мой тата –
Слынны камбайнёр,
Яго ў нас кожны знае.
У таты – Зорка на грудзях
Агніста,
Ярка
Зззяе.

Умее тата
Ўсё ў жыцці.
І я ім ганаруся.
І я гарнуся да яго,
І з ім я
Жыць вучуся.

Вучуся ў таты
Рана ўстаць
На працу
Разам з сонцам,
Вучуся
Ўсіх людзей вітаць,
Быць іхнім
Абаронцам.

Як тата мой,
Хачу я быць
Сумленным,
Добрым,
Чыстым.
Як з нівы зернетка
Любіць
Свет цэлы
Прамяністы.

І будзе ў мяне
Ўсякіх спраў –
Я ведаю –
Багата.
І веру –
Ўсе іх параблю,
Як дарагі мой
Тата!..

## *Янка Купала*

### СЫНЫ

Сыноў бацька сваіх кліча
На параду ў хату,
А ўрачыста, як бы кліча
На якое свята.

І з павагаю пытае
Кожнага ў асобку,
Кім з іх кожны быці хоча,
Якім жыць заробкам.

* * *

— Бо, сыны мае, — так кажа,
Жывіцё ў краіне,
Чалавечая дзе праца
Намарна не гіне.

І сыны адказ трымалі
Перад бацькам родным,
А стараўся з іх быць кожны
Свайго бацькі годным.

* * *

Першы кажа: — Землі буду
Трактарам варочаць,

Каб рунелі, зелянелі,
Аж яснелі вочы.

Каб раслі ў рост чалавека
Жыта і пшаніца,
Каб аж госці к нам з-за свету
Ехалі дзівіцца.

* * *

Другі кажа: — На заводзе
Быць хачу даўно я,
Дзе чыгун ракою льецца,
Дзе звініць сталь звонам.

Будаваць буду дзень цэлы
Домны і мартэны,
Медзь і вугаль браць у дзела
Ад шахтаў падземных.

* * *

— Плаваць я пайду на мора, —
Сказаў гэтак трэці, —
Дзе «Чэлюскін» горда плаваў,
Дзе пурга, дзе вецер.

Ад халодных да гарачых
Мораў рэйс мой будзе.
Параход мой будзе грозна
Рэзаць хваляў грудзі.

* * *

Сын чацвёрты: — Хачу лётаць
Птушкаю крылатай,
Мераць неба ў самалёце
Над тваёю хатай.

Арлянём сябе ў сне бачу,
Не знаю спакою...
Хачу быць я, мой ты бацька,
Лётчыкам-героем.

* * *

— Байцом буду я чырвоным, —
Пяты кажа гэтак, —
Сцерагчы граніцы-межы
Краіны Саветаў,

Каб наш вораг пры нападзе
Сустрэнуў магілу.
Байцом буду, каб за мяне быў
Рад сам Варашылаў.

* * *

А сын шосты: — Складаць песні
Буду, колькі змогі,
Пра вялікія падзеі...

Як працуем, як знішчаем
Здрадныя напасці,

Як будуем, як ствараем
Казачнае шчасце.

* * *

Так сыны адказ трымалі
З гонарам юначым,
Свае выказаці думкі
Не ўмелі іначай.

Бальшавік быў іхні бацька,
Пралетарый родам,
Зведаў сушы, зведаў моры,
Бітвы і паходы.

## *Уладзімір Ліпскі*

### УМЕЮ – НЕ ЎМЕЮ

*Споведзь*

Спытаў дзед унука:

– Што ўмеюць твае рукі? Што «зварыла» галава за твае гады жыцця?

Антонік змоўк, задумаўся, пасур'ёзнеў ураз і даў такі адказ:

– Умею ўсе словы гаварыць,
Не ўмею кашу варыць.
Умею пазіраць на неба,
Не ўмею адрэзаць хлеба.
Умею есці грушы,
Не ўмею мыць вушы.
Умею лопаць апельсіны,
Не ўмею купляць іх у магазіне.
Умею катацца з горкі,
Не ўмею лічыць зоркі.
Умею схапіць камара за нос,
Не ўмею злавіць муху за хвост.
Умею хавацца за сланамі,
Не ўмею трымаць язык за зубамі.
Умею ў халадзільнік лазіць,
Не ўмею з сястрычкай ладзіць.

Умею тэлевізар глядзець,
Не ўмею за сталом сядзець.
Умею хрумстаць цукеркі,
Не ўмею карыстацца сякеркай.
Умею ў цырк хадзіць,
Не ўмею траву касіць.
Умею казкі выдумляць,
Не ўмею іх запісаць.
Умею робатаў маляваць,
Не ўмею іх у космас запускаць.
Умею ў хаце вэрхал учыняць,
Не ўмею ключом дзверы адчыняць.
Умею талеркі мыць,
Не ўмею гузіка прышыць.
Умею спаць уначы,
Не ўмею ад пчол уцячы.
Умею з дзецьмі сябраваць,
Не ўмею задачы рашаць.
Умею трымаць рыбу ў руцэ,
Не ўмею плаваць у рацэ.
Умею да дзесяці лічыць,
Не ўмею без мамы і таты жыць...

Слухаў дзед, усміхаўся і зрабіў такі прысуд:

– Хвалю, Антонік, ты стараўся! Што ўмееш – проста цуд. І вельмі радуе мяне – няўмельствы ведаеш свае.

## ПРА ХЛОПЧЫКА «АЙ»

Жыў у нашым доме трэцякласнік Дзімка. Вельмі любіў ён слова «ай».

– Дзімка, збегай у магазін, купі хлеба, – просіць мама.

– Ай!

– Сынок, памажы памыць посуд.

– Ай!

– Абгарні падручнікі ў чыстую паперу. Вучы ўрокі.

– Ай! Ай! Ай!

Так яго і клікаць сталі: Дзімка-ай.

Аднойчы здарылася з Дзімкам бяда. Сабраўся ён у школу ісці, глядзіць – а партфель пусты. Зніклі ўсе яго падручнікі. Зірнуў на кніжныя палічкі – аж і там пуста: ніводнай кніжкі.

Дзімка спачатку ўзрадаваўся. «От добра, у школу не буду хадзіць. Урокі не трэба вучыць».

Сноўдаўся з кута ў кут колькі часу. Нарэшце засумаваў. Нецікава зрабілася аднаму.

– Мама, чаму ад мяне кнігі ўцяклі?

– Не шанаваў ты іх, не любіў, – адказала мама і ўздыхнула.

І надумаўся Дзімка свае кнігі адшукаць. Але дзе іх шукаць?

Пайшоў куды вочы глядзяць. Ішоў, ішоў, аж насустрач – бабуля. Села з ім разам ад-

пачываць у цянёк. Пачаставаў яе Дзімка цукеркай, расказаў пра сваю бяду.

— Памагу я табе, — сказала бабуля. — Але больш ніколі-ніколі не крыўдзі кнігі.

Развязала яна сваю торбачку, выняла клубок нітак.

— Вось вазьмі! Гэта чароўны клубок. Куды ён пакоціцца, туды ідзі за ім. І не палохайся нічога...

Падзякаваў Дзімка бабулі, апусціў клубок на зямлю і пабег услед.

Як толькі раскруціўся ўвесь клубок, Дзімка ўбачыў перад сабой прыгожы размаляваны домік, падобны на вялізны «Буквар». Ёсць і вокны, і дзверы.

Падышоў Дзімка да дзвярэй і ціхенька пастукаў.

— Калі ласка, заходзьце... — пачуў ён ветлівы голас. — Мае дзверы адчынены заўсёды.

Увайшоў Дзімка ў домік, а там паўнютка ўсялякіх кніг. Маленькі чалавечак з сівой барадой гартаў самую тоўстую.

— Д-дзень д-добры, — пачаў заікацца Дзімка і пачырванеў.

— Добры дзень, хлопчык, — ветліва адказаў гаспадар доміка і пацікавіўся: — Што цябе прывяло да мяне? Чым ты ўсхваляваны?

— Свае кнігі шукаю. Яны некуды зніклі. Можа, у вас?

— Хто яго ведае, хлопчык, — дзядуля уважліва паглядзеў на Дзімку і сказаў: — Веру, знойдзецца твая прапажа. Толькі дапамажы мне паставіць вось гэтыя кнігі ў шафу.

Дзімка зірнуў на вялізную гару кніг і хацеў, як звычайна сказаць «Ай!», але не сказаў, згадзіўся памагчы.

— Тады за працу! — падахвоціў яго стары.

Сонейка ўзышло — яны працуюць. Сонейка зайшло, а яны працуюць. Нарэшце ўсё зрабілі.

Гаспадар пагладзіў бародку, ласкава ўсміхнуўся:

— Малайчына, хлопчык! Добра папрацаваў. За гэта і я табе дапамагу. Ідзі дадому. Твае кніжкі ўжо чакаюць цябе.

— Як жа я знайду свой дом? — захваляваўся Дзімка.

— Вось табе чароўны каменьчык. Наматвай на яго сваю нітку і называй кніжкі, якія ад цябе ўцяклі...

Не паспеў Дзімка назваць апошнюю, як нітка ўся наматалася на каменьчык, і ён апынуўся дома. На пісьмовым стале ляжалі ўсе ягоныя кнігі. А з палічак весела ўсміхаліся яму каляровыя вокладкі кніжак.

Дзімка цяпер шануе свае кнігі, урокі вучыць старанна, а слова «ай» забыў зусім.

## Мікола Маляўка

### ЯК ДОМ БУДАВАЛІ

Побач з садзікам дзіцячым
Вырас новы гмах.
Знізу глянеш –
І не ўбачыш,
Дзе згубіўся дах.
На трынаццатым паверсе
Васілёк жыве,
І не страшна спаць, паверце,
Там, у сіняве.
Не адразу дом падняўся,
Вырас да нябёс –
Ён з падмурка пачынаўся,
Па цаглінцы рос.
Зелянеў вішняк наўкола
Год таму назад,
Васілёк хадзіў не ў школу,
А ў дзіцячы сад.
Помніць, як загуў увішны
Экскаватар тут –
І змяніўся
Іх зацішны,
Іх зялёны кут.
У траве сцяжынка спала,
Скрозь бялеў туман,

А машына ўжо капала
Яму-катлаван.
Драў карэнне коўш трывалы,
Грунт пясчаны грыз,
І ляталі самазвалы
То наверх,
То ўніз.
А пасля з бетону блокі
Ў катлаван ляглі,
Каб стаяў ён,
Дом высокі,
Цвёрда на зямлі.
І пад'ёмны кран уранні
Завітаў у двор,
Падаваў на рыштаванні
Цэглу і раствор.
Не ляжалі без работы
Кельмы муляроў —
Прывыкалі да спякоты,
Слоты і вятроў.
І глядзеў,
Нібы на дзіва,
Васілёк тады,
Як сцяну кладзе рупліва
Муляр малады.
Браў навобмацак цагліну,
Стукаў кельмай ён —
І ў паветры плыў хвіліну
Меладычны звон.

Муляр радаваўся:
Цэгла –
Быццам на падбор.
І сачыў, каб роўна легла
Зверху, у раствор.
Стукаў кельмаю чароўнай
І ўсміхаўся ён,
Бы ў сцяну сваю ўмуроўваў
Меладычны звон.
На цагліну клаў цагліну,
Прытрымаў адну –
Васільку падаў, як сыну:
«На, кладзі ў сцяну!»
І растворам край пазначыў
Так, каб Васілёк
Мог цагліну тую бачыць
Зблізку і здалёк.
Падымаўся дом патроху,
Рос і ў стынь,
І ў золь.
Насцілалі з пліт падлогу,
Мацавалі столь.
А яшчэ за клопат пільны
Дзякуй сталярам:
Шмат дзвярэй яны зрабілі,
Шмат аконных рам.
Шыбы вымыў першы лівень –
І заззяў ён,
Дом,

Быццам вокны ўсе зашклілі
Сонечным святлом.
Пад цаглінай той,
Памечанай,
Бачыў Васілёк,
Як на фортачцы трапеча
Промень-матылёк.
Кожны дзень прыносіў змены,
Добры неспакой:
Тынкавалі ў доме сцены,
Васількоў пакой.
А паклеілі шпалеры,
Дык нібы з бяроз
Лісця жоўтага ў кватэры
Чараўнік натрос.
Васілька разбудзіць сонца,
Гляне ён — і рад,
Быццам выскачыў спрасонку
Ў гай, дзе лістапад.
Клалі елачкай прыгожай,
Клалі як шчыльней
З дубу дошчачкі ў прыхожай,
З дубу — ён цямней.
Падбіралі,
Насцілалі
Дошчачкі далей:
Толькі з ясеню — у зале,
З ясеню святлей.

Абнавілі свежым лакам
Дошчачкі як след –
І зіхціць,
І вока лашчыць,
Як бурштын, паркет.
Не палохаюць завеі
У зімовы час:
Добра грэюць батарэі,
Ёсць святло і газ.
Запрашае ў лета ванна –
Беленькі ставок,
У якім купацца ўранку
Любіць Васілёк.
І па лесвіцы не трэба
Тэпаць – сходак шмат:
Ліфт за так падыме ў неба,
Ліфт звязе назад.
Дах накрылі –
Не свіціцца
Там, у сіняве,
Дзе над самым домам ціха
Воблачка плыве.
Б'е пярун цяпер, бывае,
Навальніца –
Жах,
Ды і кропля дажджавая
Не праточыць дах.
Дом абклалі пліткай новай,
Яркай, як эмаль,

І цагліны васільковай
Не відаць, на жаль.
Ды не тоіць ён ад таты,
Ад сваіх сяброў:
Прыйдзе час —
Збярэ ў брыгаду
Лепшых муляроў.
І тады з цаглін, вядома,
Выбера адну,
Хлапчуку падасць малому:
«На, кладзі ў сцяну!»
І растворам так пазначыць,
Каб хлапчук пасля
Мог цагліну тую бачыць
Зблізку і здаля.
Ён і сад збудуе дзецям,
Майстра-брыгадзір,
Толькі каб на белым свеце
Быў заўсёды мір.

## **М***іхась Пазнякоў*

### ПОБАЧ З ТАТАМ

Еду з татам на камбайне,
Збажыну ўбіраю.
У прастор бяскрайні
Горда пазіраю.

Бункер поўніцца паволі,
Жытам залаціцца.
Ні зярнятку не дазволім
На жніве згубіцца.

Збожжа ў кузаў высыпаю
Па камандзе таты.
Дарагому ураджаю
Кожны будзе рады.

## **П***авел Прудніка*ў

### БУДАЎНІК

Сам будую я заводы,
Шахты, фабрыкі, масты,
А таксама – параходы
Даўжынёю з паўвярсты.

Вам кватэру? Калі ласка.
Дачу? Рад старацца я.
Хай пакуль што гэта казка,
Але – выдумка мая.

Не зацягваю, а ў тэрмін
Я рабіць усё прывык.
Вось які я архітэктар,
Вось які я будаўнік!

## *Даір Слаўковіч*

### КАЛІ РАСТУЦЬ АГУРКІ

Каля хаты гарод. А ў ім чаго толькі няма! І бабуля-цыбуля, і гаспадыня-бульба, і часнок-асілак, і буракі-карміцелі – усё ёсць. Нават жоўтая бручка-таўстушка прытулілася да плота.

Алесіка больш за ўсё цікавіць градка з агуркамі. Кожныя чатыры-пяць дзён бярэ ён невялікі лазовы кошык і ідзе на градку – ураджай здымаць.

Агуркі чакаюць Алесіка, бакі выстаўляюць. Іншыя ж быццам дражняцца. Схаваюцца пад лісточкі, сядзяць: знайдзі нас!

Алесік гэтыя хітрыкі ведае. Прысядзе, агурочнік наградцы расхіліць, смяецца.

– Вось вы дзе! Вылазьце са схованкі!

У гарачыя дні хлопчык палівае градку. Вечарам. З леечкі.

Вы мо думаеце, што агуркі ўсе аднолькавыя? Памыляецеся.

Адны зялёныя-зялёныя. Аж цёмныя. Скурка ў іх у калючых пупышках. Пакаштуеш такі, а ён горкі-горкі.

Другія святлейшыя, гладкія. Раз укусіш – увесь з'есці захочацца. Асабліва калі разрэзаць удоўж і кожную палавінку мёдам намазаць.

Добрая градка. І агуркі на ёй добрыя. Растуць — сокам наліваюцца. Вось толькі калі?

Шмат разоў Алесік на гарод бегаў. Агурочнік рассоўваў, углядаўся ў маленькія зялёныя кадоўбчыкі. Не, не відаць, каб павялічваліся. А праз дзень-два — вунь якімі рабіліся.

Калі ж гэта адбывалася? Раніцай? Днём? Вечарам?

— Разгадаю загадку, — рашыў Алесік. Сачыць пачаў. Падоўгу прастойваў ля градкі. Нічога не заўважыў.

— Зразумеў. На вачах вы расці не любіце. Залез Алесік у бульбянік, галаву вытыркнуў, пазірае.

Агуркі ж усё роўна не растуць.

Змяніў Алесік пазіцыю. За плот схаваўся. Прыціснуўся шчакою да сухой штыкеціны, цікуе адным вокам. А на агуркі хоць не глядзі: такія ж, як і раней. Не таўсцеюць, не выцягваюцца.

Вось дзіва! Калі ж яны растуць?

На хітрасць хлопчык пайшоў.

— Хаваецеся ад мяне? Ну і няхай. Я ў маму пераапрануся.

Нацягнуў Алесік матчыну спадніцу. Каптан стары апрануў. Хустку пад бараду завязаў. Зірнуў на сябе ў люстэрка, засмяяўся:

— Цяпер агуркі мяне нізавошта не пазнаюць!

Узяў кошык — і ў гарод. Ходзіць, нагінаецца. Быццам мама траву парасятам збірае. А сам не-не ды і кіне вокам на два маладзенькія агуркі. Што з краю на градцы.

Доўга тупаў хлопчык у гародзе. Ды так нічога не дабіўся.

На наступны дзень тыя два агуркі-малайцы яшчэ больш падраслі.

Калі ж растуць яны?

Задумаўся Алесік, разважаць пачаў:

— Не растуць днём. А раніцой ужо трошкі падраслі. Выходзіць, усё адбываецца ўначы?

Вечарам хлопчык лёг спаць зараней. Пад падушку электрычны ліхтарык паклаў.

Як толькі ўсе спаць палеглі і ў кватэры стала ціха, Алесік з-пад коўдры вылез. У пакоі цёмна. Вобмацкам штаны, кашулю апрануў. Абуўся.

Рыпнулі дзверы — ціхенька-ціхенька. Выйшаў Алесік на ганак. Цемень. Нічога не відаць.

Страшна стала малому.

— Мо лепш у хату ўцячы, пакуль хто жудасны з цемры не выскачыў? — сам сабе кажа. — Нельга. Бо як жа тады даведаешся, калі растуць агуркі?

Запаліў Алесь ліхтарык. У гарод рушыў. Вузкі прамень святла ледзьве сцежку асвятляе. З бакоў цемра яшчэ гусцейшая стала.

Раптам нехта халодны як цяпне Алеся за нагу.

— Ма!.. — вырвалася ў хлопчыка. Адскочыў Алесік убок, ліхтарыкам — бліс! бліс!

А гэта проста жаба. Смешна стала Алесіку.

На агуркі пасвяціў. Глядзеў, глядзеў, а яны... ні кропелькі не растуць. Ледзьве не расплакаўся Алесік.

— Удзень не жадаюць, уначы — таксама. Калі ж яны растуць?..

Так ні з чым і вярнуўся хлопчык у хату. Распрануўся ціхенька, спаць лёг. Раніцой мама запыталася:

— Ты што такі заклапочаны?

— Не магу ўпільнаваць, калі растуць агуркі.

— А ты нітку вазьмі, агуркі перавяжы і панаглядай.

Так і зрабіў Алесік. Ніткай перавязаў агурок: упоперак і ўдоўж.

Пад вечар прыбег на градку, зірнуў на перавязаны агурок. Нітка напялася, цясней яго абхапіла. Выходзіць, растуць агуркі днём.

Яшчэ ноч прайшла. Алесік зноў грады наведаў. Бачыць — нітка проста ўрэзалася ў зялёную скурку. Так ён падрос. Значыцца, і ўначы агуркі растуць.

— Вось і разгадаў я вашыя хітрыкі, — засмяяўся Алесік. — Расцяце вы і днём, і ўначы. Але патрошку. Таму вокам заўважыць нельга.

## *Яўген Хвалей*

### УРОК ПРАЦЫ

Хто будуе з цэглы дом?
Хто працуе за станком?
А на трактары хто ў полі?
Вучыць хто дзяцей у школе?
Хворым дорыць хто здароўе?
Ежу варыць хто ў сталовай?
Хто за баранкаю машыны
Шлях адольвае круты?
Хто ў завоблачных вышынях
Неба мерае і крэсліць?
Адкажы,
Што за прафесіі
І якую б выбраў ты?

(Муляр, токар, механізатар, настаўнік, урач, повар, шафёр, лётчык.)

## *Мікола Чарняўскі*

### ЗМАЙСТРАВАЛІ САНІ

Мы зімою самі
Змайстравалі сані.
Змайстравалі сані –
З хвацкімі насамі.
Змайстравалі сані –
Спеў пад палазамі!

Не дзянёк які, а тры
Увіхаліся майстры:
Вадзік ды Сяргейка,
Ромка ды Андрэйка,
Ну і я, Змітрок Вярбіла, –
Працы ўсім хапіла:
Як палоззе,
Гнулі спіны...
А Юрась?
Той сыпаў... кпіны.

Каб праехацца з гары –
Селі ў іх спярша
Майстры:
Вадзік ды Сяргейка,
Ромка ды Андрэйка,

Ну і я, Змітрок Вярбіла, –
Месца ўсім хапіла.

– Ты ж, Юрась,
З санак –
Злазь!

## Станіслаў Шушкевіч

### КАЗКА-БЫЛЬ ПРА РЭПКУ

Бабку не прасілі,
Не прасілі дзедку,
Самі пасадзілі
Ў чыстым полі рэпку.

Ды на гэтым полі
Болей не бывалі,
Рэпку не палолі
І не палівалі.

Надыходзіць восень,
Як там з ураджаем?..
Гуртам бабку просім,
Дзеда запрашаем.

На пустым прагале,
Між хвашчу, асоту
Ураджай шукалі
Да сёмага поту.

Ураджай сабралі
У крысо паспешна.
Доўга рагаталі,
Хоць было не смешна.

Рагатала бабка,
Рагатала ўнучка,
Нават курка-рабка
Сакатала гучна.

Сучка забрахала
Каля сваёй будкі.
Рэпы было мала,
Ўся была танюткай.

Смешна было мышцы,
Хвосцікам круціла,
Рэпка з вішню ў лыжцы,
Корань, нібы шыла!

Бабку не прасілі,
Не пазвалі дзедку,
Самі ж пасадзілі
У чыстым полі рэпку!

# Мірна жыць — шчаслівым быць

## *Эдзі Агняцвет*

### МОЙ ГОРАД МІНСК
### У ЧАС ВАЕННЫ

Мой горад Мінск у час ваенны
Быў партызанам баявым,
Як воін мужны і сумленны,
Змагаўся з ворагам ліхім.
Ён сёння будаўнік вядомы,
Наўкол — плады яго турбот,
Зара ўстае над кожным домам...
Будуйся, Мінск, на сотні год!

Мой горад Мінск — магутны, смелы,
Славуты з даўняе пары.
Выходзяць з рук яго ўмелых
Гадзіннікі і трактары.
І самазвалы з мінскай маркай
Ён пасылае ў паход,
І дрэвы ён гадуе ў парках.
Будуйся, Мінск, на сотні год!..

## Мікола Гіль

### ПАРТЫЗАНСКІ ФОТАЗДЫМАК

У Мінску стаіць прыгожы светла-шэры будынак. Міхась ведае, што ў тым будынку – Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Хлопчык даўно хацеў пабываць там. Некалькі разоў прасіў тату звадзіць яго туды. Тата абяцаў, але яму ўсё штосьці перашкаджала. Урэшце пайшоў Міхась у музей з бабуляй.

Доўга хадзілі яны з адной залы музея ў другую. Найбольш цікавілі хлопчыка вінтоўкі, кулямёты ды гарматы, з якіх партызаны стралялі па фашыстах. Падоўгу стаяў каля іх, шкадаваў, што няможна дакранацца да тых кулямётаў і гарматаў. І на бабулю злаваўся, што падганяла яго. Сама бабуля, смешна казаць, на вінтоўкі і кулямёты амаль не глядзела. Усё больш да фотаздымкаў прыглядалася, што па сценах развешаны. Каля аднаго здымка стаяла так доўга, што Міхась не стрываў.

– Ці ты, бабуля, пазнала там каго? – спытаў ён.

– Але ж, унучак, пазнала, – адказала бабуля. Міхась толькі ўсміхнуўся і пацягнуў бабулю ў другую залу, дзе стаяла самая сапраў-

дная «кацюша». Пра той фотаздымак хлопчык і забыў адразу. Нічога цікавага на ім не было: стаяць нейкія дзядзька з цёткай, а між імі – хлопчык у кажушку і аблавушцы.

І вельмі здзівіўся Міхась, калі ўжо дома бабуля адчыніла свой куфэрак, дастала адтуль старую, пажоўклую фотакартку і паклікала ўнука:

– Падыдзі, унучак, паглядзі!

Глянуў Міхась – дзіва, ды годзе! Той самы музейны фотаздымак, каля якога бабуля так доўга стаяла! Толькі той быў вялікі, а гэты малюсенькі, як карабок з-пад запалак.

– Дзе ты яго ўзяла? Хто тут сфатаграфаваны? – падаўся Міхась бліжэй да бабулі.

– А ты вось сядзь і паслухай. – І пачала расказваць.

– Здымак гэты, – гаварыла бабуля, – зрабіў партызанскі фатограф. Даўно зрабіў. Ажно трыццаць пяць гадоў назад. Сфатаграфаваў ён партызанскую сям'ю: бацьку, маці і іхняга сынка.

– І ўсе яны ваявалі з фашыстамі? – перабіў хлопчык.

– Але, унучак, ваявалі. Па-сапраўднаму ваяваў, вядома, бацька, партызанскі камісар. Ён і страляў у фашыстаў, і цягнікі іхнія пад адхон пускаў. Маці есці партызанам варыла, параненых глядзела. А калі трэба было, дык і

ў разведку хадзіла. Ну, а Вова, сынок іхні, песні партызанам спяваў, пасыльным быў. А яшчэ – вогнішчы раскладваў. Надта ж умеў ён вогнішчы класці. Хай дождж ідзе, дровы мокрыя, а Вова ўсё роўна агонь развядзе.

– А дзе яны цяпер, бабуля? – спытаў Міхась. – Чаму ў цябе фотакартка гэтая?

– А ты, жэўжык, не перабівай, а слухай, – бабуля нібыта зазлавала на ўнука. – Дык вось... Сфатаграфаваў іх партызанскі фатограф сонечным вясновым днём. Гэта ўжо ў сорак чацвёртым было. Радаваліся ўсе, што хутка вызваленне прыйдзе, што хутка прагоняць фашыстаў з нашай зямлі. А неўзабаве блакада пачалася. Паслалі фашысты супраць партызанаў вялікае войска. Біліся з ворагамі партызаны, доўга біліся, аж пакуль патроны не скончыліся. І вымушаны былі народныя мсціўцы – гэта так партызанаў называлі – адступаць, глыбей у лес адыходзіць. Лес, унучак, партызанаў і карміў, і ратаваў. Адыходзяць партызаны, а фашысты па пятах за імі. Ужо і лес канчаецца, за ім балота дрыгвяністае раскінулася, парослае лазой ды іншым чэзлым хмызняком. Што рабіць? Пачалі партызаны ў гэтае балота адыходзіць. Спадзяваліся, што яно іх уратуе, што карнікі за імі ў балота не палезуць. Фашысты ж пaабувалі гумавыя боты з доўгімі халявамі і па-

перліся ў балота – так ім хацелася ўсіх партызанаў знішчыць. Балота тое падступала да ракі. Як улетку, дык і не надта вялікая рака тая, уброд лёгка перайсці. А вясною шырока разлілася, як вокам акінуць. Трапілі партызаны ў пастку: наперадзе – рака, ззаду – карнікі, і патронаў няма. А фашысты ўсё бліжэй і бліжэй. І тады камандзір загадаў: перабірацца цераз раку на другі бераг. Вада ў рацэ ледзяная, па ёй крыгі, ламачча рознае плыве. Ды выйсця іншага няма. Кінуліся партызаны ў ледзяную ваду, паплылі да другога берага, а камісар і некалькі байцоў ад фашыстаў адстрэльваюцца, таварышаў прыкрываюць. І толькі тады, калі ўжо ўсе былі на другім беразе, кінуліся ў раку і яны. Камісар добра плаваў, ён мог бы першым пераплысці раку. Але побач плылі яго таварышы. Некаторыя з іх былі паранены. І камісар падтрымліваў на вадзе то аднаго, то другога. Некалькім байцам памог ён выбрацца з імклівага патоку на бераг. Урэшце і сам ступіў на яго. Ступіў і азірнуўся – ці ўсе байцы пераправіліся? У гэтую хвіліну па беразе застрачыў фашысцкі кулямёт, і камісар упаў. Падбеглі да яго партызаны, а ён ужо і не дыхае... Пахавалі партызаны свайго камісара, а самі хутчэй пайшлі на злучэнне з іншымі атрадамі, каб агульнымі сіламі адолець карнікаў...

Бабуля змоўкла. Доўга маўчала. Ажно пакуль Міхась не крануў яе за рукаў:

— А з хлопчыкам што было? З мамай яго?

Бабуля схамянулася:

— Вова і яго мама выратаваліся. Яны і цяпер жывуць. За гэты час мама Вовы стала бабуляй. А Вова вырас, стаў татам, і ў яго нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Міхаськам.

— Міхаськам? Бабуля, дык гэта...

Бабуля ўсміхнулася:

— А ты і не здагадваўся? Але, унучак, але! Цётка, што на фотакартачцы, гэта — я. Хлопчык — твой тата. А камісар — твой дзед. Кандратам яго звалі. Татку ж твайго Уладзімір Кандратавіч завуць? Вось так, унучак! А ты пытаўся, каго гэта я на тым здымку ў музеі пазнала...

Міхась узяў у бабулі здымак, доўга ўзіраўся ў яго, нарэшце спытаў:

— Значыць, і я з партызанскай сям'і?

— А як жа! Вядома, з партызанскай! — адказала бабуля.

*Леанід Дайнека*

## ПРЫНЯСІЦЕ КВЕТКІ САЛДАТАМ

Адгулі, адгрымелі гарматы.
Хмары чорныя адплылі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што палеглі на нашай зямлі.

Пакланіцеся нізка-нізка
Тым, хто зведаў агонь і дым,
Строгім помнікам, абеліскам,
Слаўным зорачкам баявым.

Ля салдацкіх магіл памаўчыце...
Кожны з мужных салдат збярог
Цішыню, і сонца ў блакіце,
І сцяжынку на школьны парог...

Трыццаць год пад сцягам крылатым
Крочыць мір па роднай зямлі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што свабоду для нас здабылі.

## КРЫНІЧКА ПАРТЫЗАНСКАЯ

Крынічка партызанская –
Струмень
Жывой вады,
Прайшлі тут
Незабыўныя
Суровыя гады...

Паўзлі, як змеі, ворагі
І лезлі
Напралом,
Дыміўся
Лес падпалены,
Замшэлы буралом.

Крынічка партызанская
Цякла з глыбінь
Зямлі,
Спыніць
Патокі бурныя
Фашысты не змаглі.

І сілу неадольную
Ніхто
Не мог скарыць,
Крынічка партызанская
Бяжыць,
Пяе, журчыць!

## *Аляксей Дудараў*

### БУСЛЫ

Ідучы з лесу, Андрэйка з мамай адпачывалі ля сцірты саломы. Жмурачыся ад сонца, Андрэйка глядзеў у неба. Яму здавалася, што пад канец лета яно зрабілася незвычайна высокім, усё адно як паднялося і стала шырэйшае і большае.

— Мама! — усклікнуў раптам хлопчык. — Глянь: журавы лётаюць! Вунь, над фермай.

Мама сумна сказала:

— Гэта не журавы, сынок, гэта буслы з суседніх вёсак. Кожны год, збіраючыся ў вырай, яны над нашай клёнаўкай кружаць. А ў нас не жывуць...

— Чаму? — спытаў хлопчык. — Ім бы добра ў нас жылося.

— Некалі жылі, — сказала мама, — а цяпер не хочуць.

— А чаму?

— Пакрыўдзіліся. Яшчэ тады, калі я была такая, як ты цяпер.

У першы месяц вайны прыкацілі ў нашу вёску фашысты... Памятаю, як кароўку нашу забіралі, за курамі па двары ганяліся. Пазней

гэтыя вылюдкі ўсё спалілі: і хаты, і сады, і дрэвы...

У нашым двары рос вялізны разгалісты дуб. На ім, колькі вёска стаяла, буслы сабе жытло рабілі. Дык вось. Вайна ідзе, а ў буслоў свой клопат: дзяцей гадаваць, каб да восені іхнія крылы дужымі сталі. І не заміналі ж нікому, а адзін фашыст прыцэліўся ды па буслу з аўтамата часануў... І забіў. Ляжыць бедны птах, дзюба ў пыле. Немцы сабраліся ля яго, гергечуць, смяюцца. Бусліха магла б уцячы, але як жа было ёй сваіх дзетак кінуць? Кружылася над гняздом, пакуль той самы ірад і па ёй не бабахнуў...

Забітая бусліха ляціць на зямлю акурат на немцаў з іх машынамі. І — ці паверыш? — спужаліся яны. Сыпанулі з дарогі да агароджы, прыціхлі нават. Ну, а калі яны паехалі, мы, малыя, збегліся, паплакалі і пахавалі буслоў. А дзед твой злазіў на дрэва і дастаў з гнязда асірацелых буслянят. Мы іх да восені жабамі кармілі. Восенню яны паляцелі ад нас. Пэўна, расказалі ўсім буслам, што тут адбылося, і з таго часу не селяцца яны ў нашай вёсцы.

Мама ўздыхнула і паднялася з саломы:

— Ну, пойдзем, сынок.

Ішлі моўчкі. Андрэйка ўсё глядзеў у неба і думаў. Няўцям яму было, як гэта людзі маг-

лі забіць такую прыгожую птушку... А буслы кружыліся, кружыліся...

І раптам усхвалявана і з радаснай надзеяй хлопчык спытаў:

– Мама, а мо, калі восень пройдзе і снег і калі я падрасту і ў садзік не буду хадзіць... мо яны прыляцяць да нас? Я іх таксама карміць буду. Я жаб не баюся...

– Мо і прыляцяць, – уздыхнула мама.

– Няхай бы прыляцелі!

Неба з буслямі здавалася хлопчыку вельмі прыгожым, ласкавым і спакойным.

## *Васіль Жуковіч*

### БУСЕЛ НАД ХАТЫННЮ

Пакружыўся над Хатынню бусел
сонечна-пагодлівай вясною:
каміны стаяць. І людзі ў скрусе.
А нідзе хаціны ні адной.

Заміраюць галасы людскія,
гукі абуджальнае вясны,
і плывуць трывожныя такія,
тонкія жалобныя званы.

Пакружыўся над Хатынню
бусел і паплыў у светлую смугу.
Ён не ведаў болю Беларусі,
пэўна ж, ён адчуў яе тугу.

Пакружыўся бусел над Хатынню
і ў смузе пад воблакамі знік.
Папялішча ўсё яшчэ не стыне,
і ў грудзях не замірае крык.

## **М***ікола Маляўка*

### ДЗЯКУЙ ЗА МІР, ПЕРАМОГА!

Край наш святочна прыбраны,
Кветак ля помнікаў многа.
Дзякуй за мір, ветэраны!
Дзякуй за мір, Перамога!

Мы прывячаем з пашанай
Франтавіка дарагога.
Дзякуй за мір, ветэраны!
Дзякуй за мір, Перамога!

Мы салютуем курганам,
Помнікам фронту ляснога.
Дзякуй за мір, ветэраны!
Дзякуй за мір, Перамога!

Вабяць углыб акіяны,
Кліча да зорак дарога.
Дзякуй за мір, ветэраны!
Дзякуй за мір, Перамога!

# *Іван Муравейка*

## НА ВАЙНЕ І НЕ ТАКОЕ БЫВАЛА

### Адважны

Гэта было ў час нашага наступлення. Калі мы ішлі па вуліцы адной вёскі, да мяне прывязаўся шэры і вялікі, як воўк, сабака. Чаму менавіта ён выбраў мяне з двухсот чалавек? Ды таму, што я першы кінуў яму кавалак хлеба. Думаў, што ён правядзе нас да аселіцы і вернецца. Дык жа — не, не адстаў, а пайшоў разам з намі.

Салдаты смяяліся:

— Грознае папаўненне.

— Цяпер фашысты, убачыўшы нашага чатырохногага ваяку, будуць без аглядкі ўцякаць.

— Давайце назавём яго Адважным.

— Згодзен, — падтрымаў я прапанову. — Упэўнены, што ён апраўдае сваё імя.

Наш полк, а можа, і ўся дывізія прасунуліся наперад на кіламетраў дваццаць. І — зноў абарона. Надвячоркам прыехала паходная кухня. Я і кажу повару:

— Мне дзве порцыі кашы накладвай. І мяса таксама.

Повар зразумеў маю просьбу як жарт і рассмяяўся, а калі я з сур'ёзным выглядам паўтарыў яе, ён гэтак жа сур'ёзна адказаў:

– Калі кожнаму даваць па дзве порцыі, палова байцоў застанецца галоднай.

– Дык жа наша рота папоўнілася адным едаком, – растлумачыў я. – Хіба ты не чуў?

– А чаму той новы ядок сам не з'явіўся?

– А ён з'явіўся. Вось ён, пазнаёмся.

– Ты што, Перапечка, здзекуешся з мяне? – зазлаваўся повар. – Сабаку на харчовае забеспячэнне я не вазьму. Не прадугледжана статутам. Не затрымлівай чаргу.

Салдаты зашумелі.

– Мне трошкі не дадай!

– І мне!

– І мне!

– І мне! Вось і складзецца дадатковая порцыя.

Повар згадзіўся.

Так Адважны стаў «законным» едаком роты.

Самыя важныя падзеі чакалі нас наперадзе. Адважны хутка прыжыўся ў роце. І дакладна выконваў усе мае загады і распараджэнні: ляжаў і не шавяліўся без майго дазволу, не брахаў без патрэбы. І, самае галоўнае, навучыўся адрозніваць сваіх ад ворагаў. Першыя дадзеныя пра фашыстаў ён атрымаў, калі прыдзірліва аглядаў двух палонных немцаў. Аднаму ледзь не парваў штаны.

Я пачаў браць Адважнага нават на баявую ахову. І аднойчы, у цёмную асеннюю ноч, ён, можна сказаць, здзейсніў гераічны подзвіг. Ляжу я са сваім аддзяленнем недалёка ад варожых акопаў і пільна назіраю. Успыхваюць ракеты ў небе, там-сям гучаць адзіночныя стрэлы і кароткія кулямётныя чэргі. Раптам Адважны, які спакойна ляжаў побач са мной, усхапіўся, загергетаў. Мы насцярожыліся, падрыхтаваліся да бою. Сапраўды, прама на нас паўзлі два немцы.

– Узяць, – загадваю Адважнаму.

І ён ірвануўся наперад, кінуўся на немца, прыціснуў яго да зямлі. Другога варожага салдата ў палон узялі мы.

Неўзабаве Адважны зноў пацвердзіў сваё баявое майстэрства. І зноў ноччу, калі ўся рота спала, Адважны моцна забрахаў і ўсіх разбудзіў. І недарэмна. Групе нямецкіх разведчыкаў удалося прабрацца на пазіцыю нашай роты. Двое былі знішчаны, трое здаліся ў палон.

Пасля гэтых выпадкаў Адважнаму выдавалі ежу па поўнай салдацкай норме. На жаль, да Берліна ён не дайшоў. Выпадкова, ужо за Віслаю, ён наткнуўся на супрацьпяхотную міну. Сам загінуў, а некага выратаваў ад смерці. Ці не мяне?

## Іван Стадольнік

### БОТЫ

Калі быў хлапчуком я дасужым і смелым,
Вельмі часта на кут заглядаўся употай,
Дзе, ахутаўшы дбайна хусцінкаю белай,
Маці моўчкі павесіла бацькавы боты.

Я прасіў, каб дазволіла ў іх мне матуля
Пафарсіць хоць разок прад сябрамі сваімі,
А яна, як заўжды, мяне к сэрцу прытуліць,
І слязінкі бліснуць у яе пад вачыма:

— Не чапай мех, сынок!
Можа, вернецца бацька,
Можа, дзесь ён ужо дабіраецца з фронту,
І тады ў цябе будуць такія, як цацка,
Па назе — адмысловыя, новыя боты.

Час ішоў. Я падрос. І лісток пахавальны,
Можа, сотню разоў прачытаў разам з ёю,
А яна — памаўчыць, за навуку пахваліць
Ды кране пасівелыя скроні рукою.

Тыя боты даўно мне малыя памерам...
Акружаюць мяне у жыцці ўсе даброты,
Але нават цяпер, як хто стукае ў дзверы,
Маці позірк кідае на бацькавы боты.

## ЗМЕСТ

### Зімовы дзянёк — што камароў насок

*Г. Аўласенка.* Хто як зімуе . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
*А. Вольскі.* Калядкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
*М. Даніленка.* Ключы бабулі зімы . . . . . . . . . . . . 8
Зімовая азбука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
*В. Жуковіч.* Старажытны звычай . . . . . . . . . . . . . 13
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Першы снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Калі прыходзіць Дзед Мароз? . . . . . . . . . . . . . 16
*Я. Журба.* Дзед Мароз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
*К. Каліна.* Люты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Зімовы дуб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
*У. Карызна.* Гуканне Дзеда Мароза . . . . . . . . . . . 24
Навагодняя песенька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
*Я. Колас.* Дзед-госць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*П. Макаль.* Бялее снег пушысты . . . . . . . . . . . . . 30
*У. Мацвеенка.* Ёлка-вясёлка . . . . . . . . . . . . . . . . 31
*А. Русак.* Сінічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
*М. Чарняўскі.* Ёлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Ліса-калядоўшчыца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

### Як ты да людзей, так і людзі да цябе

*Э. Агняцвет.* Ледзянцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
*Г. Аўласенка.* Як мухаморы вайну пачыналі . . . . 43
*А. Бачыла.* Колькі кот набіў пасуды . . . . . . . . . . 46
*Я. Бяганская.* Аленчыны канькі . . . . . . . . . . . . . 48
*Г. Васілеўская.* Усмешка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
*А. Дудараў.* Пухнацік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Людзей слухай, а свой розум май. *Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча* . . . . . . . . 62
*Е. Лось.* Казка пра Ласку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64

*У. Мазго.* Света з Інтэрнэта .................. 73
*П. Макаль.* Пакліч у госці сонца .............. 74
*А. Масла.* Зорачка ............................ 75
*І. Муравейка.* Шкадлівы камень ................ 78
Яблыкі для сястрычкі ........................... 79
*А. Пальчэўскі.* Добрае слова .................. 82
*Т. Сівец.* Вандроўка на Паўночны полюс ........ 85
*Д. Слаўковіч.* Віншаванне ..................... 89
Селядцы на градзе .............................. 93
*М. Янчанка.* Адведалі ......................... 97

**Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае**

*Э. Агняцвет.* Будзь верным, добрым сынам! ... 101
*Л. Арабей.* Мама .............................. 103
Стралец і рыбак. *Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча* ........................ 107
*Т. Бунта.* Далонькі з пушынкамі ............... 112
*А. Васілевіч.* Мая гаспадарка ................. 115
Вернісаж ....................................... 119
*П. Васючэнка.* Жаласлівая прынцэса ............ 129
*М. Даніленка.* Самыя дарагія падарункі ........ 133
*У. Дубоўка.* Пра дзеда і ўнука ................ 135
*М. Дукса.* Татава машына ...................... 138
*В. Жуковіч.* Дзіўны горад ..................... 139
*В. Зуёнак.* Смачны сон ........................ 140
Каток – залаты лабок. *Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча* ..................... 142
*У. Ліпскі.* Прыгоды Нуліка *(урыўкі)* ......... 145
*Я. Маўр.* Шчасце .............................. 151
*Л. Рублеўская.* Як тата стаў суперменам *(урывак з аповесці-казкі «Прыгоды мышкі Пік-Пік»)* ..... 154
Мышка Пік-Пік робіць сабе макіяж *(урывак з аповесці-казкі «Прыгоды мышкі Пік-Пік»)* .. 157
*В. Ткачоў.* Дарога ............................ 161
*І. Шамякін.* Хітрунне ......................... 165

## Вясенні дзень год корміць

*А. Бачыла.* Мама .......... 169
*А. Бялевіч.* Вясёлка над полем .......... 171
*З. Верас.* Сонейка грэе .......... 173
*В. Вітка.* Вялікдзень .......... 174
*А. Вольскі.* Упарты снег .......... 175
*М. Даніленка.* Голас вясны .......... 177
*В. Жуковіч.* Гуканне вясны .......... 179
*К. Каліна.* Песня вясны .......... 180
*А. Клышка.* Сыход зімы .......... 183
*Я. Колас.* Першы гром *(урывак)* .......... 184
Краска .......... —
*Я. Купала.* Вясна .......... 187
*М. Маляўка.* Вішнёвае воблачка .......... 188
*П. Пранузa.* Ручаёк .......... 189
*Ю. Свірка.* Свята .......... 191
*М. Танк.* Галінка і верабей .......... 193
Ірынка .......... 195
Садзіце лясы! .......... 196
*К. Цвірка.* Коцікі .......... 197
*Цётка.* Гутаркі аб птушках .......... 198
*У. Ягоўдзік.* Вялікая сініца і яе сястрыцы .......... 210
Два браты – вераб'і .......... 211

## Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць

*Э. Агняцвет.* Саўка за сталом .......... 213
*А. Астрэйка.* Размова аб прафесіях .......... 215
*Я. Бяганская.* Сланечнікі .......... 218
*В. Вітка.* Хто што робіць .......... 222
*А. Вольскі.* Ад А да Я прафесія мая .......... 223
Сталяры .......... 228
*В. Гардзей.* Мой тата – трактарыст .......... 231
*С. Грахоўскі.* Касманаўты .......... 245

*Х. Гурыновіч.* Маленькая даярка . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
*С. Дзяргай.* Зерне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248
*В. Жуковіч.* Выбіраю прафесію . . . . . . . . . . . . . . . . . 250
*К. Камейша.* Ганчары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
*К. Кірэенка.* Вучуся ў таты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
*Я. Купала.* Сыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 256
*У. Ліпскі.* Умею – не ўмею . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 260
Пра хлопчыка «Ай» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 262
*М. Маляўка.* Як дом будавалі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265
*М. Пазнякоў.* Побач з татам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 271
*П. Пруднікаў.* Будаўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 272
*Д. Слаўковіч.* Калі растуць агуркі . . . . . . . . . . . . . . 273
*Я. Хвалей.* Урок працы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 277
*М. Чарняўскі.* Змайстравалі сані . . . . . . . . . . . . . . . . 278
*С. Шушкевіч.* Казка-быль пра рэпку . . . . . . . . . . . . 280

**Мірна жыць – шчаслівым быць**

*Э. Агняцвет.* Мой горад Мінск у час ваенны . . 282
*М. Гіль.* Партызанскі фотаздымак . . . . . . . . . . . . . . . 283
*Л. Дайнека.* Прынясіце кветкі салдатам . . . . . . . 288
*А. Дзяржынскі.* Крынічка партызанская . . . . . . . 289
*А. Дудараў.* Буслы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 291
*В. Жуковіч.* Бусел над Хатынню . . . . . . . . . . . . . . . 294
*М. Маляўка.* Дзякуй за мір, Перамога! . . . . . . . . 295
*І. Муравейка.* На вайне і не такое бывала . . . . 296
*І. Стадольнік.* Боты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 299

Літаратурна-мастацкае выданне

**Школьная бібліятэка**

# Цудадзейны карагод

*Зборнік твораў*
*для пазакласнага чытання*
*ў 3 класе*

*У дзвюх частках*

6+

*Частка 2*

Заг. рэдакцыі *Г. А. Бабаева.* Рэдактар *А. І. Чыгрынава.* Мастацкі рэдактар *А. А. Жданоўская.* Вокладка *А. С. Забаўскай.* Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Л. І. Шаўко.* Карэктары *В. С. Бабеня, В. С. Казіцкая, Г. В. Алешка.*

Падпісана ў друк 08.08.2018. Фармат $60 \times 90^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура NewBaskervilleC. Друк афсетны. Усл. печ. л. 19,0. Уч.-изд. л. 7,5. Тыраж 22 400 экз. Заказ 707.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў 1/2 ад 08.07.2013. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Шк*О*льная
бібліятэка



# *Цудадзейны карагод*

Лепшыя творы беларускай літаратуры ўвайшлі ў кнігу для пазакласнага чытання ў 3-м класе «Цудадзейны карагод», якую прапануе выдавецтва «Народная асвета».

«НАРОДНАЯ АСВЕТА»

ISBN 978-985-03-2987-5

9 789850 329875

ЕАС

Школьная бібліятэка



# Цудадзейны карагод

Частка 2